№ 24 (478) 30 чэрвеня 2006

www.nn.by

# Наша Ніва

П Е Р Ш ... Л А Р У С К А Я Г А З Э Т А

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападз... Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы



## За што мы любім

Чэмпіянат сьвету па футболе? Піша Віталь Сіліцкі. **Старонкі 4—6.**

### Улады працягваюць хімічыць

Незалежнай прэсе зноў выкручваюць рукі, Фінькевіч адпраўляецца на хімію. **Старонкі 2—3.**

### Расея вучыцца ваяваць у Эўропе

Манэўры «Шчыт Саюзу» былі найбольшымі на постсавецкай прасторы за 15 гадоў. **Старонка 8.**

## Будслаўскі фэст

1—2 ліпеня — Дзень Маці Божай Будслаўскай. **Старонка 11.**

## Падпольная нацыя: Купальле



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**На фота: ноч з 23 на 24 чэрвеня, Купальле ў Полацкім раёне. Арганізатары прасілі не афішаваць месца правядзеньня фэсту.**

Фольксваген: «Пытаньне, якой быць беларускай нацыі, застаецца адкрытым. Каапэрацыя з Лукашэнкам была б сьмерці падобная». **Старонка 14.**



## у нумары

### рэакцыі

Ліга нацый .............................. 4

### люстра дзён

Апазыцыя занялася энэргетычнай бясьпекай ..... 7
Расея вучыцца ваяваць у Эўропе ................................ 8
Чорны тыдзень беларусаў ............................... 8
Міронаў сьцяг над Лёзнам ..................................... 9
Сяргей Ляшкевіч пераведзены ў Глыбокае ... 9
Партал для пэдагогаў nastaunik.info ........................ 9
Чарадзей чакае свайго каня ........................................... 9
Міхал Вітушка памёр двойчы ................................. 10
Усеагульная Алімпіяда ...... 10
Рушыла Будслаўская пілігрымка ............................. 11

### хроніка

Павал Севярынец. Банкет на могілках ............. 12
Хроніка супраціву і рэпрэсій за 14—21 чэрвеня .................................. 12

### камэнтары

Фольксваген: Каапэрацыя з Лукашэнкам сьмерці падобная ............................... 14
Незалежнасьць не залежыць ад аднаго чалавека ............ 14
Віталь Тарас. Як жыць у зубе дракона .................... 15
Раман Якаўлеўскі. Венскі саміт .......................... 18
Аляксандар Класкоўскі. Hasta la vista, baby! ............ 24

### левым вокам

Ідзе вайна гандлёвая ......... 25

### калі б...

Малюнкі Лёліка Ушкіна ... 47

## Колькі каштуе гонар чынавенства

60 млн рублёў павінна выплаціць ЗАТ «БелКП-Прэс» — выдавец «Комсомольской правды в Беларуси» — старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэту Аляксандру Шпілеўскаму. На гэтую суму Савецкі суд ацаніў маральныя страты чыноўніка. Калясальнай абразай Аляксандар Шпілеўскі палічыў разьмяшчэньне свайго фота пад цытатай зь Мікалая Шпілеўскага — агента вядомага футбаліста А.Глеба. Гэтую тэхнічную памылку ў рэдакцыі заўважылі пасьля выхаду нумара і адразу прынесьлі вусныя прабачэньні. У наступным выхадзе кіраўніцтва надрукавала афіцыйныя прабачэньні абодвум фігурантам і чытачам. У адрозьненьне ад агента футбаліста, чыноўніка гэта не задаволіла.

Супрацоўнікі газэты ня схільныя палітызаваць сытуацыю. «Проста ў нашай краіне гонар чыноўнікаў каштуе даражэй за простых грамадзянаў у разы, — зазначыў намесьнік галоўнага рэдактара Віктар Малішэўскі. — Паводле зьвестак Таварыства абароны правоў спажыўцоў, самы вялікі задаволены пазоў супраць прадстаўнікоў дзяржаўных установаў — 1 мільён рублёў. Мы гэта яшчэ добра прааналізуем і адсочым, куды ён выдаткуе гэтыя грошы».

Аднак староньняму назіральніку цяжка паверыць у непалітычнасьць рашэньня. Такая вялізная сума за дробязную недарэчнасьць? Нагадаем, што акурат судовыя штрафы былі дзейсным інструмэнтам здушэньня «БДГ» і «Народнай волі».

**Тацяна Гацура**

## «Витебский курьер» на мяжы выжываньня

Недзяржаўная газэта «Витебский курьер» знаходзіцца ў няпэўным становішчы. Зьявіліся чуткі пра тое, што зь ліпеня газэта сыдзе ў Інтэрнэт. Рэдактар «Курьера» Ўладзімер Базан кажа на гэта: «Празь фінансавыя цяжкасьці трэці месяц супрацоўнікі рэдакцыі не атрымліваюць заробкаў. Частка тэхнічнага пэрсаналу заявіла пра жаданьне звольніцца. Сытуацыя няпростая, але мы яшчэ нічога не вырашалі пра прыпыненьне выхаду».

Праблемы ў віцебскай газэты ўзьніклі ў выніку забароны на распаўсюд дзяржаўнымі манапалістамі «Белпоштай» і «Белсаюздрукам». Яе наклалі з 1 студзеня на 18 недзяржаўных газэтаў з мэтамі здушэньня незалежнае прэсы.

Ня выключана, што з 1 ліпеня можа прыпыніць выхад ня толькі «Кур’ер», але і некаторыя іншыя рэгіянальныя выданьні.

**Сямён Печанко**

**Ад Рэдакцыі.** Без свабоднай прэсы ня можа быць свабоднага абмену думкамі, ня зможа нармальна разьвівацца грамадзтва. З гэтым ніхто не спрачаецца, нават камэнтатары БТ. Аднак словы застаюцца словамі. Пад размовы пра «незалежнасьць» улады Беларусі працягваюць выцягваць камень за каменем з фундамэнту нацыі — свабодную прэсу, беларускую мову, грамадзкую ініцыятыву. Анічога не памянялася ў гэтым пляне, — піша блогер Фольксваген. **Старонка 14.**

### Тым, хто забірае «НН» на сядзібе ТБМ

**З 3 ліпеня па 14 жніўня** на сядзібе ТБМ (Румянцава, 13) «Нашу Ніву» можна будзе атрымаць толькі з 18-й да 20-й з панядзелка па пятніцу.

# Фінькевіча высылаюць у Магілёў



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Артуру Фінькевічу (на фота ў цэнтры) прызначылі месца адбваньня пакараньня: 29 чэрвеня да 24.00 ён павінен прыбыць у Магілёў на адрас праспэкт Пушкіна, 65. 21-гадовы хлопец асуджаны 10 траўня судзьдзёй Вікторыяй Зайцавай (Першамайскі суд Менску) на 2 гады «хіміі» за палітычныя графіці. На фота: у сераду ён разьвітваўся зь сябрамі.**

# Ліга нацый

За што мы любім Чэмпіянат сьвету? Піша **Віталь Сіліцкі.**

Так выйшла, што на пачатку чэрвеня мне давялося зьлётаць на тры дні ў Брусэль. Пасьля заканчэньня канфэрэнцыі мае нямецкія калегі запрасілі мяне на дзень у файны горад Кёльн. Мэтай візыту было спатканьне зь нямецкімі дасьледчыкамі Беларусі, у першую чаргу — зь вядомым Гайнцам Цымэрманам. Але, паколькі гэты дзень выпаў на 9 чэрвеня, то ні аб чым іншым, акрамя футболу, я і ня думаў. Божа ж мой, я буду ў Нямеччыне падчас Чэмпіянату сьвету! Ну і што, што ў Кёльне, а ня Мюнхэне, дзе адбываўся першы матч. Ну і што, што я буду глядзець гульню паміж Нямеччынай і Коста-Рыкай (якую ва ўсялякім іншым разе я б з радасьцю праманяў, скажам, на любы матч Лігі чэмпіёнаў), ну і што, што пайду ў бар і буду вырачаць вочы на вялікі экран гэтаксама, як мог бы вырачацца ў любым іншым бары любога іншага гораду любой краіны сьвету — ці то ў Беларусі, ці то ў Злучаных Штатах. Душу захапіла непераадольнае пачуцьце кайфу, якое знайшло водгукі ў першых дзіцячых уражаньнях ад таго далёкага ўжо Мундыялю ў Гішпаніі, ад таго разьдзяўбанага «Рэкорду», на экране якога я ўпершыню ўбачыў Зыка і Сакратэса, Плятыні і Марадону, хет-трык Росі і самы неверагодны ў гісторыі паўфінал паміж Нямеччынай і Францыяй. На некалькі гадзінаў можна было адчуць сябе часткай вялікай дзеі, якую калісьці чакаў кожныя чатыры гады, каб потым узгадваць ўсё жыцьцё.



**Палатно на столі цэнтральнага вэстыбюлю Кёльнскага вакзалу.**

## Адчуваньне цуду

Гэтае адчуваньне даўно ўжо мінула. Па-першае, пакуль зборнай маёй краіны прабіцца на мундыяль — *no way*. Па-другое, чакаць чатыры гады, каб паглядзець клясны футбол, цяпер ня трэба. Камэрцыялізацыя футболу, зьмякчэньне лімітаў на іншаземцаў і распаўсюд глябальных камунікацыяў спарадзілі Лігу чэмпіёнаў, у якой сярэдні ўзровень удзельнікаў нават вышэйшы, чым на Чэмпіянаце сьвету, і якая адбываецца штогод, а там яшчэ прэм’ер ліга, сэрыя А...

Вялікія грошы і глябалізацыя забясьпечылі бесьперапынную падачу якаснага прадукту, але разам з тым хутка адбудавалі герархію, якая часткова забіла інтрыгу гульні. Паглядзеце на табліцу нацыянальнага першынства пяцёркі асноўных краінаў, колькі там пунктаў аддзяляюць першае месца ад усіх астатніх. Паглядзеце на склад удзельнікаў той жа Лігі — дзьве траціны камандаў проста ў ёй прапісаліся. Вось гэтыя два дзясяткі клюбаў і засталіся рэальнымі гульцамі амаль эўрапейскай НХЛ, усім астатнім — назіраць ды выбіраць, за каго заўзець. Нечаканасьць, а значыць і магутны эмацыйны ўздым, адчуваньне цуду — усё засталося толькі на ўзроўні нацыянальных камандаў. Узгадайце Грэцыю ў 2004 годзе! Таму мундыяль і застаецца падзеяй падзеяў. Ня толькі таму, што залаты кубак — першы ў табэлі аб рангах, а яшчэ і праз тое, што ён — адно з апошніх выражэньняў футбольнай дэмакратыі, футболу як між*нацыянальнай* зьявы...

### Фанацкі інтэрнацыянал

Атмасфэра сьвята пачалася ўжо ў цягніку. З соннага Брусэлю да Кёльну ехаць дзесьці дзьве гадзіны. На вакзале склалася ўражаньне, што ангельска-амэрыканская армада зноў высадзілася недзе на атлянтычным узьбярэжжы: цягнік акупавалі дзясяткі, сотні заўзятараў: як высьветлілася, абсалютная большасьць едзе без квіткоў — а каб проста злавіць кайф ад атмасфэры. Прычым калі б толькі ангельскія фанаты, для якіх Брусэль — натуральны перавалачны пункт! За дзьве гадзіны я пабачыў на цягніку гішпанцаў, эквадорцаў, бразыльцаў, аргентынцаў, швэдаў, партугальцаў, амэрыканцаў ды яшчэ невядома каго. Сапраўды, неспавядальныя шляхі фанацкія — здаецца, маршруты іх міграцыі вызначаюцца коштам авіяквіткоў — прынамсі да Брусэлю былі таньнейшыя авіятарыфы, так я растлумачыў сабе гэты фанацкі інтэрнацыянал.

### Быць беларусам, а не амэрыканцам

У цягніку пачаліся і прыгоды, і ўражаньні. Пайшоўшы ў буфэт папіць кавы, я трапіў на групу ангельскіх фанатаў, што ўжо былі нападпітку. Яны штосьці жвава абмяркоўвалі зь нейкім абарыгенам. Паколькі я размаўляю на амэрыканскай ангельскай, то адразу ўехаць у іх гутарку ня здолеў (пачулі б вы акцэнт ангельскага хлопца «з глыбінкі»!). А вось мае суразмоўцы адразу вырашылі, што я — амэрыканец. Давялося трымаць адказ за вайну ў Іраку ўвогуле і за Буша ў прыватнасьці. Ну, нічога, падпітыя фанаты ня ведалі, што нарваліся на выкладчыка паліталёгіі, каб весьці такія спрэчкі. А мая 140-кілягaмовая туша, здаецца, адбіла ў іх жаданьне высьвятляць адносіны. Пажадаў ім хутчэйшага выздараўленьня Руні і пайшоў у свой вагон. Відавочна палагаднеўшы, калі даведаліся, адкуль я насамрэч, тыя небаракі пажадалі мне «быць беларусам, а не амэрыканцам». Не ўзгадаўшы нават, што за два тыдні да таго Беларусь зрабіла іх Ангельшчыну зь лікам 2:1...

> Поўны ўлёт пачнецца з чвэрцьфіналаў.

### Межы праступаюць

У аб'яднанай Эўропе межаў, як вядома, няма, але дзе сканчаецца Бэльгія і пачынаецца Нямеччына, пазнаць у той дзень было лёгка. Папершае, на час мундыялю немцы аднавілі пашпартны кантроль. Па-другое, адразу пасьля заканчэньня соннай Бэльгіі (зборная якой не прайшла кваліфікацыю) пачынаецца акіян сьцягоў. Літаральна паўсюль, дзе жыве чалавек. На офісных будынках, у вокнах дамоў, на дзержаках — паўсюль чорныя, чырвоныя і залатыя колеры. І гэта было толькі па дарозе! Па прыбыцьці ў Кёльн стала відавочна, што патрыятычная ліхаманка захапіла нацыю. Ужо а дзявятай гадзіне сонны, чынны Кёльн, у якім адна выява славутага старажытнага гатычнага сабору, здаецца, прымушае думаць толькі аб вечным, ператварыўся ў фанацкі табар. Кашулю ці шалік нацыянальнай каманды меў ці ня кожны трэці немец. На тэлеэкранах — паказы мод, у строях мадэляў паўсюль тыя самыя тры колеры, у якія таксама апранутыя будынкі, вітрыны крамаў, нават нейкія манумэнты. Пры выхадзе з вакзалу на велічэзнай столі цэнтральнага вэстыбюлю — неверагодных памераў палатно з футбольнай дзеяй, у якой сышліся Зыдан, Кака, Сысэ, Балак, Шаўчэнка... У футбольную форму апранутыя нават некаторыя сабакі і коткі.

### Тэрапія для немцаў

Усплёск патрыятызму і чорна-чырвона-жоўтай ліхаманкі, як высьветлілася, мае ў Нямеччыне сваю асаблівую сымбалічнасьць. У пасьляваеннай, пасьлягітлераўскай Нямеччыне выстаўляць напаказ нямецкую ідэнтычнасьць і нацыянальны гонар доўгі час лічылася, ну, скажам так, непалітка-рэктным. Пакаленьне за пакаленьнем немцаў вырасьлі зь вядомым «комплексам віны», шмат хто зь іх пры сустрэчы сказаў бы вам, што ён ці яна з Швабіі ці Баварыі, але не зь Нямеччыны. На працягу ўсіх гэтых гадоў футбол быў бадай адзіным няконтравэрсійным сродкам выяўленьня нямецкасьці — ня той, якая «*über alles*», а нармальнага, цывільнага нацыяналізму, які ўласцівы любому нармальнаму народу і з-за якога здаровы чалавек ніколі не палезе біць іншаму морду. Футбол для немцаў заставаўся бадай адзіным паліткарэктным спосабам, каб выказаць свае нацыянальныя пачуцьці. Таму і хор іхніх заўзятараў падчас выкананьня нацыянальнага гімну саступае, хутчэй за ўсё, толькі выбуху некалькіх дзясяткаў тысячаў прапітых ангельскіх глытак, калі тыя заводзяць «*God Save the Queen*». Нацыянальнае пытаньне, дарэчы, прыняло іншы кірунак падчас размоваў зь нямецкімі калегамі. Калі мы абмяркоўвалі Беларусь, яны разважалі аб тым, што мы самі ведаем — як цяперашняе палітычнае становішча ў Беларусі зьвязана са слабасьцю нацыянальнай самасьвядомасьці. Але, казалі мне яны, размаўляць уголас у Нямеччыне аб гэтым неяк не прынята. Вось, дарэчы, вам і адзін з магчымых адказаў на пытаньні аб не зусім зразумелай палітыцы Нямеччыны і ЕЗ у дачыненьні да Беларусі і яе прамаскоўскі ўхіл.

### Футбол як лек

Вяртаючыся да Нямеччыны, я злавіў сябе на думцы, што сваімі вачыма ўбачыў, што футбол — гэта больш, чым гульня. Ён дапамог вялікаму народу загаіць свае гістарычныя раны і пазбавіцца ад зданяў мінулага. Менавіта неверагодная перамога немцаў у далёкім 1954 годзе над непераможнымі дагэтуль «чароўнымі мадзярамі» называецца многімі гісторыкамі як паваротны пункт у вяртаньні нацыі ўпэўненасьці ва ўласных сілах пасьля катастрофы Другой сусьветнай вайны. З тых часоў немцы сталі ўзорнай дэмакратыяй, уласным каркам зарабілі свой славуты эканамічны цуд, сталі, як

Працяг на старонцы 6.

# Ліга нацый



У кожным гатэльным акне — сьцяг іншае краіны.

Працяг са старонкі 5.

казалі рэклямныя плякаты, што віталі гасьцей у край, «краінай ідэяў». Аднак спорт і футбол у прыватнасьці мелі важны псыхалягічны ўплыў. Дзякуючы яму быць немцам зноў стала клясна, прыкольна, крута...

## Панаехалі тут усякія

Пры гэтым чорна-чырвона-жоўтая ліхаманка зусім не перашкаджала гасьціннасьці і добразычлівасьці немцаў. Я ўжо распавядаў пра сьцягі ў вокнах ды на бальконах. Цяпер уявеце, ад усёй іх колькасьці нямецкіх зь іх была, можа, толькі палова. Іншая частка гэтага мора — партугальскія, харвацкія, італьянскія, мэксыканскія і бог ведае якія іншыя штандары. Па іх можна вывучаць і геаграфію міграцыйных працэсаў, і тое, як мяняецца аблічча эўрапейскага грамадзтва. Карацей, «панаехалі тут усякія». Але немцы, прынамсі кёльнцы, здавалася, былі гэтаму толькі рады. Іхнія эканамічныя агенцыі нават уключалі фактар Чэмпіянату сьвету ў карэкцыю (пазытыўную, вядома) паказчыкаў эканамічнага ўзросту, і гэта ў трэцяй найбуйнейшай эканоміцы сусьвету! Прызнаю, быць гасьціннымі немцаў вучылі перад чэмпіянатам — для гэтага была праведзеная адмысловая рэклямная кампанія пад назвай «Сьвет у гасьцях у Нямеччыны». Аднак відавочна, што тамтэйшыя абарыгены радаваліся ня толькі пакупнікам, але проста гасьцям. Уявеце сабе гэта дзе-небудзь: на вуліцы ідзе натоўп падпітых тутэйшых фанаў, насустрач — групы турыстаў, апранутых то ў швайцарскія, то ў партугальскія, то ў французскія футболкі. Мясцовыя пачынаюць дудзець у свае дудкі і выкрыкваць — не, не абразы, а назву адпаведнай краіны! За сваё жыцьцё я бачыў, як фанаты біліся, бачыў, як ня біліся, а вось такога — ніколі...

## Пэнтсілу — рэспэкт

Празь некалькі дзён, ужо па тэлевізары, убачыў зусім неверагодную карціну. Футбаліст зборнай Ганы Джон Пэнтсіл падчас фээрычнай перамогі сваёй краіны над Чэхіяй сьвяткаваў галы са сьцягам — не, не сваёй краіны, а Ізраілю, дзе ён гуляе ў клюбе. Проста каб выказаць падзяку і салідарнасьць свайму другому дому, дзе створаныя магчымасьці для разьвіцьця яго таленту і дзе ніхто не дазваляе ў яго дачыненьні расісцкіх выхадак. Ісламафашысты з усяго арабскага сьвету пачалі адразу цкаваць яго як агента Масаду і дасылаць сьмяротныя пагрозы, а паліткарэктная ФІФА прымушае небараку прынесьці прабачэньні... за паказ сьцягу сувэрэннай дзяржавы і, дарэчы, сябры ФІФА??? Вось уроды... А Пэнсілу — рэспэкт.

Пра сам Чэмпіянат чытайце лепш у спэцыяльных выданьнях. Па мне дык пакуль нічога цікавага, бо поўны ўлёт пачынаецца звычайна з чвэрцьфіналаў. Калі ж ён адбываецца раней, то пачынаючы з чвэрцьфіналаў Чэмпіянат лепей не глядзець — як было апошнім часам у Карэі ды Японіі. Пакуль усё ідзе без асаблівых нечаканасьцяў — хіба што ганцы ды аўстралійцы пралезьлі ў плэй-оф. А значыць — сапраўдны кайф яшчэ наперадзе. Праглядваюцца чвэрцьфіналы Аргентына—Нямеччына, Ангельшчына—Галяндыя, Бразылія—Гішпанія... Уф, нават ад думкі пра гэта мурашкі па скуры!

А паглядзець футбол жыўцом у Нямеччыне і нават трошкі паўдзельнічаць мне ўсё ж такі давялося. У доўгім калідоры франкфурцкага аэрапорту групка ангельскіх фанаў ды італьянскіх тыфозі натоўпам вывучала нейкую мапу, потым нехта дастаў мяч, дыр-дыр, распасовачка — і скокнуў мячык да мяне, ну я яго й адпасаваў назад.

...Сан-Францыска сустрэў мяне агульнай млявасьцю і абсалютнай абыякавасьцю да сусьветнай падзеі. Як казаў адзін комік на тэлебачаньні, «як яны могуць называць гэта Кубкам сьвету, калі мы нічога ў гэтым не разумеем! Нібыта сьвет існуе па-за межамі Амэрыкі!» На шчасьце, Амэрыка — краіна імігрантаў, легальных і нелегальных, плюс яшчэ мільёны турыстаў, студэнтаў, і г.д. — так што тры каналы круцяць усе матчы без выняткаў. А ў касмапалітарнай сылiконавай даліне да халеры бараў, дзе круцяць гульні. Не, усё ж такі глябалізацыя і камэрцыялізацыя — гэта крута!

# Апазыцыя занялася энэргетычнай бясьпекай

Падвышэньне цэнаў на газ стане штуршком да разьвіцьця, лічаць экспэрты, запрошаныя Партыяй БНФ.

Што чакае Беларусь у выніку падвышэньня цэнаў на газ? Як вырашыць праблему энэргетэкі? Ці патрэбная Беларусі атамная электрастанцыя? Гэтыя актуальныя пытаньні ў мінулы аўторак абмяркоўвалі вядомыя экспэрты і дасьледчыкі Беларусі за круглым сталом на тэму «Энэргетычная бясьпека краін Міжмор'я», арганізаваным Партыяй БНФ сумольна зь Інстытутам дзяржаўнасьці і дэмакратыі.

Амаль кожны выступ пачынаўся з канстатацыі непазьбежнасьці росту цэнаў на газ. І прадыктавана гэта не палітычнымі, а эканамічнымі чыньнікамі. У Эўропе, дзе Расея канкуруе з Нарвэгіяй і Альжырам, цэны растуць штогод. Гэтая сусьветная тэндэнцыя ня можа абысьці Беларусь, якія б палітычныя адносіны яна ні мела з манапалістам. Да таго ж, Расея хоча стаць сябрам Сусьветнай гандлёвай арганізацыі, таму спэкуляваць энэргетычнымі цанамі ў палітычных мэтах можа толькі ў абмежаваным абсягу — усе пакупнікі мусяць быць роўнымі. Скептычна спэцыялісты паставіліся і да гандлю «Белтрансгазам» як палітычнай стратэгіі. «Сам сабою «Белтрансгаз» як труба нікому не патрэбны. Расейцам неабходна абслугоўваньне новага трубаправоду «Ямал—Эўропа». Гэтую ролю можа выканаць беларускае прадпрыемства, бо ствараць новае патрабуе шмат выдаткаў і часу», — сьцьвердзіў эканаміст Валер Дашкевіч.

Паводле падлікаў дасьледчага цэнтру Інстытуту прыватызацыі і мэнэджмэнту, які рэпрэзэнтавала намесьніца дырэктара Ірына Тачыцкая, падвышэньне цэнаў на газ на 25% ужо выкліча адмоўныя зьмены ў эканоміцы Беларусі. Яно пагоршыць сытуацыю прадпрыемстваў. Паводле зьвестак Мінстату, 30% суб'ектаў гаспадараньня нерэнтабэльныя, рэнтабэльнасьць паловы беларускіх прадпрыемстваў складае ад 0 да 10%. Далейшае зьніжэньне рэнтабэльнасьці выкліча памяншэньне заробкаў.

Павышэньне цэнаў на газ ударыць і па прыватных спажыўцах, бо ўся электраэнэргетыка Беларусі працуе на блакітным паліве. Паводле некаторых зьвестак, запазычанасьць «Белэнэрга» складае каля 15%. Цікава, што сёньня 1 кВт для беларусаў каштуе 6,7 цэнта, а для палякаў — 7,1, а ў сярэднім па Эўразьвязе — 8,2 цэнта, пры тым што газ Эўропа купляе па $ 230 за барэль. Экспэрты сьцьвярджаюць, што зрабіць цану электрычнасьці вышэй за польскую немагчыма. Але любое падвышэньне запатрабуе росту прыбыткаў насельніцтва альбо кампэнсаваньня зь бюджэту.

Дарэчы, экспэрт у пытаньнях энэргетыкі Станіслаў Гусак зазначыў, што 80% энэргаабсталяваньня зношана. Плянавую замену абсталяваньня можна выкарыстоўваць для пераарыентацыі электрастанцый з расейскага газу на вугаль.

Абмяркоўвалася таксама пытаньне будаўніцтва АЭС. Спэцыялісты ня бачаць у гэтым экалягічнай небясьпекі, але выступаюць за выкарыстаньне заходніх тэхналёгіяў, што дазволіць таксама купляць паліва для АЭС не ў Расеі, а на Захадзе і зьнізіць энэргазалежнасьць ад усходняе суседкі. Прафэсар НАН Беларусі Іван Нікітчанка з жалем зазначыў, што ў траўні Мясьніковічам была скліканая рада, дзе «рашэньне аб будаўніцтве прынята было, а дыскусіі не было». Цяпер рыхтуецца эканамічнае абгрунтаваньне гэтага праекту коштам $2,5 млрд. Гэта сума, за якую бярэцца будаваць Расея. Удзельнікі мерапрыемства прыйшлі да высновы, што гэты варыянт усё роўна толькі часова выратуе Беларусь, бо разьведаных запасаў урану для ўжо існых станцый засталося толькі на 75 гадоў.

Хоць крызісныя працэсы ў эканоміцы, выкліканыя ростам цэнаў на газ, можна будзе спыніць праз павелічэньне інфляцыі і перакрыжаванага субсыдыяваньня, карэннае вырашэньне праблемы магчыма толькі праз стварэньне энэргаэфэктыўнай эканомікі. Для прыкладу, энэргаёмістасьці ВУП Беларусі ў два разы большая, чым у Нямеччыне, па паказчыках энэргаэфэктыўнасьці гэтыя лічбы адваротныя. Прычыны гэтага і ў манапалізьме дзяржавы. «Каб вырашыць такое пытаньне, неабходна, на мой погляд, цалкам зрабіць стаўку на прыватную ўласнасьць, у тым ліку і на зямлю. Толькі калі будзе гаспадар, магчыма ствараць эканамічную структуру. А так у сельскай гаспадарцы энэргіі вытрачваецца ў тры разы болей, чым магло б быць», — выказаў сваё меркаваньне І.Нікітчанка.

Таксама неабходна пераабсталяваньне нафтапампоўных станцый. «Патрэбна, каб нашы нафтаправоды маглі пампаваць ня толькі ў Эўропу, але і адтуль. Дарэчы, па сусьветных цэнах Беларусь можа купляць газ ня толькі ў Расеі», — заявіў Станіслаў Гусак. Гучыць дзіўнавата, бо газаправоды ў Беларусь ідуць толькі з Расеі. Больш за тое, свабоднага газу паблізу Беларусі няма. Няма пакуль і магутнасьцяў для прыёму звадкаванага газу.

Увогуле ж, Беларусь знаходзіцца ў лепшым становішчы, чым эўрапейскія краіны — спажыўцы расейскага газу. Улічваючы карацейшыя шляхі дастаўкі, блакітнае паліва на гэтай тэрыторыі заўсёды будзе таньнейшым на $40—50. Пры стварэньні спрыяльных умоваў разьвіцьця эканомікі гэта магло б стаць моцным штуршком для інвэстыцый. Відавочна, што нават невялікае падвышэньне цэнаў патрабуе ад кіраўніцтва дзяржавы неадкладнага рэагаваньня. «Але хто гэта будзе рабіць? Саша і Сірожа?» — паставіў кропку сустрэчы эканамічны аглядальнік радыё «Свабода» Мікола Залескі.

**Тацяна Гацура**

# Расея вучыцца ваяваць у Эўропе

*«Расея ня будзе ўдзельнічаць ані ў якіх «сьвятарных саюзах», канфрантацыя ёй без патрэбы...»*

У. Пуцін на паседжаньні МЗС РФ, 27 чэрвеня 2006

У Беларусі закончыліся самыя буйныя супольныя вайсковыя манэўры на постсавецкай прасторы за апошнія 15 гадоў. У вучэньнях «Шчыт Саюзу — 2006» было задзейнічана блізу 10 тысячаў жаўнераў і афіцэраў, штабы арміяў, дывізіяў і брыгадаў, 40 танкаў, 180 бронемашынаў, 40 гарматаў і рэактыўных сыстэмаў залпавага агню, 36 самалётаў і г.д. На гэты раз невялікую краіну «Дзьвінію» ратуюць расейскія войскі з стратэгічнымі бамбавікамі з суседняй «Дняпровіі» ад умоўнай дзяржавы «Бугія». Праціўнік ізноў наступае з Захаду, паратунак прыходзіць з Усходу.

Гэтым разам манэўры прыпалі на саміт прэзыдэнтаў сямі краінаў СНД, якія падпісалі Дамову аб калектыўнай бясьпецы. Кіраўнікі шостае часткі сьвету мусілі пераканацца, што ў Эўропу дзьверы замураваныя.

Не засталіся ўбаку й спэцчасткі КДБ і МУС Беларусі, што гэтаксама актыўна змагаліся з пагрозаю «Бугіі». У рамках вучэньняў яны павінны былі вызваляць ад меркаваных дывэрсантаў... калгас. Але сьцяміўшы, што гэткі сцэнар выкліча ўраган кпінаў, памянялі калгас на Бярозаўскі мясакамбінат. Падчас вучэньняў адпрацоўваліся дзеяньні па вызваленьні закладнікаў, а таксама ліквідацыі наступстваў тэракту на камбінаце, што, паводле сцэнару, стаў прычынаю выкіду аміяку. Пэўна ж, кілбасу ўратавалі.

«Самы галоўны наш клопат разам з Расеяй — заходнія межы. Супольная расейска-беларуская групоўка гатовая да выкананьня гэтых функцыяў на 120 адсоткаў!» — ацаніў вучэньні, што адбыліся, А.Лукашэнка.

Праводзіць падобныя вучэньні антытэрарыстычных падразьдзяленьняў у больш праўдападобных умовах у беларускім КДБ відавочна збаяліся. Пэўна, каб не выклікаць непатрэбных асацыяцыяў і не даваць падказак патэнцыйным тутэйшым экстрэмістам. «Шчыт Саюзу» — ня толькі разьмінка для абслугі складанай тэхнікі, але й красамоўны сыгнал асобным суседзям Беларусі. Найперш Польшчы, Чэхіі й Вугоршчыне, на тэрыторыі якіх у хуткім часе ЗША плянуюць разьмясьціць супрацьракетныя базы сыстэмы нацыянальнай абароны.

Нелюбоў рэжыму Лукашэнкі да суседзяў, апроч Расеі, зразумелая. Вакол — ворагі. Затое пазыцыя Расеі куды больш нюансаваная. У крамлёўскіх вярхах, пра што сьведчыць апошні выступ Пуціна на адмысловай калегіі МЗС Расеі нарэшце паўстае разуменьне таго, адкуль зыходзяць рэальныя пагрозы іхняй краіне. Ужо ж пэўна, што не зь Літвы й Польшчы. Пуцін не паехаў пад Баранавічы. І ў Маскве гэтыя вучэньні ніяк не адкамэнтаваў. І астатнія прэзыдэнты з прастораў Эўразіі, ветліва агледзеўшы Лукашэнкаву бібліятэку, паехалі сабе па хатах, ня выявіўшы цікавасьці да страляніны між калгасамі ды мясакамбінатам. Усход — справа тонкая.

А зь іншага боку — дзе яшчэ ў Эўропе расейскія ваякі могуць рэпэціраваць? Як кажа Пуцін — мухі асобна... Выходзіць, «Шчыт Саюзу» — файная магчымасьць павучыць сваіх жаўнераў у эўрапейскіх умовах. Урэшце, а хто сказаў, што гэта не спатрэбіцца? Сёньня гэткія саюзьнікі, заўтра — іншыя... Міжволі згадваюцца савецка-нацыстоўскія парады ў Беларусі й бурнае іх вайсковае супрацоўніцтва напрыканцы 1930-х. У сапраўднай імпэрыі ня можа быць вечных сяброў, у яе ёсьць толькі вечныя інтарэсы.

Выгаднымі гэтыя вучэньні былі й для беларускіх жаўнераў. Бо любыя вучэньні, пагатоў такога маштабу, павышаюць іхную прафэсійную кваліфікацыю. Пэўна ж лепей, чым маршыраваць па пляцы пад савецкія песьні.

Лукашэнкавы калегі паразьяжджаліся, а ў Беларусі вайна працягваецца. Ад 9 траўня праз «Шчыт Саюзу» і 65-годзьдзе нападу на СССР яна пераходзіць у сьвяткаваньне 3 ліпеня. Два месяцы Беларусь гуляецца. Вось такі тэатар ваенных дзеяньняў. Але, паводле законаў тэатру, стрэльба, што зьяўляецца ў першай дзеі, стрэліць у апошняй. Вось толькі ў каго?

**Гары Куманецкі**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Беларусь гуляецца: гледачы назіраюць за «пачаткам вайны» на «Лініі Сталіна». 22 чэрвеня.**

## Чорны тыдзень для беларусаў

Апошні тыдзень выдаўся для беларусаў, што былі за межамі бацькаўшчыны, сапраўды чорным. У амэрыканскім горадзе Ўэлз, штат Мэн, пры нявысьветленых абставінах загінуў ураджэнец Шчучына 20-гадовы Аляксей Васілеўскі. Ён прыехаў у ЗША 18 чэрвеня па студэнцкай візе. Побач зь целам знайшлі нож, якім, паводле папярэдняй вэрсіі сьледзтва, быў забіты малады чалавек. Забіты быў студэнтам Беларускай політэхнічнай акадэміі.

У Турцыі ў курортным горадзе Манаўгат у выніку выбуху балёна з газам (паводле адной з вэрсіяў, гэта быў тэракт курдзкіх паўстанцаў) былі параненыя тры грамадзянкі Беларусі. Адной зь іх давялося ампутаваць нагу. Усе пацярпелыя прыехалі з Магілёва. Расейскі консул у Турцыі назваў прозьвішчы двух пацярпелых беларусак — Дзіна і Ангеліна Дзямянкавы. Ніводная з пацярпелых ня мела мэдычнай страхоўкі. Турапэратары настойліва раяць набываць полісы, якія да таго ж і каштуюць няшмат — 6 даляраў ЗША.

**СП**

# Міронаў сьцяг над Лёзнам

Раніцай 27 чэрвеня над Лёзнам залунаў бел-чырвона-белы сьцяг з чорнай жалобнай стужкай.

Ён знаходзіўся наверсе мэталічнай 30-мэтровай апоры пад напругай у 30 тысяч вольт, якая стаіць на пагорку каля шашы пры ўезьдзе ў Лёзна з боку Віцебску. Да сьцяга была прымацавана запіска: «Сьветлай памяці слаўнага сына зямлі беларускай Уладзімера Плешчанкі. Пакуль на зямлі жывуць такія людзі, як ён, — Беларусь жыла, жыве і жыць будзе вечна». І подпіс — Мірон.

Сьцяг зьявіўся перад саракавінамі па старшыні Віцебскай арганізацы КХП БНФ Уладзімера Плешчанкі, які памёр 20 траўня на 58-м годзе жыцьця. Легендарны Мірон неаднойчы падымаў сьцяг на гэтай небясьпечнай вежы. У прыватнасьці, быў ён узьняты там і да саракавін з дня сьмерці Васіля Быкава.

**Тацяна Чабатарова**

# Сяргей Ляшкевіч пераведзены ў Глыбокае

Незадоўга да пераводу зь ім сустракалася маці Ірына Баляславаўна. «Сын трымаецца малайцом», — кажа яна.

Кіраўніка шчучынскага выбарчага штаба Аляксандра Мілінкевіча Сяргея Ляшкевіча перавялі з Гарадзенскай турмы ў Глыбокае. С.Ляшкевіч быў асуджаны Шчучынскім раённым судом да 5 месяцаў турэмнага арышту нібыта за падрыхтоўку масавых беспарадкаў падчас выбараў прэзыдэнта. У часе сьледзтва ён адбыў ужо больш паловы тэрміну пакараньня і мае права на датэрміновае вызваленьне. Сяргей падаў хадайніцтва і цяпер чакае адпаведнага адказу.

Незадоўга да пераводу ў Глыбокае зь ім сустракалася маці Ірына Баляславаўна. «Сын трымаецца малайцом, спакойны. Больш мяне супакойваў, вытрыманы хлопец», — кажа спн.Ляшкевіч. У выпадку датэрміновага вызваленьня Сяргей Ляшкевіч мае магчымасьць уладкавацца па спэцыяльнасьці ў адной з гаспадарак Шчучынскага раёну.

Адвакат Сяргея Андрэй



Шчапяткоў лічыць, што перавод у іншую турму ніяк не ўплывае на шанцы С.Ляшкевіча быць вызваленым датэрмінова.

**Сямён Печанко**

# Партал для пэдагогаў nastaunik.info

Інфармацыйна-мэтадычны інтэрнэт-партал для настаўнікаў (www.nastaunik.info), зладжаны высілкамі саміх настаўнікаў, пачаў сваю працу. Сайт знаёміць з тэндэнцыямі адукацыі ў сьвеце, з новымі тэхналёгіямі і мэтадамі выкладаньня, а таксама вынікамі прымяненьня гэных тэхналёгіяў у Беларусі.

На сайце ёсьць распрацоўкі разнастайных тэматычных урокаў па амаль усіх школьных прадметах, праграмы й мэтадычкі, інфармацыя пра Таварыства беларускай школы, напрацоўкі для этнашколы і этнасадка, працы з пэдагагічнага досьведу Гуманітарнага ліцэю. Прапануюцца мэтодыкі грамадзянскага выхаваньня ў школе, заснаваныя не на цяперашняй ідэалёгіі, а на агульнаэўрапейскіх прынцыпах. Апроч беларускага досьведу, аўтары выкарыстоўваюць польскі, чэскі, швэдзкі, расейскі: адпаведныя матэрыялы падаюцца па-беларуску.

**АВ**

# Чарадзей чакае свайго каня

Беларусы дагэтуль не паставілі ніводнага коннага помніка. Хоць недахопу кандыдатураў, як сярод гістарычных пэрсанажаў, так і сярод адмыслоўцаў-скульптараў, няма. Узяць хоць бы сытуацыю з праектам коннай скульптуры полацкага князя Ўсяслава Чарадзея.

Менскі скульптар Алесь Шатэрнік марыць зрабіць гэта ад 2001 году. Скульптар быў ужо дамовіўся з полацкімі ўладамі, аднак тыя, памятаючы скандал з помнікам Эўфрасіньні Полацкай працы Ігара Голубева, усталяваным без узгадненьня зь Мінкультам, абвесьцілі ў 2005 г. унутрыгарадзкі конкурс. Перамог праект Сяргея Бандарэнкі, творцы, чые скульптурныя ўвасабленьні коней вядомыя далёка за межамі Беларусі. Аднак названы праектны кошт Бандарэнкавай працы полацкія ўлады палічылі завысокім — 300 млн рублёў у параўнаньні з удвая меншымі выдаткамі на праект Шатэрніка.

Прадстаўнікі полацкага гарвыканкаму наведаліся ў менскую майстэрню аўтара «Крывічоў». І прапанавалі замяніць меч у руцэ Чарадзея на дзіду. Алесь Шатэрнік рашуча адмовіўся: «Князь — гэта ўладар, меч — сымбаль яго ўлады». І вось пасьля гэтага зьявіўся трэці праект, які прэзэнтаваў скульптар Прохараў. Паводле чутак, рабіць макет яму дапамагаў былы асыстэнт Бандарэнкі.

Аднак і А.Шатэрнік не губляе надзеі пабачыць у Полацку свой твор.

Вясной гэтага году сп.Шатэрніка запрасілі ў Міністэрства культуры на паседжаньне экспэртнай рады, што займаецца ацэнкай праектаў у сфэры манумэнтальнага выяўленчага мастацтва. Ён пазнаёміў чальцоў рады з сваім праектам, падзяліўся ўласным меркаваньнем, дзе будучы помнік можна было б усталяваць. «Ідэальнае месца — на валах Верхняга замку. Ёсьць жа прыклад Менску, дзе пры БДУ даўно стаяць помнікі нашым слынным продкам, а чым горшы Полацкі ўнівэрсытэт?»



**Сямён Печанко**

**КАЛЯНДАР**

# Ліпень

**7** — Іван Вялікі ў праваслаўных.

**10** — 225 гадоў з дня нараджэньня выдаўца й публіцыста Антона Марціноўскага (1781—1855), уладальніка друкарні ў Вільні. У 1812-м ён пісаў па-беларуску адозвы да сялянаў супраць памешчыкаў.

**12** — Сьвятыя Пятро і Павал у праваслаўных.

**15** — Дзень Грунвальдзкае бітвы.

**15** — 400 гадоў з дня нараджэньня галяндзкага мастака Рэмбранта ван Рэйна (1606—1669).

**23** — 75 гадоў з дня нараджэньня міжнароднага гросмайстра, шахматыста Віктара Карчноя. Ён яшчэ за саветамі эміграваў на Захад, двойчы спрабаваў адыграць у Анатоля Карпава тытул чэмпіёна сьвету.

**26** — 150 гадоў з дня нараджэньня драматурга Джорджа Бэрнарда Шоў (1856—1950).

**27** — Дзень незалежнасьці ў гонар прыняцьця Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Рэспублікі Беларусі.

**27** — 100 гадоў з дня нараджэньня заснавальніка, выдаўца і рэдактара слыннага польскага часопісу ў Парыжы «Kultura» Ежы Гедройца (1906—2000).

**29** — 150 гадоў з дня сьмерці нямецкага кампазытара і піяніста Робэрта Шумана (1810—1856).

**31** — 450 гадоў з дня сьмерці Ігнацыя Ляёлы (1491—1556), каталіцкага сьвятога, заснавальніка Ордэну езуітаў.

# Міхал Вітушка памёр двойчы

(1907—2006)



**Лёс Міхала Вітушкі (зьлева) нарэшце праясьніўся. Лёс яго брата Алеся — дагэтуль таямніца.**

Гэтая вестка прыйшла зь Нямеччыны. Сын Міхала Вітушкі паведаміў, што яго бацька памёр яшчэ 27 красавіка ў альпійскім санаторыі. На 99-м годзе жыцьця.

У апошнія гады ён быў прыкаваны да ложка, хварэў. Яго наведвалі толькі сваякі і блізкія сябры.

Міхал Вітушка — адзіны з кіраўнікоў нацыянальных антысавецкіх рухаў Супраціву ў Савецкім Саюзе, які выжыў у партызанцы і здолеў захавацца ад савецкіх агентаў на Захадзе. А яго шукалі, патрабавалі выдачы як «вайсковага злачынцы». І пры гэтым у афіцыйных публікацыях пісалі (дагэтуль пішуць), што Вітушку забілі яшчэ ў 1945 годзе. Не забілі, нават не паранілі.

Беларускі партызанскі рух пад кіраўніцтвам Міхала Вітушкі распачаў збройную барацьбу супраць бальшавікоў увосень 1945 году. У 1948 годзе Вітушка правёў яго рэарганізацыю, а ў пачатку 50-х вывеў ацалелыя партызанскія атрады праз Польшчу і Латвію на Захад. Сам ён працягваў заставацца ў Польшчы, адкуль кіраваў антысавецкім падпольлем. У 1960-х Вітушка перабраўся на Захад. Ёсьць сьведчаньні, што пад чужымі дакумэнтамі Міхал Вітушка прыяжджаў у Беларусь, апошні раз ён наведаў Бацькаўшчыну ў пачатку 1970-х, быў у Менску і Вільні.

Ён перажыў амаль усіх сваіх сяброў і ворагаў. Пасьпеў напісаць успаміны, якія калісьці будуць апублікаваныя.

**Сяргей Ёрш**

Больш пра жыцьцё і таямніцу «сьмерці» і ўратаваньня М.Вітушкі ў 1945 годзе можна будзе прачытаць у кнізе Сяргея Ярша і Сержука Горбіка, якая рыхтуецца да друку.

# Усеагульная Алімпіяда

Сканчаюцца цэнтралізаваныя тэсты для выпускнікоў школаў. 29 чэрвеня тэст па хіміі, 1 ліпеня — заключны, па геаграфіі. У цэлым вучні і настаўнікі звыкліся з больш аб’ектыўнай формай праверкі ведаў, але застаюцца нараканьні на бязладнасьць тэставых праграмаў.

Выпускнік Уладзь (мае сярэдні бал 8,6) здаваў тэсты на матэматыку й фізыку. Для яго заданьні на абодвух тэстах былі заціжкія: «Праз паўгадзіны пасьля пачатку тэстаў сышло ўжо каля траціны ўдзельнікаў. Заданьні былі па ўзроўні ня школьнага курсу, а як для алімпіяды». Школьная настаўніца матэматыкі Галіна, рашаючы з унукам задачы тэсту, адужала толькі па 5 заданьняў з кожнага варыянту.

Натальля, якая здавала гісторыю, кажа, што да канца часу, адведзенага на тэст, даседзела толькі чвэрць прысутных. Трапляліся заданьні проста прымітыўныя — «Назавіце галоўны горад крывічоў». Даць адказы на іншыя пытаньні, ведаючы толькі школьны курс, было немагчыма: «Ішоў урывак зь летапісу, дзе апісвалася, як маскалі пабілі літоўцаў. Трэба было адказаць, у якім годзе гэта адбылося і ў якім месцы». Вяршыняй гістарычнага тэсту было заданьне зь пералікам дзясятка заводаў, пабудаваных у 50—80-я гады XX ст., якія трэба было пералічыць у парадку іх узьнікненьня.

Толькі ўхвальныя водгукі я пачуў пра заданьні па мовах — беларускай і расейскай. Хаця і тут былі свае закавыкі. Так, у тэсьце па расейскай мове з 13 складаназалежных сказаў трэ было выбраць такі, каб у першай частцы было дапаўненьне месца, а ў другой — слова, утворанае прыставачна-суфіксальным спосабам.

Рэпэтытар па хіміі Алесь кажа : «Мой прадмет навучэнцы яшчэ не здавалі. Аднак што для бясспрэчна — яно дазваляе больш аб’ектыўна ацаніць веды вучня і зьменшыць карумпаванасьць».

**Адам Воршыч**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Рушыла Будслаўская пілігрымка

Раніцай 27 чэрвеня ад менскага архікатэдральнага касьцёлу імя найсьвяцейшай Панны Марыі рушыла XVI пешая пілігрымка ў нацыянальны санктуарый Маці Божай у Будславе. Ад 8-й у касьцёле прайшла сьвятая імша. Увесь гэты час да адыходу а 10-й гадзіне да катэдры сьцякаліся пілігрымы. Прыемна зьдзівіла колькасьць маладых людзей — іх тут пераканаўчая большасьць. Шмат дзяцей і падлеткаў. Яны сьмяяліся і самаўпэўнена ірваліся ў дарогу. Сур'ёзнасьць і засяроджанасьць вылучала тых, для каго гэтая пілігрымка ня першая.

Сярод пілігрымаў былі і вернікі з Расеі, пецярбуржцы вылучаліся з натоўпу чырвонымі гальштукамі.

Пашыхтаваўшыся, узьняўшы харугвы і сьцягі, сьвяточная калёна ў некалькі сотняў чалавек зь песьняю рушыла ў шлях. З крамаў і офісаў выглядалі цікаўныя.

**Сямён Печанко**

**Што будзе на Будслаўскім фэсьце**

**1 ліпеня**

**17.00** — сьв. імша (правяць айцы-бэрнардыны).

**18.00** — сьв. імша для пілігрымаў зь Віцебскай дыяцэзіі.

(Сьпеў — пілігрымы.)

**19.30** — лекцыя для моладзі; акцыя далучэньня да «Руху чыстых сэрцаў».

**20.00** — сьв. імша для Менска-Магілёўскай архідыяцэзіі.

(Сьпеў — пілігрымы.)

**21.30** — марыйныя нешпары.

**22.15** — сьпявае хор «Angeli».

**23.00** — акафіст. Сьпявае хор Грэка-Каталіцкай Царквы.

**24.00** — працэсія і ўрачыстая св. імша.

(Сьпеў — хор «Залатая Горка».)

**2 ліпеня**

**02.00** — малітоўнае чуваньне. Праводзіць моладзь зь Менскай архікатэдральнай парафіі.

**03.00** — дэманстрацыя фільму «Караль — чалавек, які стаў папам рымскім».

**05.00** — адарацыя Найсьвяцейшага Сакрамэнту.

**06.00** — гадзінкі да Маці Божай.

**06.30** — сьв. імша.

**07.00** — сьвяты ружанец.

**08.00** — сьв. імша. Правяць айцы-бэрнардыны.

(Сьпеў — хор «Polonez».)

**10.00** — сьв. імша.

(Спеў — хор «Голас душы»).

Пасьля імшы — благаслаўленьне ўдзельнікаў «Руху чыстых сэрцаў».

**12.00** — урачыстая сьв. імша.

(Сьпеў — хор «Gloria».)

Літанія да Маці Божай. Працэсія.

**Паводле catholic.by**

**На фота: пілігрымаў бласлаўляў кардынал Сьвёнтэк.**



**Павал Севярынец** — у 1998—2004 лідэр незарэгістраванага «Маладога фронту». Асуджаны за арганізацыю акцыяў пратэсту пасьля рэфэрэндуму 2004 году. Цяпер у высылцы ў Малым Сітне, на поўначы Полаччыны.

ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

# Банкет на могілках

Напярэдадні Тройцы на ўезьдзе ў Малое Сітна паставілі крыж. Вялікі, праваслаўны, звараны з абрэзкаў жалезнай трубы й пафарбаваны ярка-жоўтым колерам. Паставілі так, што й шыльду з назвай вёскі з машыны цяпер ледзьве разгледзіш.

Крыж, вядома, справа добрая. Разумею ўцеху чыноўнага сэрца дзе-небудзь у эпархіі ці аддзеле ідэалёгіі Полацкага райвыканкаму: паставілі на мапе вобласьці каля чарговага «нуліка» населенага пункту чарговы крыжык, пазначылі, так сказаць, кананічную тэрыторыю... Але сьпярша пабудаваць бы ў радыюсе трыццацёх кілямэтраў хоць адну царкву ці хрысьціянскую місію! Што насамрэч прыкрываюць такія крыжы ў глухой беларускай вёсачцы — мне давялося на свае вочы пабачыць якраз у Духаў дзень.

Апоўдні да мяне ў пакой пагрукалася спалоханая Вікторыя Віктараўна. «Бачыў, што на могілках творыцца? Народу цьма, паселі гурбамі, падаставалі ежу, толькі хрумст стаіць і гарэлку жлукцяць!.. «Славянскі базар», а ня Тройца».

Увогуле Тройца, яна ж Пяцідзясятніца, у беларусаў Сёмуха, або Духаў дзень — трэцяе паводле значэньня (пасьля Вялікадня й Раства) хрысьціянскае сьвята. На пяцідзясяты дзень пасьля Ўваскрасеньня Хрыста апосталам і вучням, сабраным разам, быў дадзены дар Сьвятога Духа (Дзеі Апостальскія, 2-гі разьдзел). Зьявілася ва ўсёй поўні трэцяя іпастась Божая (адкуль і назва Тройцы).

Фактычна Сёмуха (паводле сямі тыдняў, якія мінулі зь Вялікадня) — сьвята заснаваньня Царквы. У такі дзень прынята ўсёй сям'ёй ехаць, натуральна, у царкву на сьвяточнае набажэнства, а таксама ўпрыгожваць і храм, і хату сьвежым бярозавым вецьцем ды зелянінай — на знак моцы жыцьця ў Сьвятым Духу. Так робяць на Гомельшчыне, адкуль родам мой бацька, на Берасьцейшчыне, адкуль маці, дый у самім Віцебску.

А вось у Малым Сітне... Столькі народу на могілках мне не даводзілася бачыць тут ані на Радаўніцу, ані на Дзяды, ані на Вялікдзень. Некалькі дзясяткаў машынаў з гораду, перапоўнены рэйсавы аўтобус, люд з хутароў — насельніцтва вёскі павялічылася ці не ўдвая! — плюс поўная мабілізацыя тутэйшых жыхароў. Уся грамада і напраўду пасела тут за адмысловымі сталамі (па адным на два-тры крыжы) сямейнымі купамі на гэткую грандыёзную трызну. Згадалася формула, выведзеная знаёмым праграмістам: «Сваякі — гэта група людзей, якая зьбіраецца разам толькі з нагоды зьмены колькаснага складу».

Аказваецца, у Сітне зьбіраюцца разам яшчэ й на Сёмуху. Відовішча проста ўражвае: сюррэалістычнае ўзгор'е, вялізныя дрэвы,

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 14 — 21 ЧЭРВЕНЯ

### Суд над Зелянковым

На 29 чэрвеня прызначаны суд над 22-гадовым жлобінскім актывістам **Эдуардам Зелянковым:** навучэнца мэталюргічнага тэхнікуму вінавацяць у дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» (арт.193 ч.1 КК). Справа Зелянкова — першая, што дайшла да суду паводле «сухарэнкаўскіх» дабавак у Крымінальны кодэкс, зробленых напярэдадні выбараў.

Эдуарда затрымалі 13 сакавіка падчас напісаньня графіці «За свабоду!», «За Мілінкевіча!», «Малады фронт». Сьпярша на хлопца распачалі адміністрацыйную справу, аднак неўзабаве матэрыялы запатрабаваў начальнік Жлобінскага раённага аддзяленьня КДБ. Супрацоўнікі КДБ затрымалі Зелянкова на 3 сутак як падазраванага ў крымінальным злачынстве. Праз 10 сутак яны перадалі справу ў Жлобінскую пракуратуру, адтуль яна трапіла ў сьледчае аддзяленьне раённай міліцыі, а ўрэшце расьсьледаваньне правялі міліцыянты Цэнтральнага аддзелу Гомелю.

12 чэрвеня з Эдуарда ўзялі падпіску пра нявыезд. 19 чэрвеня яму прыйшла позва ў суд. Усе чатыры сьведкі, выкліканыя на суд, — з боку абвінавачаньня.

### 16 чэрвеня

У Слуцку на акцыі ў Дзень салідарнасьці затрымалі сябра ПБНФ **Віталя Амяльковіча**, моладзевых актывістаў **Дзяніса Балакіра** і **Юлію**. На іх склалі пратаколы за несанкцыяванае пікетаваньне. Непаўналетнюю Юлію 19 чэрвеня выклікалі ў школу, дзе змусілі напісаць тлумачэньне наконт удзелу ў акцыі.

### 21 чэрвеня

Праваабаронца **Андрэй Саньнікаў** паведаміў, што мытная служба аэрапорту «Менск-2» ужо 3 месяцы адмаўляецца вярнуць яму грошы: 26 сакавіка ў яго забралі на экспэртызу 1040 даляраў ЗША і 260 эўра.

Пракуратура Менску перадала ў суд справу палітвязьня **Аляксандра Казуліна**, якога вінавацяць у хуліганстве і арганізацыі вулічных беспарадкаў. 22 чэрвеня зьняволены адмовіўся ад харчаваньня ў Жодзінскай турме й перайшоў толькі на прадукты з харчовых перадачаў, бо яму не дазволілі перайсьці на дыетычнае харчаваньне. 26 чэрвеня прызначаны судзьдзя ў ягонай справе — Аляксей Рыбакоў з Маскоўскага раённага суду.

У судзе Маскоўскага раёну разглядалася справа актывіста АГП **Сяргея Ількевіча**, затрыманага напярэдадні ўвечары за наклейваньне налепкі «Дастаў». Яго затрымаў міліцыянт Сятой, які не паказаў пасьведчаньня, таму хлопец не пайшоў за ім. Міліцыянт паваліў актывіста на асфальт і выклікаў падмогу. Адзін з новапрыбылых памочнікаў, Раткевіч, ударыў Сяргея ў твар. Судзьдзя Надзея Рэвуцкая, якой забаронены ўезд у краіны Эўразьвязу, разглядала справу паводле арт.166 КаАП (супраціў работнікам міліцыі). Разгляд справы перанесены на няпэўны час.

Журналіста расейскай газэты «КоммерсантЪ» **Вадзіма Доўнара** аштрафавалі на 1 базавую велічыню за «дробнае хуліганства». Журналіста затрымалі 21 красавіка каля адміністрацыі прэзыдэнта: ахоўнік Ільля Плотнікаў, які выступіў сьведкам на судзе, заявіў, што Доўнар лаяўся матам і зьневажаў кіраўніка дзяржавы. Суд, на які журналіст нават не атрымаў позвы, доўжыўся 7 хвілінаў.

Актывіста **Антона Ясіновіча** ў Полацку затрымалі за распаўсюд друкаваных выданьняў без выходных зьвестак, заадно абвінаваціўшы ў нецэнзурнай лаянцы на адрас работнікаў праваахоўных органаў. Ноч ён прабавіў у ізалятары часовага ўтрыманьня. Суд доўжыўся 22 і 23 чэрвеня і скончыўся апраўданьнем затрыманага, бо ў пратаколах затрыманьня было шмат недакладнасьцяў.

У Сьветлагорску адбылася акцыя салідарнасьці сярод сяброў ТБМ па зборы сродкаў на карысьць **Натальлі Бордак**, якая страціла працу за ўдзел у выбарчай кампаніі.

### 22 чэрвеня

У Магілёве пастановай суду ліквідаваны рэсурсавы цэнтар **«Кола сяброў»**, які дзейнічаў 10 гадоў. Падставай для закрыцьця сталі пару-

рознакаляровыя крыжы, усе ў стужках ды вянках — і ажыўлены, шматлюдны, загульны банкет... Зрэшты ўвесь размах сіценскай Сёмухі праясьніўся пад вечар: сям-там пад крыжамі, быццам непрыбраныя трупы, валяліся п'яныя мужыкі, а нейкая кабеціна спала, паклаўшы галаў проста на стол. Там жа ўбачыў кранальную сцэнку.

Дзьве жанчыны абыходзілі пахаваньні, уголас ацэньваючы, у каго «цьвятоў багата й вянкамі ўсё абкладзена», а ў каго «зарасло, і цьвяты пасохлі»; выхваляліся «сваімі» магілкамі — так, як у горадзе ганарацца дзецьмі, якія, бач, вучацца на семкі-восемкі і дзень за кампутарам сядзяць...

Можа, сёй-той з этнографаў і ўзрадуецца: во, якая дружная й багатая народная традыцыя! Але калі замест сьвята жыцьця назіраеш, халера, усеагульную п'янку на месцы пахаваньня — больш падобна не на трыюмф беларушчыны, а на экзатычны нэкрафільскі культ дзе-небудзь у гушчарах паганскай Амазоніі.

Пасьля Тройцы мне стала канчаткова ясна: каб зразумець гэтую вёску, трэба ня столькі распытваць жыхароў, колькі дасьледаваць могілкі.

Сіценскія могілкі — зарослы стогадовымі хвоямі ды бярэзінамі ўзгорак — разьмяшчаюцца ў самым цэнтры Малога Сітна, там, дзе раней стаяла царква. Мне ўдалося налічыць тут 569 пахаваньняў. Крыху менш за палову зь іх — безыменныя. Самы стары пазначаны крыж — 1881 г. Па-беларуску на сіценскіх могілках няма ніводнага надпісу, хаця «Кавалёв» або «дарагой папачка» трапляюцца досыць часта. Цэлымі кланамі — Глазкіны, Кучыцы, Дзюўбанавы, Сіманенкавы, Луфэравы, Журыдавы, Быхаўцы, Лапенкі, Манякі... Сустракаюцца й вартыя асобнага апавяданьня гісторыі: магілка былой старшыні сельсавету, якая высяляла «кулакоў», з выкалатымі на фатаздымку вачыма; тры магілкі 1942 г. — «зверски замучаны врагами народа», прычым фота аднаго з закатаваных — у белагвардзейскай фуражцы з кукардай... Рахую гады пахаваньняў, і раптам высьвятляецца страшная рэч. Больш 150-ці магілак (45% ад усіх пазначаных!) датуюцца апошнімі 12-цю гадамі. У кагосьці яшчэ ёсьць пытаньні, дзе *квітнее стабільная Беларусь*?

Але тое, што ўразіла больш за ўсё, дык гэта навершшы. На колішніх чырвоных пірамідах пазразаныя жалезныя зоркі й замест на штырах прылітаваныя папярочыны: крыжы. На каменных надмагільлях крыжыкі выбітыя або прымацаваныя відавочна пазьней.

Зь нейкіх глыбіняў падсьвядомасьці ў людзей усплывае, што *беларусы — хрысьціянскі народ*. Але што гэта значыць і да чаго абавязвае? Пакуль Сітна ладзіла вялікія ешчы, у 10 гарадох Беларусі галадавалі маладафронтаўцы. І тое, што было напісана на іхніх майках, куды больш адпавядала сутнасьці Духава дня: «Дзе Дух Господні — там свабода!» (2 Карынф 3:17).

Што патрэбна, каб старэйшае пакаленьне не наталяла свой голад на могілках у гонар памерлых, а моладзь не адмаўлялася ад ежы дзеля свабоды жывых? Што мае адбыцца, каб крыж, усталяваны на ўезьдзе ў Сітна, не ўспрымаўся як пахавальны, а знакаваў бы тэрыторыю Боскасьці й беларускасьці?

Адказ адзіны: нацыянальнае абуджэньне.

*Малое Сітна*

> Што патрэбна, каб старэйшае пакаленьне не наталяла свой голад на могілках у гонар памерлых, а моладзь не адмаўлялася ад ежы дзеля свабоды жывых?

## ХРОНІКА РЭПРЭСІЙ І СУПРАЦІВУ 14 — 21 ЧЭРВЕНЯ

шэньні: у статут былі ўнесеныя зьмены пры недастатковай колькасьці ўдзельнікаў сходу.

Чыгуначны раённы суд Віцебску пачаў пераглядаць адміністрацыйныя справы **Яўгена Бабковіча** і **Івана Бурыкіна**, затрыманых у Віцебску 18 чэрвеня.

На станцыі мэтро «Магілёўская» ў Менску міліцыянты затрымалі актывістаў АГП **Алега Корбана**, **Мікалая Сяргеева** і грамадзянку Расеі **Вольгу Нячаеву**, на якіх былі саколкі з эмблемай АГП і словам «Надакучыў». Затрыманым сказалі, што на іх былі скаргі ад пасажыраў мэтро: маўляў, моладзь «кепска глядзела на пасажыраў».

### 23 чэрвеня

Палітвязьня **Сяргея Ляшкевіча** перавялі з Гарадзенскай турмы ў Глыбокае.

Вярхоўны суд пачаў разгляд справы па прыпыненьні да 1 верасня дзейнасьці **РГА «Беларускі Хэльсынскі камітэт»**: Мін'юст лічыць, што арганізацыя не сплаціла падаткаў, а таксама ня выправіла шэраг недакладнасьцяў на сваім сайце. Праваабаронцы кажуць, што справа зь фінансамі яшчэ вырашаецца ў Вышэйшым гаспадарчым судзе (ВГС), а выправіць недакладнасьці на сайце яны ня могуць, бо блякаваны рахунак арганізацыі. БХК адразу падаў хадайніцтвы пра прыпыненьне працэсу ў сувязі з разглядам нагляднай скаргі ў ВГС. Суд абвясьціў перапынак да 27 чэрвеня.

23 чэрвеня стала вядома, што пракуратура апратэстоўвае рашэньне суду Маскоўскага раёну па справе **Юр'я Радзівіла**, асуджанага на 3 месяцы арышту. Пракурорскія работнікі патрабуюць больш жорсткага пакараньня.

У Менску падчас правядзеньня самітаў ЭўрАзЭС і АДКБ затрымалі моладзевых актывістаў: непаўналетнія **Аляксандар Чарнышоў**, **Руслан Мацьвееў**, **Настасься Шышкова**, **Даніла Барысевіч** і **Яўген Лешчанка** выйшлі на плошчу Перамогі з расьцяжкай «Расейскі салдат — ідзі дамоў!», а таксама з нацыянальным і афіцыйным беларускімі сьцягамі. Па кароткім часе актывістаў затрымалі, разам зь імі затрымалі **Аляксея Ляўковіча** і **Алену Копач**, якія вялі фота- і відэаздымкі акцыі. На непаўналетніх склалі адміністрацыйныя пратаколы за ўдзел у несанкцыяванай акцыі і дробнае хуліганства ды адпусьцілі. На А.Ляўковіча і А.Копач склалі такія самыя пратаколы, але даставілі іх у турму на вул.Акрэсьціна. Да А.Копач выклікалі хуткую і забралі на лекаваньне, а Ляўковіча асудзілі на 10 сутак арышту.

У Палацы мастацтваў 23 і 24 чэрвеня былі сарваныя канцэрты **рок-гуртоў на «Адборышча»** — падрыхтоўчы тур для «Басовішча». Не зважаючы на дазвол ад Мінкульту, дамову з адміністрацыяй Палацу і аплачаную за 2 дні арэнду, супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сытуацыях забаранілі канцэрт, абгрунтаваўшы гэта «небясьпекай абвалу столі».

Падчас чэрвеньскай сэсіі з розных ВНУ Менску выключаныя сябры «Моладзі БНФ», якія бралі актыўны ўдзел у вясновых вулічных пратэстах 19—25 сакавіка. **Сьцяпан Сьвідэрскі** і **Яўген Неткачаў** навучаліся на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту, **Ігар Падалінскі** — на філялягічным факультэце БДУ (усе трое адбылі турэмныя арышты за ўдзел у вулічных акцыях), **Макар Ваўчок** быў студэнтам Менскага лінгвістычнага ўнівэрсытэту.

### 26 чэрвеня

**Зьмітра Дашкевіча** выклікалі на допыт у пракуратуру ў справе «Маладога фронту». Аднак у сам дзень допыту яму паведамілі, што візыт пераносіцца. Дашкевіч сьведчыць, што такія пераносы адбываюцца ўжо ці ня пяты раз.

**Артуру Фінькевічу** назвалі месца адбываньня пакараньня: 29 чэрвеня ён павінен прыбыць у Магілёў на праспэкт Пушкіна, 65. За палітычныя графіці хлопец асуджаны на 2 гады хіміі.

Актывіст **Юры Сьветлакоў** з Бабруйску атрымаў адказ на сваю скаргу: пракуратура Ленінскага раёну Бабруйску пачала дысцыплінарную справу на асобаў, якія незаконна затрымалі Сьветлакова 25 красавіка, **Мікіту Быцэнку** і **Аляксея Радомскага**, зьвінаваціўшы ў нецэнзурнай лаянцы й антыграмадзкіх паводзінах. Суд тады спыніў справу праз адсутнасьць правапарушэньня.

**АШ**

# Фольксваген: Каапэрацыя з Лукашэнкам сьмерці падобная

Ці павінна незалежнае грамадзтва ўстаць поруч з уладай на абарону незалежнасьці краіны? Ці існуе зараз пагроза незалежнасьці Беларусі? Пры якіх умовах наагул магчымы дыялёг улады і апазыцыі? Гэтыя пытаньні сфармуляваў у артыкуле ў «НН» №22 Аляксандар Фядута. На гэтым тыдні яму адказаў аўтар палітычнага блогу Фольксваген. «Фактарам ратаваньня незалежнасьці стане нацыя, а не рэжым».

1. Беларусь як дзяржава (сувэрэнная адзінка) адбылася, і варыянты гвалтоўнай страты незалежнасьці адсутнічаюць. Сёньня не 1938 год.

2. Варыянт «Расея ажыцьцяўляе эканамічны ціск дзеля таго, каб беларусы (альбо сам Лукашэнка) папрасіліся ў Расею» магчыма існуе ў галюцынацыях расейскай хеўры. Аднак яго ажыцьцяўленьне будзе спынена акурат тады, калі стане, відавочна, што гэта ўзмацняе альбо Лукашэнку, альбо, што яшчэ горш для Крамля, апазыцыю.

3. Для ажыцьцяўленьня такіх геапалітычных пeратрусаў у сучасным сьвеце патрэбны ня войскі ці газаправоды, а: а) інфармацыйныя рэсурсы, б) пятая калёна ўнутры краіны. І таго, і другога ў Расеі сёньня няма. Дарэчы, Лукашэнка вынішчыў гэтыя патэнцыйныя чыньнікі аншлюсу без дапамогі апазыцыі.

4. Дзяржава ня зводзіцца да трубаў і іншай уласнасьці. Адваротнае азначае, што Беларусь як незалежная дзяржава можа існаваць толькі ў рамках таталітарна-каманднай сыстэмы. Гэты міт упарта распаўсюджвае Лукашэнка. Падключэнца да гэтага апазыцыі азначае дапамагчы Лукашэнку ўзмацніць свой ідэалягічны дыскурс.

5. Пазбавіць Беларусь незалежнасьці можа толькі сам Лукашэнка і добраахвотна. Ня думаю, што ён гэтага захоча. Таму любая каапэрацыя зь ім «у імя абароны незалежнасьці» ёсьць фікцыяй, наступствам якой (і магчыма, мэтай прапаганды якой) ёсьць падпарадкаваньне апазыцыі ідэалёгіі і дыктату ўладаў — і такім чынам яе канчатковая нэўтралізацыя.

6. Сцэнар, аб якім казаў на радыё «Свабода» Юры Дракахруст: «эканоміка рушыцца, народ бунтуе, Лукашэнка ратуецца і імкнецца далучыцца да Расеі» — не вытрымлівае крытыкі. Рэжымы, падобныя да лукашэнкаўскага, падаюць ня ў выніку сацыяльнага бунту, а нацыянальнага чыну. Зьнішчаючы беларускую нацыю, нацыянальную ідэнтычнасьць, Лукашэнка падкладае доўгатэрміновую бомбу пад падмурак беларускай незалежнасьці. Каапэрацыя зь ім (зноў падкрэсьлю — фантом каапэрацыі) была б сьмерці падобная.

7. Галоўнае пытаньне, праз якое існуе канфрантацыя паміж рэжымам і яго апанэнтамі — гэта не пытаньне дзяржавы (яно вырашанае) і нават не пытаньне дэмакратыі, а пытаньне нацыі. Пытаньне, якой мусіць быць беларуская нацыя, застаецца адкрытым і падлягае супольнай працы інтэлектуалаў, незалежна ад палітычных поглядаў ці моўнай арыентацыі. Відавочна, што гэта ня мусіць быць абрубкам агульнасаўковага калгасу ў межах былой БССР — праект, які цяпер уладай і рэалізуецца. Паўстаньне нацыі як супольнасьці грамадзянаў, якія падзяляюць асабістую адказнасьць за захаваньне калектыўнага дабра, ёсьць неабходным чыньнікам таго, каб улада Лукашэнкі «захісталася». Толькі тады магчымы і варыянт «ратаваньня ў Расею». Аднак у такім выпадку фактарам ратаваньня незалежнасьці стане менавіта нацыя, а не рэжым.

8. Лукашэнка і апазыцыя ніколі ня знойдуць кампрамісу ў пытаньнях нацыі. Першы арганізуе беларускую супольнасьць такім чынам, каб яна была б арганічна несумяшчальная з дэмакратыяй і ў канчатковым выніку — незалежнасьцю (незалежнасьць дзяржавы і прэзыдэнцкі абсалютызм на новых гістарычных этапах непазьбежна стануць несумяшчальнымі).

9. Фантом супрацоўніцтва па адхіленьні няяснай пагрозы ёсьць спосабам самазабойства дэмакратычнай і нацыянальнай альтэрнатывы. Сапраўдным адказам Лукашэнку і Крамлю ёсьць яе выпрацоўваньне і распаўсюджваньне ў грамадзтве.

*tolblogs.org/belarus/by*

# Незалежнасьць не залежыць ад аднаго чалавека

Тыя самыя словы ў «абарону свабоды» маглі гучна прамаўляць ліцьвіны ў сойме XVIII ст.

Спадар В.Тарас піша («НН», №21): «Ня трэба шукаць вызначэньняў і тлумачэньняў свабоды. Ня трэба яе проціпастаўляць незалежнасьці, заблытваючы саміх сябе. Ад палітыкаў зараз патрабуюцца канкрэтныя дзеяньні ў абарону свабоды. Усё астатняе — другаснае».

Думаю, прыкладна тыя ж самыя словы ў «абарону свабоды» маглі гучна прамаўляць ліцьвіны ў сойме XVIII ст. Мы ўсе добра ведаем, чым гісторыя скончылася.

Ня трэба грэбаваць незалежнасьцю — яе ў нас і так няшмат, а дзякуючы падобным выказваньням яе можа стаць яшчэ менш. Бо менавіта такія правакацыйныя заклікі найперш і проціпастаўляюць мэту незалежнае дзяржавы мэце свабоднага грамадзтва. У мяне, прынамсі, да прачытаньня артыкулу сп.Тараса нават думкі не было назваць свабоду другаснай ці пытаньне незалежнасьці — заблытаным. Незалежнасьць Беларусі — ужо — не залежыць ад волі (ці бязвольля) аднаго чалавека, каб дазваляць яму чыніць якія-кольвек рэпрэсіі, але й свабода як такая незалежнасьці не ўмацуе.

Безь незалежнасьці няма свабоды, без свабоды ня можа быць незалежнасьці. Тут увогуле няма — і ня можа быць — нічога другаснага. Можа, сапраўды, ня варта заблытваць сябе і іншых?

**Сьвета Думка**

# Як жыць у зубе дракона?

Сумнеўны тэзіс «улада Лукашэнкі пад пагрозай» ператвараецца ва ўмелых руках у «Айчына ў небясьпецы!». Піша **Віталь Тарас.**

Размовы аб тым, што Беларусь апынулася пад пагрозай страты незалежнасьці і таму апазыцыя павінна, забыўшыся на ўсе «крыўды», згуртавацца вакол кіраўніка дзяржвы, узьнікаюць не ўпершыню. Валер Булгакаў («НН», №22) назваў такія размовы на тле падвышэньня цэнаў на расейскі газ, што мае адбыцца, «спэкуляцыяй». І з гэтым можна пагадзіцца. Але варта нагадаць, што азначае слова «спэкуляцыя» ў закранутым кантэксьце. Гэта важна, бо датычыць ня толькі апошніх спэкуляцыяў наконт меркаваных плянаў Крамля ажыцьцявіць аншлюс Беларусі.

## Тэорыя змовы

Панятак «спэкуляцыйнае мысьленьне» азначае мысьленьне, адарванае ад рэчаіснасьці, разумовую пабудову. Філёзаф Вячаслаў Сьцёпін (колішні прафэсар БДУ, а зараз — чалец-карэспандэнт РАН) некалі ў прыватнай гутарцы прывёў такую ілюстрацыю спэкуляцыйнага мысьленьня. Можна заявіць, што ўвесь працэс разьвіцьця чалавецтва ёсьць насамрэч працэсам гніеньня зуба ў пашчы гіганцкага дракона. Давесьці праўдзівасьць такой гіпотэзы гэтаксама немагчыма, як і абвергнуць яе. На такім стылі мысьленьня, які апрыёры не патрабуе доказаў, пабудаваная вядомая кніга «Молат вядзьмарак», што служыла дапаможнікам для сярэднявечных інквізытараў, а таксама ўвесь разьдзел, так бы мовіць, чалавечых ведаў пад назваю кансьпіралёгія, альбо «тэорыя змовы».



Ленін таксама ўпарта пісаў у анкетах у графе «прафэсія» — журналіст.

Паводле гэтай тэорыі, напрыклад, і ўзьнікненьне СССР, і ягоны распад ёсьць вынікам змовы масонаў, якія авалодалі сучасным заходнім грамадзтвам і хочуць разбурыць падмурак праваслаўнай цывілізацыі. Узораў чалавечай «думкі» ў гэтай галіне шмат — пачынаючы ад «Пратаколаў сыёнскіх разумнікаў» і ўлучна да кнігаў Дэна Браўна й фільмаў Азаронка. Толькі Браўн выкарыстоўвае кансьпіралягічныя «адкрыцьці» выключна дзеля забавы публікі й зарабленьня грошай на яе цікаўнасьці, а фільмы Азаронка падносяцца гледачам як творы высокай духоўнасьці, адпаведныя дзяржаўнай ідэалёгіі.

Спрачацца з падобнымі «творамі» няма ніякай магчымасьці. Колькі ні пераконвай антысэміта й прыхільніка тэорыі «жыдамасонскай змовы» ў рэальнасьці галакосту — у тым, што мільёны габрэяў былі зьнішчаныя ў гітлераўскіх лягерах сьмерці, ён альбо будзе рабіць выгляд, што гэтага ніколі не было, альбо заявіць, што Гітлер сам быў габрэй. Так нацыстоўскі злачынца Юліюс Штрайхэр, які адказваў у гітлераўскім Райху за вырашэньне «габрэйскага пытаньня», заявіў на судзе ў Нюрнбэргу, што габрэі перамаглі ў вайне і таму ён, Штрайхэр, гатовы цяпер верай і праўдай служыць... «сусьветнаму габрэйскаму ўраду».

Якія б рэчавыя доказы ў свой час ні прыводзіліся гісторыкамі ды археолягамі, якія сьведчылі, што ў Курапатах НКВД расстрэльваў мірных жыхароў, газэта камуністаўчыкінцаў «Мы и время», тыднёвік «7 дней», іншыя дзяржаўныя выданьні ўпарта сьцьвярджалі, быццам ва ўрочышчы ляжаць парэшткі гамбурскіх габрэяў, расстраляных немцамі падчас акупацыі. (Прычым аўтары гэтай гіпотэзы не прапаноўвалі ўвекавечыць памяць закатаваных у Курапатах стварэньнем мэмарыялу, паколькі зьнішчаныя габрэі, ды яшчэ гамбурскія, згодна зь лёгікай падобных гіпотэзаў, не заслугоўваюць помнікаў.)

## Разьвіцьцё капіталізму ў Беларусі

У прыведзеных прыкладах мы маем справу з самым нізкім, амаль нэандэртальскім узроўнем «спэкуляцыйнага мысьленьня», якое й мысьленьнем назваць цяжка, бо яно заснаванае цалкам на агрэсіўным невуцтве. Але нельга думаць, што інтэлектуальныя асобы, узброеныя ўнівэрсальнымі ведамі, лягічным апаратам і высокай самаацэнкай, ня здольныя карыстацца падобнымі мэтадамі «пазнаньня» сьвету. Яны ня хочуць толькі карыстацца лязом Акама.

Правіла, вядомае як «лязо Акама», узьнікла ў навуцы раней, чым зьявіўся «Молат вядзьмарак». Паводле гэтага правіла, ня трэба памнажаць колькасьць сутнасьцяў безь неабходнасьці. Гэта значыць, калі нешта можна патлумачыць нейкімі натуральнымі прычынамі — ня трэба прыдумляць прычынаў трансцэндэнтальных. Гэта зусім не азначае, быццам у прыродзе няма зьяваў сапраўды загадкавых, ірацыянальных, невытлумачальных. (Эзатэрычныя веды тут увогуле пакінем у баку.)

Але прырода — і прырода сусьвету, і прырода чалавека — сама па сабе настолькі складаная рэчы, тоіць у сабе столькі фээрычных загадак і фантастычных адкрыцьцяў, што няма абсалютна ніякай патрэбы прыдумляць нешта

Працяг на старонцы 16.

# Як жыць у зубе дракона?

Працяг са старонкі 15.

звышнатуральнае, дурыць сабе й астатнім галаву нейкімі спэкуляцыямі кшталту жыцьця як формы гніеньня зуба дракона. Няўжо жыцьцё людзей настолькі сумнае і прымітыўнае, што трэба прыдумляць нейкі паралельны сьвет, поўны духаў, кадаўраў, ваўкалакаў, іншаплянэтнікаў ды іншых монстраў? Хіба сам чалавек ня можа быць монстрам, якога ня здольны прыдумаць ніякі самы вычварны розум? Хіба чалавек ня можа ператварыць сваё жыцьцё і жыцьцё іншых людзей у сапраўднае пекла, каб трэба было выдумляць пекла інфэрнальнае?

Тут няма размовы аб літаратуры й мастацтве.

Размова аб рэальным жыцьці — калі сапраўды мы хочам жыць рэальным, а не прыдуманым інтэлектуаламі жыцьцём.

Чаму некаторым зь іх лязо Акама недаспадобы? Тлумачыцца гэта, як ні парадаксальна, не інфэрнальнымі, а цалкам зямнымі, натуральнымі прычынамі. Даўно сказана, што калі б табліца памнажэньня закранала чыесьці інтарэсы, знайшліся б ахвотнікі яе абвяргаць. Для таго, каб маляваць рэальную, няпростую карціну жыцьця — напрыклад, грамадзка-палітычнага жыцьця краіны, — трэба гэтую карціну прынамсі ведаць. Узгадаем работу Леніна «Разьвіцьцё капіталізму ў Расеі». Высновы, якія зрабіў аўтар на пачатку мінулага стагодзьдзя, як цяпер выглядае, былі памылковыя. Але ж ён карыстаўся багатым статыстычным матэрыялам, які ў царскай Расеі можна было атрымаць свабодна. Ці шмат мы ведаем сучасных палітолягаў і аналітыкаў у Беларусі, якія б рэгулярна апэравалі рэльнымі статыстычнымі і сацыялягічнымі зьвесткамі, датычнымі сучаснага стану беларускай эканомікі ці іншых бакоў матэрыяльнага і духоўнага жыцьця нацыі? Тут можна сутыкнуцца з многімі сустрэчнымі пытаньнямі: а хіба ёсьць у сучаснай Беларусі статыстыка і сацыялёгія, якім можна было б давяраць? Дзе і як здабыць сапраўдныя зьвесткі? Дзе іх можна апублікаваць, як давесьці вынікі аналізу да шырокай аўдыторыі? Урэшце, ці здольная яна, гэтая сёньняшняя аўдыторыя, успрымаць нешта наагул, акрамя гараскопаў ды прароцтваў? (Адно з такіх «прароцтваў» — пра расейскія танкі, якія хутка зьявяцца ў Беларусі, — апублікавала нядаўна «Народная воля».)

Усё так, сучасныя акалічнасьці існаваньня (дакладней — зьнікненьня) незалежнай прэсы ў Беларусі гранічна звужаюць магчымасьці паліталёгіі й журналістыкі. Але гэта толькі адзін бок справы.

### З дакладнасьцю да 20%

Ня будзем разглядаць тут прапагандысцкія опусы ў дзяржаўных газэтах і тэлефільмы таго ж Азаронка. Але ж і публіцысты незалежных выданьняў нярэдка карыстаюцца тымі ж мэтадамі, што й іхныя дзяржаўныя калегі. Слабая залежнасьць большасьці апазыцыйных газэтаў ад свайго чытача (як і дзяржаўных СМІ — ад падаткаплатніка) прыводзіць да таго, што аўтары прапагандуюць свае ўласныя палітычныя ідэі і погляды, пераважна спэкуляцыйнага характару. І ніхто ні за што не нясе адказнасьці. Адвечны падзел працы: сабака брэша, вецер носіць.

Амаль поўная адсутнасьць інфармацыі аб тым, што адбываецца ва ўладных калідорах, ніколі не замінае спэкуляцыям на гэтую заўсёды прывабную для чытача тэму. Наадварот, яны на дэфіцыце інфармацыі і будуюцца. Адна з найбольш папулярных тэмаў апошніх гадоў — пляны Крамля адхіліць Лукашэнку ад улады альбо анэксаваць Беларусь. Прычым другое адвольнае дапушчэньне выводзіцца журналістамі з такога самага адвольнага, узятага са столі, першага. І вось ужо сумнеўны тэзіс «улада Лукашэнкі пад пагрозай» ператвараецца ў стары як сьвет слоган: «Айчына ў небясьпецы!».

Яшчэ адна ўлюбёная тэма апазыцыйнай прэсы — «замежжа нам дапаможа». Кожнага разу перад выбарамі прыводзяцца дзясяткі доказаў, чаму ЗША і Эўропа менавіта цяпер падтрымаюць беларускую апазыцыю і так націснуць на Крэмль, што той здасьць свайго хаўрусьніка з усімі вантробамі.

Успамінаецца эпізод з адным чэскім кінарэжысэрам. Напярэдадні здымак важнага эпізоду на натуры ён зьвярнуўся да бюро мэтэапрагнозу з просьбай адказаць — якое надвор'е чакаецца ў бліжэйшыя дні? Сыноптыкі прыслалі афіцыйны адказ, у якім было пазначана, што ў бліжэйшыя дні верагодны дождж. Праўда, пры гэтым яны дадалі, што дакладнасьць прагнозу не перавышае 20%. Ага, дык значыць, можна быць упэўненымі на 80%, што надвор'е будзе сонечнае! — узрадаваўся рэжысэр і загадаў распачынаць здымкі.

Тое, што прагнозы айчынных «прагназолягаў» ніколі ня спраўджваюцца, ня мае практычна ніякага значэньня. Ня тое каб аналітыкі займаліся прагназаваньнем выключна дзеля любові да мастацтва. І ня тое каб яны выконвалі нейкую замову спэцслужбаў з мэтай увесьці ў зман грамадзкасьць. Ня будзем карыстацца аргумэнтамі «канспіролягаў». Увесьці ў зман грамадзкасьць пасьля таго, як яе ўводзілі ў зман як мінімум тройчы, ужо немагчыма. Проста развагі на такія высокія тэмы, як лёс Бацькаўшчыны альбо лёс першай асобы дзяржавы надаюць аўтарам адчуваньне ўласнай значнасьці. Для іх адсутнасьць дакладнай інфармацыі аб тым, што адбываецца насамрэч, — як манна зь нябёсаў. Ашмёткі інфармацыі з высокіх кабінэтаў, паўнамёкі, чуткі, а яшчэ лепш — набліжанасьць да якой-небудзь крыніцы ў вярхох, перапаўняюць іх пачуцьцем, блізкім да экстазу. Але

часьцей за ўсё нават і гэтага няма. (Як кажа гераіня старога анэкдоту — Новы год часьцей...) А ёсьць жаданьне, каб астатнія паверылі — аўтар ведае нешта такое, чаго ня ведаюць звычайныя чытачы альбо слухачы.

Адзін мой знаёмец, далёкі ад журналістыкі чалавек, пачаў неяк распавядаць пра свайго сябра, які працуе нібыта ў прэзыдэнцкіх структурах. «Ён такія страшныя рэчы ведае, — казаў ён змоўніцкім шэптам. — Ты сабе ўявіць ня можаш!» «Ну, і што канкрэтна паведаміў твой сябра?» — пацікавіўся я ў знаёмца. «Ты ведаеш, — сумеўся суразмоўца, — ён жа ня можа аб усім гаварыць. Ён пасадай рызыкуе...»

Інфармацыя, аб якой няможна казаць, ня ёсьць інфармацыяй. Але інфармацыя аб тым, што я валодаю такой інфармацыяй ды не магу ёй падзяліцца, чамусьці надае мне вагі ва ўласных вачох і ў вачох маіх калегаў і знаёмцаў.

Паняцьце эксклюзіўнасьці, жаданьне першым данесьці вестку (добрую альбо кепскую) да астатніх — рэч цалкам нармальная ў журналістыцы. Выдаваньне сябе за аракула, якому вядомыя таямніцы мадрыдзкага двара альбо нейкія яшчэ больш высокія таямніцы, стаўленьне да ўласных тэкстаў як да Сьвятога Пісаньня — у журналісцкім асяродку вартыя жалю.

Але яшчэ больш вартае жалю тое, што ў грамадзтве, дзе адсутнічае грамадзянская супольнасьць, дзе адсутнічае дэмакратычны друк (як сыстэма, а не асобныя выданьні), журналістыка губляе свае функцыі, а журналісты ператвараюцца альбо ў прапагандыстаў, альбо ў аракулаў і публіцыстаў.

## Публіцыстыка ленінскай школы

Жанр публіцыстыкі ў тым выглядзе, як яго вывучаюць на журфаку БДУ (яго можна назваць савецкай публіцыстыкай) нарадзіўся ва ўмовах адсталага расейскага грамадзтва, дзе прасунутыя, кажучы сучаснай мовай, інтэлектуалы, «звали Русь к топору» ці заклікалі да падобных, ня менш прыгожых, рэчаў. Напрыклад — да стварэньня царства Божага на зямлі, царства свабоды, справядлівасьці і роўнасьці. Бальшавікі (публіцысты ленінскай школы, на творах якіх выхоўваюць сёньняшніх тэлежурналістаў, кшталту Дзяніса Бальшакова) здолелі гэта зрабіць. Гэта значыць, спэкуляцыю, разумовую пабудову здолелі-такі зрабіць рэчаіснасьцю. Праўда, яна выйшла не зусім такой, якой малявалася ў мозгу правадыра, і дзеля яе ажыцьцяўленьня давялося зьнішчыць некалькі дзясяткаў мільёнаў чалавек. (Цікава, дарэчы, што развагі Леніна пра інтэлігенцыю як «г... нацыі» дапоўніліся пазьней крэатыўнай марай пра тое, што бальшавікі будуць рабіць з золата клязэты).

Тым ня менш, імем Леніна-Сталіна дагэтуль клянуцца сотні тысяч людзей ва ўсім сьвеце, сярод іх — нафтавыя каралі, наркабароны і нават асобныя прэзыдэнты сувэрэнных дзяржаваў. Дык хіба можна назваць гэта крахам камуністычнай ілюзіі? Ілюзія, якая авалодала цёмнымі масамі, — страшная сіла. Як вядома, Ленін упарта пісаў ва ўсіх анкетах у графе «прафэсія» — журналіст. Трыюмф падобнай журналістыкі мы сёньня зноў перажываем. Герой Салтыкова-Шчадрына (сярод расейскіх губэрнатараў былі ня толькі мураўёвы-вешальнікі) зь места Дурнова ўвайшоў у гісторыю тым, што «спаліў гімназію і скасаваў навукі». Адзін зь ягоных нашчадкаў адкрыў бібліятэку, але пры гэтым настойліва параіў чытачам вывучаць адно толькі кнігі Леніна-Сталіна.

Лічыць, што свабодная журналістыка можа захавацца ва ўмовах несвабоднага грамадзтва — значыць цешыць сябе небясьпечнай ілюзіяй. Журналістыка таксама дэфармуецца, дэградуе і атамізуецца, як і грамадзтва ў цэлым. Якія б бліскучыя веды й здольнасьці ні дэманстравалі журналісты, як бы ні імкнуліся захоўваць прафэсійныя прынцыпы аб’ектыўнасьці, ва ўмовах сучаснай Беларусі гэтыя прынцыпы й здольнасьці застаюцца незапатрабаваныя.

Запатрабаваныя, як, зрэшты, і за камуністычным часам, застаюцца журналісты, здольныя запакоўваць у прыгожыя абгорткі высокіх словаў прымітыўныя, як мычаньне, ідэі пакорлівасьці ўладзе, а нізкае рабалепства высакапарна апраўдваць інтарэсамі Айчыны. Леў Талстой, якога ніхто ня можа падазраваць у адсутнасьці патрыятызму, падчас вайны зь Японіяй востра перажываў паразы расейскага войска, але яму не прыйшло да галавы заклікаць суайчыньнікаў аб’яднацца вакол цара-бацюхны бараніць расейскую манархію. Ён ніколі не хаваў свайго крытычнага стаўленьня да манарха, манархічнай сыстэмы і Расейскай Праваслаўнай Царквы, зь якіх бы патрыятычных пазыцыяў яны ні выступалі. Талстой падзяляў вядомы выраз брытанскага сучасьніка аб тым, што «патрыятызм ёсьць апошнім прыбежышчам нягодніка».

Што датычыць бацькоў-заснавальнікаў, дзяржаўных мужоў, якім ставяць помнікі ўдзячныя нашчадкі... Першым прэзыдэнтам незалежнага Віетнаму быў «дзядзечка Хо», маўзалей якога ўпрыгожвае горад Хо Шы Мін, названы імем кіраўніка віетнамскай кампартыі. Стаўленьне да яго соцень тысячаў віетнамцаў, якія пакінулі радзіму, ратуючыся ад рэпрэсіяў камуністаў, адрозьніваецца ад стаўленьня афіцыйных уладаў краіны.

Першаму прэзыдэнту незалежнага Туркмэністану Ніязаву помнік з чыстага золата паставілі пры жыцьці. Відаць, выконваючы запаветы Леніна наконт інтэлігенцыі і клязэтаў.

Першы прэзыдэнт Зымбабвэ Мугабэ, падобна Леніну, раздаў зямлю белых памешчыкаў жабракам. Чым паставіў краіну на мяжу жабрацтва, а карупцыя чынавенства пры ягоным рэжыме дасягнула нечуванага росквіту.

Ці працягваць сьпіс далей?

Хай заслугі сёньняшніх уладароў ацэньваюць нашчадкі.

Сёньняшнія журналісцкія ацэнкі, у тым ліку крытычныя, маюць толькі часовае значэньне. Ад журналістаў увогуле мала што залежыць ва ўмовах сёньняшняй Беларусі. Адзінае, што застаецца, — гэта спрабаваць сьледаваць парадзе, вынесенай на вокладку часопісу БАЖ «Абажур»: «Трымайся праўды». А ці жывём мы ў зубе дракона, ці апынуліся ў чэраве кіта, як біблейскі Ёна, што выйшаў з выпрабаваньня ачышчаным — гэта таксама некалі ацэняць нашыя нашчадкі.

# Венскі саміт

Беларусь стала «добрым прыкладам». Піша **Раман Якаўлеўскі.**

У чэрвені адбыліся міжнародныя мерапрыемствы, якія беспасрэдна зьвязваюць з самітам «вялікай восемкі», што мае адбыцца ў наступным месяцы ў Пецярбургу. Безумоўна, сярод такіх мерапрыемстваў паводле ступені сваёй значнасьці быў саміт ЗША—ЭЗ, які адбыўся 21 чэрвеня ў Вене.

Пасьля зьмены ўраду Нямеччыны і сыходу Герхарда Шродэра на «вольны хлеб» у газавую сфэру, практычна ўсе экспэрты загаварылі пра палітыку ўзмацненьня трансатлянтычнай супрацы, якую будзе праводзіц спн.Мэркель. Натуральна, Нямеччына як адзін з галоўных лякаматываў Эўразьвязу судзейнічала б узмацненьню такой супрацы ўсяго Эўразьвязу. Да нядаўняе пары тандэм Бэрлін—Парыж ня раз уносіў свае карэктывы ў адносіны Эўропы з ЗША. У тым ліку і ў пытаньнях супрацы з Расеяй і іншымі постсавецкімі дзяржавамі. Пасьля сэрыі двухбаковых кантактаў Бэрліна і Брусэлю з Масквой, што адбыліся за апошні час, назіральнікі сталі заўважаць, што ціск нямецкага буйнога бізнэсу ўсё ж вымушае спн.Мэркель суцішыць свой паўночнаатлянтычны пыл і, у пэўнай ступені, працягваць у дачыненьні да Расеі так званую «прагматычную палітыку Шродэра на Ўсходзе». Дарэчы, такую карэкціроўку прадказваў вядомы нямецкі аналітык Аляксандар Рар. Пасьля абвяшчэньня праекту будаўніцтва Паўночнаэўрапейскага газаправоду (ПЭГ) па дне Балтыйскага мора такая палітыка набыла яшчэ мацнейшы газавы пах. На яго прысутнасьць усё часцей скардзяцца і некаторыя эўрадэпутаты. Даволі рэзка супраць плянаў будаўніцтва ПЭГ выступалі Польшча, краіны Балтыі і некаторыя іншыя чальцы ЭЗ. Венскі саміт і быў закліканы зафіксаваць цяперашні стан паўночнаатлянтычных справаў.

У заключным камюніке саміту ЗША і ЭЗ падкрэсьліваюць сваю прыхільнасьць да «супольных каштоўнасьцяў» і адзначаюць, што «мэтады, што ўжываюцца ў барацьбе з тэрарызмам, мусяць цалкам адпавядаць нашым міжнародным забавязаньням, у тым ліку ў сфэры правоў чалавека, правоў уцекачоў і міжнароднага права».

Старшыня Эўрапейскае камісіі Жазэ Мануэл Барозу перасьцярог ад практыкі згортваньня грамадзянскіх правоў у барацьбе з тэрарызмам. Ён сказаў, што Эўразьвяз бачыць адной з сваіх задачаў працяг барацьбы з тэрарызмам. Аднак згортваньне грамадзянскіх правоў і свабодаў стала б перамогай для тэрарыстаў, падкрэсьліў ён. «У барацьбе з тэрарызмам мы ня мусім падрываць нашыя маральныя падмуркі, дапускаючы праўны вакуўм ці парушаючы правы чалавека. Мы ня мусім прадаваць нашу душу», — папярэдзіў Барозу. Удзельнікі венскага саміту ЭЗ—ЗША выявілі занепакоенасьць з нагоды палітычнага курсу Расеі. Занепакоенасьць трансатлянтычных партнэраў выклікае, у прыватнасьці, сытуацыя з правамі чалавека ў Расеі, парушэньні нормаў прававой дзяржавы і свабоды СМІ тамсама. На Беларусь таксама не забыліся.

ЗША і Эўразьвяз асудзілі рэпрэсіўныя дзеяньні беларускіх уладаў у дачыненьні да дэмакратычнай апазыцыі і запэўнілі, што будуць падтрымліваць «дэмакратычныя памкненьні беларускага народу і супрацоўнічаць зь ім». Як вядома, перад гэтым Брусэль і Вашынгтон санкцыявалі «чорны сьпіс» беларускіх чыноўнікаў, якім заблякуюць замежныя банкаўскія рахункі. Мала хто зьвярнуў увагу, што гэтыя рашэньні будуць закранаць беспасрэдна і бізнэс-структуры, з дапамогай якіх функцыянуе ня першы год беларускі рэжым. У бліжэйшым часе мусіць стаць вядомай рэакцыя на гэта бізнэсоўцаў у Нямеччыне, Аўстрыі, Галяндыі. Менавіта ў гэтых краінах зафіксавана найбольшая актыўнасьць тых, хто вядзе супольны бізнэс зь Менскам. У супольнай дэклярацыі асабліва падкрэсьліваецца, што палітыка ЗША і ЭЗ у дачыненьні да кіроўнага рэжыму ў Беларусі ёсьць добрым прыкладам супрацы гэтых двух суб’ектаў у сусьветнай палітыцы.

Такая канстатацыя была яўна адрасавана і Ўладзімеру Пуціну напярэдадні блізкага саміту G8 у Пецярбургу. Відавочна, што цана падтрымкі беларускага хаўрусьніка Крамля з кожным днём расьце. І мала падставаў меркаваць, што доўгатэрміновасьці рэжыму Лукашэнкі будуць спрыяць існыя супярэчнасьці ў гандлёва-эканамічнай сфэры між Вашынгтонам і Брусэлем. Ці праблемы ЭЗ, зьвязаныя з прыняцьцем Эўрапейскай Канстытуцыі.



За параўнальна кароткі гістарычны тэрмін Лукашэнка здолеў дамагчыся поўнай кансалідацыі Вашынгтону й Брусэлю ў беларускім пытаньні.

Праўда, некаторыя спадзевы менскіх стратэгаў сілкуюцца пэрманэнтнымі ўнутрыпалітычнымі калізіямі, што ўзьнікаюць то ў Варшаве, то ў Вільні ды іншых эўрапейскіх сталіцах. Такія стратэгі-мазгаведы сьцьвярджаюць, што тое, што адбываецца сёньня, ёсьць наступствам сяброўства ў ЭЗ. Так, у Польшчы назіраецца парадокс, калі да ўлады прыйшлі эўраскептыкі пры падтрымцы прыхільнікаў ЭЗ. А Літва, што ўжо прыняла Эўраканстытуцыю і злаўчылася ўступіць у ЭЗ без прэзыдэнта, звольненага праз імпічмэнт, ужо не адзін месяц перажывае ўрадавы крызіс. Але ні ў першым, ні ў другім выпадках «канца сьвету» не наглядаецца. Пра гэта сьведчыць дынаміка эканамічнага росту ў гэтых краінах. Да гэтай дынамікі можна дадаць і дынаміку «працьверазеньня» ад спадзеваў і ілюзіяў у дачыненьні да рэжыму Лукашэнкі.

Можна зь вялікай доляй упэўненасьці канстатаваць: калі раней па беларускай тэме ў Вашынгтону і Брусэлю былі тактычныя, не стратэгічныя разыходжаньні, дык цяпер, за параўнальна кароткі гістарычны тэрмін, Лукашэнка здолеў дамагчыся практычна поўнай эўраатлянтычнай кансалідацыі.

Некаторыя назіральнікі зьвярнулі ўвагу на тое, што на венскім саміце нейк не была заўважная тэма стварэньня збройных сілаў ЭЗ пры дзейсным цяпер NATO. Трэба меркаваць, рэальная пагроза міжнароднага тэрарызму ці іншыя якія выклікі не дазволяць нават багатым краінам распыляць сродкі на барацьбу зь імі. І ўсё болей пераважае меркаваньне, што ў зьмененым сьвеце трансфармуецца і NATO — сапраўды дзейсны вайскова-палітычны інструмэнт. Гэта, хай і зь цяжкасьцямі, прызнаецца і на постсавецкай прасторы.

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту, дасылайце адрасы і прыватныя ахвяраваньні

Каб гарантавана чытаць «Нашу Ніву» цяпер, калі «Саюздрукам» і «Белпошце» забаронена распаўсюджваць газэту:

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць па тэлефоне, факсам, праз пошту ці электронную пошту.**
Тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84
e-mail: dastauka@tut.by
паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) Просім кожную сям’ю чытачоў **пералічваць на рахунак** газэты ахвяраваньне з разьліку 6 000 рублёў на месяц. Гэтага будзе досыць для выхаду і дастаўкі газэты. **У блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу, калі ласка, дакладна і разборліва пазначайце ваш адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад’езду.** Тыя, хто перакажа 18 000 рублёў за раз, забясьпечаць выхад газэты на тры месяцы. Хто ж мае магчымасьць пераказаць 36 000 рублёў адразу, забясьпечаць публікацыю «НН» адразу на паўгоду.

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | **3015 212 000 012** | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

Кассир
Плательщик

**Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521**
получатель платежа
**МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764**
наименование банка

| Счет получателя | **3015 212 000 012** | Лицевой счет | |
|---|---|---|---|

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| **Ахвяраваньне** | | | | |
| | | | | |
| | | | Пеня | |
| | | | Всего | |

КВИТАНЦИЯ

Кассир М.П. Плательщик

## На які рахунак пералічаць грошы?

Ахвяраваньне можна перавесьці ў любым аддзяленьні банку, на любой пошце. Улічыце, што пры пераказваньні грошай паштовым пераводам пошта спаганяе дадаткова 3%, а пры пераводзе грошай праз «Беларусбанк» працэнту не бяруць.
На банкаўскай квітанцыі ў графе «Від плацяжа» трэба пазначыць: «Ахвяраваньне». У графе: «Атрымальнік плацяжа» трэба пісаць: «Фонд выданьня газэты «Наша Ніва», УНП 101 115 521». У графе «Найменаваньне банку» трэба пісаць: «МГД ААТ «Белінвестбанк», вул.Калектарная, 11, Мінск, код 764». У графе «Рахунак атрымальніка» 3015 212 000 012. Пры перасылцы грошай па пошце тое самае трэба пісаць у рубрыках «Каму» і «Куды».

## Ці трэба паўторна дасылаць адрасы ў Рэдакцыю?

Не, аднойчы даслаўшы, больш ня трэба (калі вы рэгулярна атрымліваеце газэту). Тады досыць не забывацца рэгулярна пералічаць ахвяраваньні.

## Хто дасылаў ахвяраваньні, але не паведаміў адрасу

Прабачце, што газэта прыйшла вам запозьнена. Рэч у тым, што вы пераказалі ахвяраваньне, але не паведамілі Рэдакцыі адрасу адразу. Квіток ахвяраваньня трапляе да нас праз 5—10, а часам і болей дзён.

Просім падпісчыкаў «НН» разборліва пазначаць нумары кватэраў на паштовых скрынках.

Дзякуй!

## Шукаем чытачоў

**Іван Уладзімеравіч П.** зь Менску, паведаміце, калі ласка, нумар кватэры.

## Калі вы не атрымалі газэты

да панядзелка, а ў Менску — да суботы, абавязкова тэлефануйце ў Рэдакцыю. Пытацца Аляксандру.

Тэлефоны:
(017) 284-73-29
(029) 613-32-32
(029) 707-73-29

**Вельмі просім чытачоў, якія чытаюць «НН» у Інтэрнэце, а не на паперы, таксама дасылаць прыватныя ахвяраваньні з разьліку 6000 на месяц з пазнакай: «за Інтэрнэт». Бяз збору грошай газэце не захаваць якасьці.**

# Для гарачых дзён

Чытачы «НН» прапанавалі вырабіць майкі (цішоткі) да стагодзьдзя газэты. Як паведамілі ініцыятары, папярэднія замовы прымаюцца на e-mail: zamova2006@tut.by. Пазначаць трэба імя, кантакт (мэйл ці тэлефон), колькасьць і памер. Каштаваць такая саколка будзе 15 тыс. рублёў.




# Шчыры дзякуй за шчодрасьць

**Т.Г., Анатолю З., Любові С., В.В., Сьвятлане Ц., В.К., В.Н., Георгію П., П.Л., А.Р., Г.Б., Натальлі М., Анатолю П., Ліліі Б., Анатолю С., Галіне В., Генадзю К., Барысу А., С.Ш., Марыі Н., Кацярыне Ш., Аляксандру Ш., В.Ш., М.А., Аляксандру К., Уладзімеру Б., Пятру Р., Юр'ю Ш., Эдварду К., Алене Г., Макару Ш., І.З., Валянціне Дз., Уладзімеру Ш., Марыі М., Валянціне В., Р.Б., Ніне Ш., Мікалаю С., Тацяне Г., С.Р., Леаніду Г., Вячаславу Д., Надзеі М., Валянціне Г., Ксені Д., Р.Б., Аляксандру Н., Ільясу Х., Мікалаю К., Валянціну Л., Паўлу Л., Уладзімеру З., Д.Б., Віталю К., Зьмітру Г., С.Я., Канстанціну Л., Г.С., Але К., Анатолю С., Паўлу П., Андрэю Б., Сяргею А., Настасьсі Т., Галіне Ж., Уладзімеру Ш., Казімеру Г., М.К., Б.Я., А.Б., Валеру В., Валянціну Ш., Натальлі Б., Дзінісу Ш., Алене М., Адаму З., Зьмітру В., Юр'ю М., Вользе А., Івану Ш., В.К., Мікалаю К., Адаму М., В.Л., Алене Г., З.С., Паўлу П., А.А., Т.П., Марыне З., Аўгену І., Л.П., Вячаславу В., Усеваладу С., Але С., Тацяне В., Уладзімеру Р., Тацяне М., Ганьне Л.** зь Менску.

**Сьцяпану Б., Л.С.** зь Менскага раёну.

**Валеру Ш.** з Круглянскага раёну.

**І.Ц.** з Жыткавічаў.

**Мікалаю Т.** з Асіповіцкага раёну.

**Юр'ю М.** з Кармянскага раёну.

**Арцёму Г., Валеру Г.** зь Ліды.

**Алене М.** з Астравецкага раёну.

**Аляксандру К., Генадзю С.** з Магілёва.

**Міхаілу Т.** з Слуцку.

**Аўгіньні К., Галіне Л., Любові Л., Тамары М., Любові Ш.** зь Віцебску.

**Валянціне М.** зь Лепелю.

**Уладзімеру Д.** з Наваполацку.

**В.А.** з Вушацкага раёну.

**Ёсіфу Д.** зь Сьвіслацкага раёну.

**Уладзімеру Д.** з Чэрвеня.

**Зьмітру Д.** з Бабруйску.

**Ганьне Ф., Ларысе Ц., Вользе К., Аркадзю Ж., Пятру П., Алене А., Соф'і В., Алесі Дз., Івану С., Віктару П., Рэгіне Г.** з Горадні.

**Зьмітру Ж.** з Воршы.

**Ёсіфу Дз.** з Гарадзенскага раёну.

**Лявонцію А.** з Полацкага раёну.

**Тадэвушу Ш., Генадзю Ш.** з Маладэчна.

**Зьмітру К.** з Мастоў.

**Аркадзю М., Сяргею П., Марыі Б., Мікалаю Х., Віталю С., Зьмітру П.** з Гомелю.

**Г.Б., Пятру Д.** зь Сьветлагорскага раёну.

**Валеру Ю.** з Салігорску.

**Валянціне М.** з Навагрудку.

**Леанарду М., Ігару Б.** зь Берасьця.

**Алегу Ш.** з Шаркаўшчынскага раёну.

**Уладзімеру Х.** з Бабруйскага раёну.

**Алене Г.** з Смалявічаў.

**Натальлі С.** з Полацку.

**Аляксандру С.** з Мазыра.

**Галіне Ч.** з Рэчыцы.

у кнігарнях з 20 чэрвеня




ПАДПІСНЫ ІНДЭКС 00345

# IV Фэст сярэднявечнай культуры «Наваградзкі замак»

Праграма фэсту.

## Гарадзкі пляц. «Канцэртная пляцоўка»

**1 ліпеня, субота**

12.00–14.45 Конкурс маладых выканаўцаў старадаўняй музыкі.

15.00–16.20 Канцэрт гурту «Drolls» (Расея).

16.30–17.50 Гурт «Бурдон» (Украіна).

18.00–19.00 Конкурс маладых выканаўцаў старадаўніх танцаў.

19.10–20.20 Гурт «Open Folk» (Польшча).

20.30 Урачыстае адкрыцьцё Фэсту, прадстаўленьне клюбаў–удзельнікаў.

21.00 Галя–канцэрт.

22.30 Начны бугурт.

22.45 Конкурс жанглёраў вагнявога шоў.

**2 ліпеня, нядзеля**

11.00–11.30 Канцэрт гурту «Стары Ольса» (Беларусь).

11.40–12.30 Гурт «Бурдон» (Украіна).

12.40–13.30 Гурт «Artes Liberales» (Беларусь).

13.40–14.30 Гурт «Ceilidh Ceol» Беларусь).

14.40–15.30 Гурт «Drolls» (Расея).

## Роў пад замкавай гарой. «Паказальная пляцоўка»

**1 ліпеня, субота**

12.00–19.00 Забаўляльная праграма (стральба з луку, катаньне на конях, кіданьне дзідаў і бервяна, «Пошук скарбу»).

12.00 III Турнір Караля Міндоўга: Конны рыцарскі турнір.

15.00 III Турнір Караля Міндоўга: Лучны турнір.

17.00 Праграма–выступ каскадзёраў Менскага тэатру трукаў.

**2 ліпеня, нядзеля**

11.00–15.00 Забаўляльная праграма (стральба з луку, катаньне на конях, кіданьне коп’яў і бервяна, «Пошук скарбу»).

11.00 III Турнір Караля Міндоўга: «Забавы вікінгаў».

16.00–16.45 Інсцэніроўка штурму войскам Тэўтонскага Ордэну Наваградзкага замку ў 1394 г.

16.45–16.50 Прадстаўленьне клюбаў–удзельнікаў Інсцэніроўкі штурму.

16.50–17.00 Фатаграфаваньне гледачоў на памяць з рыцарамі.

## Замкавая гара. «Турнірная пляцоўка»

(Уваход – платны)

**1 ліпеня, субота**

12.00–19.00 «Рыцарскі стан на Замкавай гары»: мэбля, посуд, вопратка, побытавыя прадмэты, настольныя гульні.

12.00 III Турнір Караля Міндоўга: Пешы рыцарскі турнір XII—XIII ст.

**2 ліпеня, нядзеля**

11.00–15.00 «Рыцарскі стан на Замкавай гары»: мэбля, посуд, вопратка, побытавыя прадмэты, настольныя гульні.

11.00–15.00 Паказальныя выступы рыцарскіх клюбаў («Бой з рыцарам», забавы з дзецьмі, танцы, фатаграфаваньне).

12.00 III Турнір Караля Міндоўга: Пешы рыцарскі турнір XIV–XV ст.

13.00 III Турнір Караля Міндоўга: рыцарскія бугурты.

14.00 Праграма–выступ каскадзёраў Менскага тэатру трукаў.

## Малы замак. «Рамесная пляцоўка»

**1 ліпеня, субота**

12.00–19.15 Сярэднявечная кухня.

12.00–19.15 Сярэднявечны кірмаш.

**2 ліпеня, нядзеля**

11.00–17.00 Сярэднявечная кухня.

11.00–17.00 Сярэднявечны кірмаш.

**Арганізатары пакідаюць за сабой** права ўнясеньня зьменаў па аб’ектыўных прычынах у праграму Фэсту.

**Разьмяшчэньне і начлег** гасьцей — каля вёскі Сялец, 2 км. ад мяжы г.Наваградка, 300м. ад дарогі Наваградак–Менск. Разьмяшчэньне – платнае. Тэрыторыя будзе пад аховай, будуць нарыхтаваныя дровы і пітная вада.

**Прадстаўленьне пляцовак для гандлю** сувэнірнай і інш. прадукцыяй, аказаньня іншых паслуг — платнае. Даведкі па тэлефонах: (01597) 212–74, 205–02.

**Акрэдытацыя прадстаўнікоў СМІ** — 1 ліпеня да 12.00 у будынку раённага Дому культуры. Тэлефоны: (01597) 214–60, 212–92, 229–32.

**Кантактныя тэлефоны аргкамітэту:** (8–01597)214–24 (намесьнік старшыні Аргкамітэту), (8–01597) 233–09, (8–01597)236–13, (8–029)1517808 (Аддзел культуры Наваградзкага райвыканкаму), (8–01597) 228–18 (прыёмная райвыканкаму).



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Песьні свабоды




**Розныя выканаўцы, VoliaMusic, 2006.**

Гэта фармаваньне попыту.

Дыск можна слухаць без супынку, як тое і рабілі гадзінамі жыхары намётавага мястэчка на Кастрычніцкай. Музычная вясна — 2006 запомніцца менавіта гэтым дыскам — у сьціплай капэрце, з багатым зьместам (23 песьні). На дыску — толькі гіты, і толькі на тэму свабоды. Побач з прызнанымі гітамі ад «Уліса», *ZET*, «Новага неба» — творы маладых праектаў «Жаба ў каляіне», «Рэха», *Easy Project*.

Палітыка, абраная новым лэйблам *VoliaMusic*, для Беларусі абсалютна ўнікальная: гэта фармаваньне попыту шляхам бясплатнай рассылкі. Добрая рэкляма лэйблу ды ўсяму беларускаму року.

Зь іншага боку, складанка агаляе праблему апошніх год — адсутнасьць яскравай песьні, такой, як «Радыё Свабода» на пачатку 90-х, «Гэта мы!» у сярэдзіне 90-х, «Тры чарапахі» на пачатку 2000-х г. Пры ўсёй сваёй кранальнасьці песьні «Чэ Гевара» гурту «Рэха» ці то «Ўжо даволі!» праекту «Жаба ў каляіне» не дацягваюць да ролі гіта сярэдзіны 2000-х. Магчыма, што такая песьня зьявіцца на «Песьнях свабоды — 2», якія ўжо рыхтуюцца да выданьня.

# Танга з ружай



**WZ-orkiestra і Зьміцер Вайцюшкевіч, West Records, 2006.**

Хуліганска-інтэлігентны альбом на вершы Някляева.

Здаецца, і сам сьпявак згубіў лік выдадзеных ім альбомаў на вершы клясыкаў айчыннай літаратуры. Чарга гэтым разам дайшла да Ўладзімера Някляева. Паэзія Някляева гучала выключна ў межах попу — на ягоныя вершы сьпявалі Дарафеева, «Верасы» зь «Сябрамі», Ліка (тады яшчэ Ялінская). *WZ-orkiestra* пераасэнсавалі па-шансоннаму. Выйшаў хуліганска-інтэлігентны альбом, дзе знайшлося месца і п’янкам-гулянкам, і сьветламу суму, і каханьню зь нянавісьцю. Якраз той выпадак, калі з прыемнасьцю слухаеш словы ды атрымліваеш асалоду ад музыкі. Іншая справа, што альбом не зьдзіўляе. Дакладней, не зьдзіўляе сам Вайцюшкевіч, як ён тое рабіў раней — калі ад дзіцячых песенак перайшоў да фольк-балядаў, заняўшыся паралельна дэклямацыяй Маякоўскага пад музыку. «Танга з ружай» шмат у чым паўтарае «Паравіны году» і «Паравоз каханьня».

# Ur’ia



**Kali-chakra, БМА Group, 2006**

Прыемна слухаць надвячоркам.

Вяртаньне ў музычную прастору гурту, які зьнік пасьля скандальнага выключэньня з намінантаў на «Эўрабачаньне-2005». А маўчала група Юр’я Выдронка яшчэ болей — іхні першы і апошні да гэтага часу дыск «Веснячуха» зьявіўся шэсьць год таму.

Сярод масіву прадстаўнікоў «фольк-мадэрну» *Ur’ia* вылучаецца драйвавым гітарным, часам рок-н-рольным гукам у спалучэньні зь вялікай колькасьцю інструмэнтаў, сваёй містычнасьцю і «гарлавым», нібыта п’янаватым, вакалам самога Выдронка. Альбом прыемней слухаць надвячоркам, калі хочацца чагосьці таямнічага, хоць з такімі песьнямі, як бадзёрыя «Ў лузі» і «Folk-n-roll», можна пачынаць свой працоўны дзень.

Для ўсіх аматараў беларускага фольку і індаэўрапейскіх музычных практыкаваньняў Джорджа Гарысана.

# Рок за бабpoў — 2005




**Розныя выканаўцы, West Records, 2006.**

Паколькі фэст праходзіў пад «дахам» бабруйскага бровару, то і тэматыка часткі твораў — адпаведная.

Складанка зь песьнямі ўдзельнікаў леташняга фэсту «Рок за бабpoў». Паколькі фэст праходзіў пад «дахам» бабруйскага бровару, то і тэматыка часткі твораў — адпаведная. Пачынаецца зь негалосна забароненай «Крамбамбулі» з творам «Хочаш піва», а сканчаецца «Сябрамі», якім усё дазволена, зь нятленкай «Піце піва, мужыкі». Суцэльная мяшанка: з рок-н-ролу а-ля «Бітлз» (*Flat*), прыгардаванага року перабудовачных часоў (*Slang*), млявага поп-року («Стокс») і банальнага блюзу («Мадэра гард блюз»). Такую ж складанку маглі выдаць у Самары ці Пензе — у кожным горадзе хапае халодных прафэсіяналаў. А вось надаць музыцы нацыянальны калярыт ды ўкласьці ў аранжыроўку сваю разыначку — задача больш складаная, чым сыграць E-A-H у іх банальнай пасьлядоўнасьці. Таму, без сумневу, з усіх удзельнікаў складанкі можна вылучыць *IQ-48* і *Indiga*. І ня толькі паводле моўнай прыкметы. «Сябры» вунь таксама шпараць па-беларуску, але цяжкая спадчына фэстывалю «Песьню бярэце з сабою» іх не адпускае.

**Сяргей Будкін**



# Hasta la vista, baby!

Калі правадыр кіруе доўга, назіральнікі паддаюцца спакусе надзяліць яго рысамі тэрмінатара. Піша **Аляксандар Класкоўскі.**

...І вось пайшла ўжо гуляць гіпотэза, што ідэя саюзнага рэфэрэндуму інсьпіраваная самім Менскам. Маўляў, за гэтай дымавой заслонай хаваюцца пляны новага паходу на Крэмль. Беларускі тэрмінатар запраграмаваны на мэту і папрэ напралом.

Іншая крайнасьць — вэрсія, адлюстраваная ў назьве артыкулу маскоўскага палітоляга Фёдара Лук’янава, — «Лівійскі шлях для Бацькі». Тэрмінатар, так бы мовіць, перапраграмуецца, як Шварцэнэгер у другой сэрыі, і, сказаўшы Пуціну «Hasta la vista, baby!», перакінецца на Захад.

Абедзьве вэрсіі падаюцца няслушнымі. З аднаго боку, як зазначае наш аналітык Андрэй Фёдараў, у Маскве не такія прасьцякі, каб пускаць сьмяротна небясьпечнага гульца на сваё поле. Расейская эліта робіць шмат памылак, але пэўна ж не дапусьціць такога фатальнага недагляду. Як не дапусьціла яго ў 1999 годзе.

Акрамя таго, з паліталёгіі вядома, што аўтарытарныя рэжымы кепска інтэгруюцца. Бо трэба ж дэлегаваць пэўныя паўнамоцтвы. Прасьцей кажучы — ахвяраваць часткаю ўлады. Для аўтакрата гэта — як нож востры. Ён трымаецца за «ўсё сваё» да апошняга (іншым разам — літаральна).

Так што «саюзная дзяржава» — апрыёры гіблая справа.

Што да параўнаньня з Кадафі, дык яно ня проста кульгае, а цалкам інваліднае. Аўтару «Зялёнае кнігі» дастаткова было адмовіцца ад падтрымкі тэрарызму ды распрацоўкі хімічнае зброі. Афрыканскага дыктатара ніхто й ня марыў перакаваць на лібэрала.

Беларускія ўлады, дзякуй богу, ня маюць дачыненьня да выбухаў авіялайнэраў і не хаваюць у скляпах бочкі з іпрытам. Ад тутэйшага рэжыму дамагаюцца менавіта дэмакратызацыі. Іначай кажучы, правадыра змушаюць пілаваць сук, на якім той сядзіць. І зноў жа — ён будзе адкарасквацца да апошняга.

Ва ўсякім разе, сёньня Менск чакае ў госьці Чавэса ды нагадвае натаўцам пра ядравы парасон (маўляў, не абавязкова разьмяшчаць расейскія ракеты ў паласе першага ўдару — і так дастануць). У выпадку з заходнім вэктарам, на думку таго ж Андрэя Фёдарава, фатальна спрацоўвае яшчэ й мэнтальнасьць галоўнага савецкага беларуса.

Тым часам як палітычны бамонд канструюе вобраз тэрмінатара, здольнага ці то заваяваць Маскву, ці то, «пераінсталяваўшы сыстэму», скарыць Брусэль з Вашынгтонам, былы дырэктар саўгасу «Гарадзец» дзейнічае элемэнтарна. Ён ніколі ня кідаўся на злом галавы і ніколі ня



**22 чэрвеня, 4.00. Берасьце адзначае пачатак вайны. Але што сьвяткуем, хлопцы?**

здраджваў сабе (як казаў герой Шварцэнэгера, «я не магу сябе зьнішчыць»). Усе 12 гадоў былі прысьвечаны адной справе — крок за крокам умацоўваць самаўладзьдзе ў асобна ўзятай краіне. Такая пакорлівая ды безгалосая, яна цалкам задавальняе гаспадара.

Ня варта надзяляць ні рэжым, ні яго кіраўніка нейкімі фантастычнымі рысамі (і тым самым падсьвядома апраўдваць бясплённасьць барацьбы). Грамада мусіць найперш разьвітацца са сваімі ўнутранымі дэманамі, з хімэрамі забабонаў ды страху. Hasta la vista, baby!



# Ідзе вайна гандлёвая



Фэльетон Лёліка Ушкіна.

Гандлёвыя войны Беларусі з суседзямі, у адрозьненьне ад традыцыйных мілітарных канфліктаў, даўно сталі атрыбутам паўсядзённасьці. Чаму ўладамі не праводзяцца манэўры па адпрацоўцы элемэнтаў абароны ўнутранага рынку?

Вось магчымыя сцэнары вучэньняў, якія будуць судзейнічаць росту гатоўнасьці насельніцтва да каляпсаў у вобласьці імпарту-экспарту.

**План вучэньняў «Шчыт страўніка — 2006».**

Тэрыторыя краіны падзяляецца на ўмоўныя часткі: Дзьвінія (мы), Дняпровія (краіна-хаўрусьніца) і Бугія (ня будзем паказваць пальцам). Першы этап вучэньняў: Дняпровія адмаўляецца набываць цукар у Дзьвініі. Банальны мэтад шантажу, каб прымусіць дзьвінцаў здаць нейкія стратэгічныя аб’екты.

Сытуацыя ў Дзьвініі крытычная: каб ня стала цукровая прамысловасьць, удзельнікі манэўраў арганізавана дадаюць у свой рацыён больш салодкага: з ранку да вечара хрумсьцяць піражнымі, тартамі, цукеркамі, цукровай ватай, зэфірамі і халвой.

Цяжкасьці — масавае атлусьценьне — толькі загартоўваюць удзельнікаў манэўраў. «Цяфка ў вуфэньні — лёфка ў баі», шамкаюць патрыёты — шмат у каго ад экстэнсіўнага ўжываньня салодкага выпалі зубы. Чоткасьць і сынхроннасьць працы страўніка дзьвінцаў не пакідаюць праціўніку аніякіх шанцаў на посьпех.

Кіраўніцтва Дзьвініі тым часам «разрульвае» праблему з экспартам цукру, аднаўляючы статус-кво. Праз год той самы сцэнар манэўраў можна паўтарыць з той папраўкай, што гэтым разам Бугія адмовілася купляць у нас калійную соль.

* * *

**Плян вучэньняў «Шчыт нагі — 2006»**

Тэрыторыя краіны зноў падзяляецца на ўмоўныя часткі: Дзьвінія, Дняпровія і Бугія. Бугія праз Дняпровію бамбіць рынкі Дзьвініі таннымі паўкедамі, руйнуючы айчынную абутковую індустрыю. Па камандзе штабу групоўкі Дзьвініі ўводзяцца акцызы на паўкеды, адначасова па ўсім пэрымэтры палігону выстаўляюцца блёкпасты.

На тэрыторыі палігону ладзяцца аблавы на дывэрсантаў: чаўнакоў-пастаўшчыкоў паўкедаў і іх кліентуру. Зь верталётаў апэрацыю страхуюць снайпэры. Каб канчаткова зьнішчыць абутковы андэрграўнд, усім дзьвінцам дадзена каманда — насіць кірзавыя боты. Паступова кантрафактныя тавары «выкурваюцца». Наведаўшы штаб вучэньняў, галоўнакамандуючы канстатуе абарону нашага абутковага сувэрэнітэту і незалежнасьці й раздае найлепшым удзельнікам манэўраў памятныя падарункі — мазь ад грыбка на нагах.

* * *

**Плян вучэньняў «Шчыт мазгоў — 2006»**

Тэрыторыя краіны традыцыйна падзяляецца на ўмоўныя часткі: Дзьвінія, Дняпровія і Бугія. Краіна Бугія хоча пазбавіць Дзьвінію, гандлёвых прэфэрэнцый праз тое, што апошняя парушае нейкія правы грамадзян. Эканамічная катастрофа здаецца непазьбежнай.

Трактуючы гэты крок як замах на Саюз Дзьвініі і Дняпровіі штаб дзьвінцаў просіць Дняпровію нанесьці па Бугіі ядравы ўдар. Дняпровія выконвае місію хаўрусьніка. Аднак з-за блізкасьці Бугіі жыцьцё і на паверхні Дзьвініі робіцца немагчымым. Удзельнікам манэўраў пастаўлена заданьне: выканаць праграму апошняй пяцігодкі народнага сходу Дзьвініі пад зямлёй. Дзьвінцы зарываюцца ў норы, дзе ствараюць стабільную сацыяльна-эканамічную і фінансавую мадэль.

Праз тыдзень галоўнакамандуючы вызнае, што тэмпы разьвіцьця падземнай Дзьвініі тыя ж, што былі і да атамнай вайны.

Больш за тое, поўнасьцю зьнікла такое нэгатыўнае явішча, як п’яныя кіроўцы на дарогах. Манэўры красамоўна давялі, што дзьвінцы могуць захоўваць пазытыўную дынаміку росту гаспадаркі нават у такіх неспрыяльных умовах.

Як толькі ядравая зіма скончыцца, яны спакойна выйдуць на сьвятло і будуць працягваць будаваць стабільнасьць. Аднак гэтым разам ужо без усякіх Бугій.

## Аўтара!

Пасьля адкрыцьця мілітарнага «скансэна» «Лінія Сталіна» беларусы атрымалі ад уладаў яшчэ адзін «падарунак». Усталяваньне ўжо трэцяга ў краіне помніка Дзяржынскаму — яшчэ адзін адметны знак на шляху адкату да сталінізму.

Зразумела, хто асабіста даў «дабро» на ўсталяваньне такога манумэнта. Вядома, што адкрывалі яго галоўны чэкіст і галоўны памежнік рэспублікі. Вядома таксама, што «шэдэўр» ёсьць дакладнай копіяй таго, што 16 гадоў таму быў дэмантаваны на маскоўскай Лубянскай плошчы.

Але чамусьці сарамліва замоўчваецца, хто са скульптараў адхапіў і выканаў плягіятарскую замову.

І ці не надумаюцца лукашысты, традыцыйна ўжо працуючы на апераджэньне малодшага братарасейца, паставіць перад Палацам Рэспублікі куды больш маштабны стод — кшталту таго, што стаяў на сталічнай плошчы да 1953 году?!

**Уладзімер Булаўскі, Жодзіна**

## Жартоўныя і праўдзівыя згадкі пра клясыка

вачыма нашае сям'і. Да выхаду першых тамоў Збору твораў Максіма Танка.

**Мы вакол Танка**

Калі выйшлі першыя два тамы Збору твораў Максіма Танка, нашая сям'я ўзгадала пра небы-якое дачыненьне да славутае асобы.

Кастусь Сьцебурака (1911 г. нараджэньня; у 30-я гады вучыўся ў Вільні на мастака) узгадаў:

— Пры Польшчы некалькі разоў Танк гасьцяваў у нашай хаце на хутары Субачы ля Крывічоў. Дарэчы, кожны карэнны жыхар Нарачанскага краю — сучасьнік Максіма Танка — запэўніць вас, што прымаў пісьменьніка ў сваёй хаце.

Анатоль Сьцебурака (1926 г. нараджэньня; краёвы сэпаратыст) адгукнуўся шырокавядомай у пэўным асяродку прыказкай «Максім Танк і Прытыцкі прапілі раён Крывіцкі». Чым патлумачыў дачыненьне да колішніх адміністрацыйна-тэрытарыяльных пераўтварэньняў на Заходняй Беларусі.

Мікола Сьцебурака (1957 г. нараджэньня; лекар зь Вялейкі) распавёў гісторыю, якую чуў ад сьв.пам. дацэнта Лявона Аскальдовіча, які працаваў у абласной клінічнай больніцы ў Бараўлянах:

— Калі Максім Танк тэлефанаваў лекарам, каб вырашаць пытаньні па здароўі ці ўладкаваць кагосьці ў шпіталь, ён ніколі не называўся народным паэтам Беларусі, але казаў: «Турбуе дэпутат Вярхоўнага Савету СССР Максім Танк...»

Аднойчы паважаны дэпутат скардзіўся доктару на самачуцьце:

— Высокі ціск маю!

На што дацэнт адрэагаваў:

— Ну, шаноўны, на то ж вы і Танк!

Анатоль Сьцебурака (1983 г. нараджэньня; супрацоўнік Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі) адзначыў, што пэўны час праціраў порткі за тымі ж партамі ў будынку старой гімназіі ў Вялейцы, за якімі сядзеў некалькі год і будучы клясык.

Усевалад Сьцебурака (1981 г. нараджэньня; выкладнік БДТУ) проста працягнуў традыцыю дачыненьня да вялікага, адвучыўшыся пяць год у пэдагагічным унівэрсытэце імя Максіма Танка...

**УС**

## Самаарганізацыя з асьцярожнасьцю

Карціць пракамэнтаваць ліст Я.Глума зь Менску («НН», №21). Што датычыць самаарганізацыі, дык цалкам згодная: мы павінны даваць інфармацыю людзям вакол нас. Але ўсё ня так проста. Сп.Глум, мабыць, трошкі недааацэньвае магчымасьці нашага сёньняшняга «заканадаўства». Калі мяне затрымалі зь пяцьцю газэтамі «16», на якіх былі пазначаныя выходныя зьвесткі, на мяне, нягледзячы на права на 300 асобнікаў, склалі пратакол паводле арт.172. Калі цябе вядуць у пастарунак для высьвятленьня асобы, хоць пашпарт ты паказаў; калі цябе затрымліваюць за значкі, а пратакол зноўку паводле арт.172 з-за 1 газэты «НН», што ты ўчора атрымаў па пошце; калі ў цябе канфіскоўваюць значкі. Хоць паводле «закону» яны — «элемэнт адзеньня».

Аднак трымаймася й перамагайма!

**Таварыш, yandex.ru**

## Ліст зь Бягомлю

Добры дзень, паважаная «Наша Ніва».

Вітаю вас усіх імем Госпада Ісуса Хрыста!

Хачу перадаць пасланьне людзям, лёс якіх мяне як верніка асабліва непакоіць.

**Мікалаю Аўтуховічу:**

Я разумею, што гэты твой учынак — апошняя мера пратэсту супраць беззаконьня, але памятай, што Бог за цябе і за такіх, як ты. Ён цябе падтрымае, калі на тое Яго воля, ты застанесься жывым і здаровым. Ты, братка — аўганец, ужо памілаваны Богам, імя тваё ўжо запісана на нябёсах, галоўнае — ня траць веры, такія людзі, як ты, патрэбны нашай Беларусі.

**Паўлу Севярынцу:**

Ты знаходзісься ў такіх абставінах, што толькі Бог адзін дапаможа. Ты жывеш з Богам, Ён цябе абараняе і абароніць ад усялякай пошасьці.

Данііла кінулі ў яму з галоднымі львамі, а Гасподзь зачыніў пашчы іхнія, яны хадзілі каля яго і не зачапілі (Данііл гл. 6).

Ад мяне і ад сям'і Майсяёнкаў табе прывітаньне, здароўя, веры, вытрымкі табе. Молімся за вас, за нашу Беларусь, за ўрад, парлямэнт, за кожную душу, каб Імя Божае засьвяцілася на нашай зямлі.

**Моладзі, якая трымала галадоўку:**

Вера ў вас большая, чым у тых, хто б'е сябе ў грудзі і крычыць, што ён за Айчыну. Хрыстос сказаў: «Калі ня будзеце, як дзеці, ня ўвойдзеце ў Царства Нябеснае» (Мацьв. 18:1—5). Хай Бог беражэ ваша здароўе фізычнае, веры вам, шчасьця.

**Артуру Фінькевічу:**

Апостал Хрыста Ян Багаслоў быў сасланы на востраў Татмас, і яму ад Бога было адкрыцьцё, дзе паказана была будучыня для праведнікаў. Ты, Артур, ня бойся, усё гэта часова, а наперадзе ў нас — вечнае жыцьцё і новая Беларусь, цывілізаваная, мірная краіна з Богам у сэрцы. Вер, ды па веры чалавека даецца яму.

**Усім людзям Добрай Волі, Веры і Свабоды:**

Тры габрэйскія юнакі былі загнаныя ў распаленую печ і выйшлі адтуль некранутыя. Бог — наш шчыт і заступнік (Данііл гл.3; Псальмы 26; 27; 22; 30; 32:10—18; 34; 63; 79; 90; 93; 105; 108; 118; 132; 145; 150; Эфэсянам гл. 6:10—13).

За намі — Бог, і гэтым усё сказана.

Ласка Божая хай будзе з вамі і з нашай Бацькаўшчынай. Жыве Беларусь!

**Брат у Хрысьце, беларус Сяргей, ваш чытач зь Бягомлю**

## Як трапіць у Свабодны тэатар

Ці не падскажаце, як трапіць на спэктаклі «Свабоднага тэатру»?

**Алесь, Менск**

**Пра спэктаклі «Свабоднага тэатру» можна даведацца на сайце dramaturg.org.**

Кантакты з кіраўнікамі тэатру:

Натальля Каляда, дырэктар праекту — nksbel@yahoo.com, тэл.: (375) 29-613-34-17;

Мікалай Халезін, каардынатар праекту — free_theatre@yahoo.com.

Каб трапіць на спэктаклі, зьвяртайцеся да арганізатараў.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас:**
**а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@promedia.by.**
**Факс: (017) 284-73-29.**

# Нямецкая стыпэндыя студэнтам, якім пагражае выключэньне

Фундацыя Гэнрыха Бёля (Партыі Зялёных) прапануе пяці студэнтам зь Беларусі, якім пагражае выключэньне з навучальнай установы з палітычных прычынаў, зь зімовага сэмэстру 2006/2007 (пачынаецца ў кастрычніку 2006) аднагадовую стыпэндыю на навучаньне ў Нямеччыне. Для гэтага дзейнічаюць звычайныя для Фундацыі тэрміны падачы дакумэнтаў і ўмовы ўдзелу (глядзі ніжэй). У пошуку навучальных месцаў і падачы дакумэнтаў падтрымку могуць аказаць кантактныя асобы з партнэрскай арганізацыі (глядзі www.pro-belarus.de).

У дадатак да навучаньня прапануецца індывідуальная праграма, якая ўлічвае індывідуальныя пажаданьні і складаецца з кансультацыі ўсіх партнэрскіх арганізацый.

Стыпэндыя пакрывае выдаткі на жыцьцё і складае 615 эўра ў месяц.

Акрамя гэтага, выплачваецца аднаразовая стартавая дапамога і даплаты за мэдычнае страхаваньне. Кошт даезду і зборы за навучаньне ня могуць быць выплачаныя.

**A. Тэрмін падачы заяўкі.**
**B. Мэтавая група і крытэры адбору.**
**C. Дакументы, якія неабходна падаць.**
**D. Важныя заўвагі.**
**E. Кантакты, інфармацыя.**

**A. Тэрмін падачы заяўкі:**
— 30 чэрвеня 2006.

**B. Мэтавая група і крытэры адбору:**
— у мэтавую групу ўваходзяць студэнты, якім пагражае прымусовае адлічэньне, якія хочуць зь зімовага сэмэстру 2006/2007 працягнуць у Нямеччыне навучаньне на атрыманьне дыплёму (г.зн. пяты ці сёмы сэмэстар) і на момант падачы заяўкі навучаюцца ў вышэйшай навучальнай установе ў Беларусі.

Крытэры адбору: выдатная акадэмічная пасьпяховасьць, грамадзянская актыўнасьць і дастатковыя веды нямецкай мовы, каб навучацца ў Нямеччыне.

**C. Дакумэнты, якія неабходна падаць:**

I. Тытульны аркуш (1 старонка) з наступнымі зьвесткамі:
1. Прозьвішча, імя;
2. Сталы адрас, тэлефон, нумар факсу, электронная пошта;
3. Дата нараджэньня;
4. Пол;
5. Грамадзянства;
6. Сямейны стан, колькасьць братоў/сясьцёр, занятак бацькоў;
7. Атэстат аб сканчэньні школы (калі атрыманы, адзнакі);
8. Унівэрсытэт, факультэт, кірунак, катэдра ў Беларусі;
9. Пачатак навучаньня, цяперашні прадмет (прадметы), які дыплём маеце атрымаць у Беларусі;
10. ВНУ, у якой хочаце працягнуць навучаньне ў Нямеччыне; спэцыяльнасьць, па якой хочаце працягнуць навучаньне ў Нямеччыне;

II. Матывацыйны ліст (1—2 старонкі):
з абгрунтаваньнем вашай заяўкі ў Фундацыю;
з апісаньнем грамадзка-палітычнай і грамадзянскай дзейнасьці і стану навучаньня, улучна з асабістай сытуацыяй студэнта/студэнткі ў Беларусі і магчымай пагрозай выключэньня;
з абгрунтаваньнем вашага выбару навучацца ў Нямеччыне, адлюстраваньнем ранейшых кантактаў зь Нямеччынай.

III. Аўтабіяграфія ў форме табліцы (1 старонка):
са зьвесткамі пра адукацыю, працоўны досьвед, практыку, веданьне моваў, іншую дзейнасьць.

IV. Апісаньне навучаньня да сёньняшняга моманту (1 старонка):
абгрунтаваньне выбару вывучанага прадмету;
адлюстраваньне асабістых акцэнтаў у навучаньні і будучых плянаў што да навучаньня і прафэсіі;
пералік дасягненьняў у акадэмічнай дзейнасьці.

V. Рэкамэндацыі аб удзеле ў грамадзка-палітычнай дзейнасьці (1—2 старонкі):
пацьверджаньне і падрабязнае апісаньне грамадзка-палітычнай і грамадзянскай дзейнасьці іншымі асобамі, якія добра ведаюць заяўніка і могуць даць заключэньне пра яго дзейнасьць.

Асоба, якая дае рэкамэндацыю, можа, але ня мусіць быць сябрам нейкай арганізацыі. Сьведчаньні пра практыку альбо рэкамэндацыі ад чальцоў сям'і спаборніка не прымаюцца.

Рэкамэндацыя мае ўтрымліваць:
апісаньне грамадзянскай актыўнасьці, асабліва ў якіх галінах заяўнік дагэтуль быў адказны і што дакладна рабіў;
асабістая ацэнка асаблівых патрэбаў заяўніка.

VI. Актуальны допуск да паступленьня ў ВНУ (калі ёсьць).

VII. Копія атэстату аб заканчэньні школы. Калі ёсьць, копія дакумэнту аб здадзеных іспытах у Беларусі (усё перакладзена і, калі магчыма, заверана натарыяльна).

VIII. Рэкамэндацыя выкладчыка ВНУ (калі магчыма).
Зьмест: ацэнка акадэмічнай пасьпяховасьці і прагноз, пэрспэктывы.

IX. Сьведчаньне аб ведах нямецкай мовы.

**D. Важныя заўвагі для спаборнікаў.**
— Пра афармленьне дакумэнтаў: заяўка мусіць быць напісаная панямецку. Калі ласка, ужывайце шрыфт ня меншы за 11 пунктаў.

Мы чакаем Вашай заяўкі электроннай поштай у прымацаваным выглядзе з усімі неабходнымі дакумэнтамі ў фарматах pdf альбо doc.

На жаль, няпоўныя зборы дакумэнтаў ня могуць быць апрацаваныя.

— Пра часавыя рамкі прыняцьця рашэньня: дацэнт Фундацыі правядзе з Вамі ў ліпені тэлефонную размову пра зьмест і інтарэсы Вашага навучаньня і ўхваліць Ваш выбар, калі Вы пройдзеце першы адбор. Пра гэта мы паведамім Вас у другім тыдні ліпеня.

Нарэшце, камісія канчаткова прымае рашэньне па Вашай заяўцы. У канцы ліпеня 2006 году Вы атрымаеце ад нас паведамленьне пра вынікі.

Калі Вашу кандыдатуру адхілілі: калі ласка, просім Вашага разуменьня, што пры вялікай колькасьці заявак мы, на жаль, ня зможам індывідуальна паведаміць Вас пра прычыны адхіленьня Вашай кандыдатуры.

Да абароны асабістых зьвестак: усе зьвесткі пра Вас будуць захоўвацца ў праграме адміністраваньня адрэсаў і будуць зьнішчаныя праз 6 месяцаў. Мы гарантуем Вам ананімнасьць Вашай заяўкі.

**E. Кантакты/інфармацыя**
Калі ласка, скіроўвайце свае заяўкі па электроннай пошце (дадаткі ў фарматах pdf альбо doc) на адрас:
Studienwerk der Heinrich-Boell-Stiftung
Betreff: «Bewerbung Pro Belarus»
e-mail: karger@boell.de

Дадатковая інфармацыя:
Borbel Karger, Tel. +49-30-28534-400, karger@boell.de
Панядзелак, аўторак, чацьвер, пятніца зь 10:00 да 13:00 гадзінаў.

Інфармацыю пра акцыю Pro Belarus і дапаможную дзейнасьць (напрыклад, дапамогу ў абраньні месца навучаньня) глядзеце на сайце http://www.pro-belarus.de/

# Адам Глёбус: Трэба, каб тыя, хто прайграў, маглі працягваць гульню

І мы яшчэ навучымся выкарыстоўваць ваду ў палітычных мэтах! У вадзе будзе наша сіла! — кажа пісьменьнік.



АЛЕНА АДАМЧЫК

Тэда Лі: Батанічны сад мы сёньня наведваем з чалавекам, які нагадаў беларусам пра беларускі сэкс, прымусіў дамавікоў кахацца і расказаў усёй матчынай зямлі пра тое, чым жыве яго сям'я, сябры і знаёмыя. Амаль што скандальны пісьменьнік Адам Глёбус баіць пра шэрых цмокаў, сварыцца з Андрэем Хадановічам, марыць пра васьмідзесяцігадовага прэзыдэнта і кляне на чым сьвет стаіць няўмек-апазыцыянэраў, якія хочуць быць прэзыдэнтамі, але пры гэтым не дарасьлі да палітыкаў.

* * *

**Тэда Лі: Каго ў Беларусі Вы лічыце палітыкам?**

**Адам Глёбус:** У Беларусі, на мой погляд, ёсьць толькі два рэальныя палітыкі, якіх я лічу за палітыкаў, — гэта Шушкевіч і Лукашэнка. Усе астатнія — або нерэалізаваныя палітыкі, або яшчэ не палітыкі, або ўжо не палітыкі.

**ТЛ: Назавіце тады нейкія крытэры вызначэньня палітыкаў.**

**АГ:** Палітык — гэта чалавек, які не сыходзіць з радкоў палітычных навінаў, той, з каго пачынаюцца навіны. Калі палітычныя навіны пачынаюцца з Лукашэнкі, то гэта палітык. У свой час яны пачыналіся з Шушкевіча.

**ТЛ: Але ж гэты палітык можа быць выключна пешкай, бо за яго вырашае нехта іншы. Хіба палітык — гэта той, чый твар зьяўляецца на першых старонках газэт і на экране?**

**АГ:** Гэта памылковае меркаваньне, што нехта там ёсьць, таемныя арганізацыі і структуры, якія пра ўсіх думаюць, усё ведаюць і за ўсіх вырашаюць. Калі мы раней сумняваліся, то, як пажылі крыху больш за дзесяць гадоў у незалежнай рэспубліцы, зразумелі, што у незалежнай краіне першая асоба вырашае шмат, і ніхто за яе не вырашае нічога.

**ТЛ: Вы называеце Беларусь незалежнай. Хіба так ёсьць?**

**АГ:** Мы можам разважаць пра ступень незалежнасьці. Усе краіны ў пэўнай ступені ад кагосьці ці ад чагосьці залежаць. Мы залежым. Ну, што ў нас ёсьць каштоўнага? Вада ў нас ёсьць як найвялікшая палітычная каштоўнасьць. Ад нас пачынаюцца рэкі, і як мы скажам, так і будуць жыць Рыга, Вільня і Кіеў. Мы проста яшчэ не навучыліся выкарыстоўваць сваю ваду ў палітычных мэтах. Навучымся. У нас так склалася, што адказнасьць за палітыку пачалі ўскладаць на людзей творчых. Паэт больш чым паэт, мастак больш чым мастак... Палітык больш чым палітык...

**ТЛ: Як Вы ставіцеся да**

**беларускай апазыцыі?**

**АГ:** Цалкам раўнадушна. Яна мяне мала хвалюе.

**ТЛ: Якім чынам тады мы зможам дачакацца нейкіх зьменаў, калі не хвалюе апазыцыя?**

**АГ:** Я, мусіць, і не чакаю тых зьменаў, якіх чакаюць людзі, заангажаваныя ў палітыку. Таму што я ведаю адну такую казачку. Расказаць казачку?

У даўнія-даўнія часы, калі нашыя дзяды былі зусім дзецьмі, была такая шэраяшэрая краіна, якой кіраваў страшны Шэры Цмок. Ён прыгнятаў людзей, і яны пакутавалі ад гэтай прыгнечанасьці і чакалі пераменаў. І нарэшце, у нетрах народу нарадзіўся Волат. І ён пайшоў і ўступіў у двубой з гэтым Цмокам. Той яго парваў на шматкі. На вежу выйшаў вястун, які пракрычэў, што Волат загінуў. І давай услаўляць шэрага Цмока. Пасьля гэтай бойкі Цмок стаў яшчэ больш жорсткім, і народ стаў пакутаваць яшчэ больш. Ня ведаеце такой казачкі? А яе трэба ведаць усім, хто займаецца палітыкай. Дык вось, народ нарадзіў іншага Волата. Волат зноў пайшоў, а Цмок яго зноў парваў. А вястун выйшаў зноў у сродкі масавай інфармацыі і пачаў крычаць: «Давайце ўслаўляць Цмока, бо Волат загінуў». І нарэшце зьявіўся вялікі Волат, які пайшоў і забіў Цмока. І ў народу пачалося сьвята. І на руках яны панесьлі свайго новага Волата-пераможцу ў галоўны замак краіны. Як толькі ён туды зайшоў, дакрануўся да золата, срэбра, дыямэнтаў — ператварыўся ў шэрага Цмока. Народ спалохаўся, разьбегся, пахаваўся і толькі вястун (сродкі масавай інфармацыі і журналісты) выйшаў у жывы этэр і сказаў, што Волат загінуў — давайце ўслаўляць Цмока. Вось такая казачка ёсьць старажытнакітайская.

**ТЛ: Якіх зьменаў пэрсанальна Вы чакаеце?**

**АГ:** Па-першае, у мяне ёсьць рэальныя палітычныя погляды, у адрозьненьне ад шмат якіх палітыкаў, і яны не такія каньюнктурныя, як у рэальнага палітыка, таму што ёсьць ідэальная палітыка. Ну, напрыклад, я — анарха-індывідуаліст, і мае погляды зьвязаныя з пэўнымі каштоўнасьцямі: з каштоўнасьцямі майго эга, маёй сям'і, маіх знаёмых, маіх калегаў і маёй краіны. І чым далей ад майго эга праблема, тым яна мяне менш хвалюе. Зьмены, напрыклад, у жыцьці маёй сям'і, у маім асабістым жыцьці мяне хвалююць больш, чым у маёй краіне. А зьмены ў чужых краінах мяне хвалююць менш, чым зьмены ў маёй краіне. А нашым палітыкам трэба падабацца максымальнай большасьці людзей, таму яны сёньня гавораць адно, заўтра другое. Таму яны мяне мала цікавяць.

> У нас няма другіх, трэціх, васьмідзясятых асобаў у палітычным жыцьці. У нас усе адразу першыя.

**ТЛ: Вы сказалі «нашыя палітыкі». Ці мелі Вы на ўвазе Шушкевіча і Лукашэнку?**

**АГ:** Вядома. Астатнія волаты — яны толькі нараджаюцца, але я ведаю, чым гэта скончыцца, калі верыць маёй казцы і старажытнаму Кітаю.

**ТЛ: Ці магла ў сакавіку адбыцца рэвалюцыя? Калі магла, то чаму не адбылася?**

**АГ:** Калі не адбылася, то не магла. Прыйдзе час, і яна адбудзецца.

**ТЛ: Ці ня лічыце Вы, што ў гэтым віна палітыкаў? У іх не было пэўных плянаў, яны сапраўды ня ведалі, што рабіць з тымі людзьмі, якія сабраліся 19-га…**

**АГ:** Палітыка, на мой погляд, вельмі цікавая зьява, калі ёй займацца творча і знаходзіць там свае палітычныя погляды: анархізм, ці сацыялізм, ці канфармізм — і разгортваць погляды ў гэтых кірунках. Хутчэй за ўсё, на сёньняшні дзень ёсьць яшчэ эканамічны фактар. Калі лічыць, што палітыка — гэта канцэнтраваная эканоміка, то ў нас ёсьць, як бы тое ні было нам сьмешна, эканамічная стабільнасьць. А калі ёсьць эканамічная стабільнасьць, то нашто мяняць палітыку?

**ТЛ: Стабільная беднасьць — ці гэта тое, для чаго ня варта мяняць палітыку?**

**АГ:** Зноў жа — з кім будзем мерацца? З Афрыкай? Калі паглядзім уважліва, мы знаходзімся у такой шэрай сярэдзіне эканамічнай. Вядома, мы не жывём так, як ангельцы, зразумела. Але і з Зымбамбвэ лепш не параўноўваць. Ці як жыве Індыя? Нехта ў Індыі жыве выдатна, але асноўны мільярд жыве жахліва. І мы жывём, напрыклад, лепш чым у Расеі. Гэта адназначна.

**ТЛ: Навошта мерацца на горшае, калі можна цягнуцца прынамсі да эўрапейскіх паказчыкаў?**

**АГ:** Правільнае пытаньне. Вось у нас людзі, якія ідуць у палітыку, адразу хочуць станавіцца прэзыдэнтамі, а людзі, якія цягнуцца да нейкіх каштоўнасьцяў, спадзяюцца, што калі мы зробім нейкі якасны скачок, то адразу будзем жыць, як у Ангельшчыне. Ды ня будзем мы жыць, як у Ангельшчыне, яшчэ доўга. Гэта расчараваньне, якое зараз перажываюць краіны пасьля рэвалюцый і зьмены палітычнай арыентацыі. Літва спадзявалася, што заўтра яна будзе Галяндыяй, а яна і сёньня Літва.

**ТЛ: Апрача таго, што ўся беларуская апазыцыя хоча быць прэзыдэнтам, усе як адзін, якія яшчэ заганы яна мае?**

**АГ:** Мне здаецца, што ў нас асноўная маса апазыцыйнай палітыкі збудавана не на грунце беларускай эканомікі, беларускай рэальнасьці. Яна збудавана на каштоўнасьцях іншых краінаў. Разглядаецца не рэальнае жыцьцё Беларусі зь яе рэальнымі структурамі, а ўяўнае жыцьцё чужых краінаў, што мы будзем жыць так, як яны. Мы так жыць ніколі ня будзем. Мы зробім 25 рэвалюцыяў, але мы ня станем немцамі. Мы можам зрабіць яшчэ 50 рэвалюцыяў, але клімат ня зьменіцца. У партыяў, якія існуюць на сеньняшні дзень, няма рэальнага грунту, эканамічнага грунту сярод тых, хто тут жыве. Вельмі малы адсотак сваіх фінансаў, і сваіх сілаў, і надзей на свае таленты — гэта раз. Потым няма крэатыўнасьці. Такое слова вульгарнае, але разам з тым зразумелае. Няма рэклямных хадоў. Тое, што мяне зьдзівіла ў тым жа Мілінкевічу: я бачыў яго ў рэальнасьці, і ў рэальнасьці ён выглядае лепш, чым у СМІ. Ня важна, па БТ ці па Euronews. Гэта што тычыць Мілінкевіча як чалавека, які заняў другое месца на выбарах. Але каманда журналістаў і іміджмэйкераў, якая працавала пры ім, мне здаецца, зрабіла сваю працу вельмі кепска. І ў нас наагул, я буду паўтарацца, няма другіх, трэціх, васьмідзясятых асобаў у палітычным жыцьці. У нас усе адразу першыя. У нас няма герархіі. Вось у дзяржаве герархія ёсьць, вось гэта вэртыкаль, а апазыцыя ніяк ня можа адбудаваць сваю герархію. Ясна ж, што Казулін бачыў, што ён ня будзе другім, што будзе трэцім. Мог бы і зьняць сваю кандыдатуру. А тое, што з

Працяг на старонцы 30.

## Адам Глёбус:

# Трэба, каб тыя, хто прайграў, маглі працягваць гульню

**Працяг са старонкі 29.**

Плошчай адбылося, то ў нейкіх мэтафарычных формах я б выказаўся, а ў рэальнасьці — гэта быў анархічны творчы мастацкі жэст, а не палітычны. А палітыкі прыйшлі на гэту Плошчу, як палітыкі ходзяць на рок-канцэрты, на літаратурныя вечарыны. Ну, калі ласка, мы ж ня супраць таго, што да нас прыходзяць палітыкі. Прыходзьце.

**ТЛ: Што датычыць крэатыўнасьці, чаму яе нестае? Ад несвабоды хіба ці ад чаго?**

**АГ:** Калі ў мастака ёсьць выбар, працаваць у Адміністрацыі прэзыдэнта Буша ці на Галівуд — хочацца ў Галівуд. Так і тут. Калі ёсьць выбар, то мастакі проста працуюць ў іншых сфэрах — дзе больш плацяць, менш патрабуюць. І таму ясна, што гэта праблема любога тэлебачаньня, чаму народ глядзіць сэрыялы і кліпы, а ня хоча глядзець палітычныя навіны. Палітыка — яна ж такая ўся ў мундзірчыку, зашпіленая на ўсе гузікі, а мастакі — гэта так званыя крэатыўныя асобы, нават капрызныя, фанабэрыстыя, і, каб іх купіць, ці прыручыць, ці спакусіць, палітыкам трэба таксама прыкласьці вялікія намаганьні.

**ТЛ: Ці дастаткова харызматычны Аляксандар Мілінкевіч? Ці ён цягне на ролю прэзыдэнта?**

**АГ:** А я не лічу, што нам патрэбна харызматычныя асоба. Харызматычная асоба патрэбная ў мастацтве. Можа, нам патрэбныя харызматыкі ў эканоміцы, каб рабіць рэформы. У палітыцы, я лічу, чым больш чалавек спакойны, чым больш ураўнаважаны, тым лепш. Таму што чалавек, які кіруе дзяржавай, павінен быць, на мой погляд, па-першае, ва ўзросьце (каб яго менш хваляваў побыт, сэкс, тое, што ў хрысьціянстве называюць сьмяротнымі грахамі. Старога чалавека гэта хвалюе менш), таму я лічу, што Мілінкевіч падыходзіць.

> Кіраваць дзяржавай павінен стары чалавек, каб яго менш хвалявалі сьмяротныя грахі.

**ТЛ: Андрэй Хадановіч выказаўся, што галоўная загана беларускіх палітыкаў, такіх, як Вячорка, Мілінкевіч і Янукевіч, у тым, что яны занадта вялікія інтэлектуалы і вялікія інтэлігенты, у іх менавіта праз гэта бракуе нейкай рашучасьці і нахабнасьці. Ці згодныя Вы з гэтым?**

**АГ:** Ну, калі Андрэю бракуе жлобства ў нашай палітыцы, то мяне гэта проста дзівіць. Мне здаецца, што на сёньняшні дзень хапае ў нас і жлобства, і хамства, і чаго заўгодна ў палітычным жыцьці. І неадэкватнасьці. Я лічу, што палітыкі мусяць быць спакойныя і нават шэрыя. І тое, што яны інтэлектуалы, — якраз добра. Я не хачу, каб намі кіраваў электрык, як у Польшчы, ці хто ён там, сантэхнік... Я не хачу, каб нехта там матам крыў. А што, мы мусім браць адразу з ПТВ?

**ТЛ: А як наконт таго, што змагацца з кімсьці трэба ягонымі ж сродкамі?**

**АГ:** Не. Таму што на месца хама можна пасадзіць яшчэ большага хама. А тады шукаць яшчэ большага хама. Гэта будзе рэгрэс. Я лічу, што нашыя палітыкі павінны быць наадварот, дактарамі навук. Шкада, што ў нас немагчыма, каб чалавек мог у семдзесят пяць гадоў быць прэзыдэнтам. Ці ў восемдзесят. Мне падабалася кандытура Быкава, напрыклад.

**ТЛ: Чаму беларуская апазыцыя ня ўмее кансалідавацца, гуртавацца нейк, яшчэ сварацца і разыходзяцца па нейкіх групках, нават у самыя адказныя моманты?**

**АГ:** Ну я ж кажу, што яны не вучыліся быць трэцімі, пятымі, што не навучыліся быць дваццаць пятымі. Не абавязкова ж усім быць прэм'ер-міністрамі. А ў нас уся апазыцыя — чамусьці адразу прэм'ер-міністры.

**ТЛ: Ну дык што, у нас краіна негалосных лідэраў?**

**АГ:** Ну, так выглядае. Падобна на тое, што ўсё пакуль што яшчэ. Маладая краіна — не навучыліся. Навучымся.

**ТЛ: Ці дачакаемся гэтага мы і нашыя дзеці?**

**АГ:** Наконт дзяцей магу сказаць, што я зраблю ўсё, каб Вовачка-ўнук дачакаўся. Не, нейкіх зьменаў мы ўсё адно дачакаемся — гэта ж аб'ектыўны працэс. Галоўнае, мы павінны разглядаць ня толькі лепшы варыянт, як разглядаюць нашыя апазыцыянэры, што вось мы зробім рэвалюцыю, і выйдзе заўсёды лепш. А чаму мы не разглядаем, што ў нас можа выйсьці горш? У нас таксама гэта не абмяркоўваецца. У нас усе абмяркоўваюць толькі лепшы варыянт. Вось мы так зробім — і будзе лепш. Гісторыя паказвае, што можна зрабіць — і будзе горш. І неаднаразова рэвалюцыя рабіла яшчэ горш. Рэвалюцыя заўсёды робіць для адных лепш, для другіх — горш. Заўсёды ж, калі пачынаецца гэтая рэвалюцыйная гульня, нехта выйграе, а нехта ж прайграе. Мяне заўсёды зьдзіўляе наша палітычная апазыцыя, бо яна прызначае тых, хто прайграе. Яшчэ гульня не пачалася, а мы ўжо прызначылі. Але ў нас і дзяржава, праўда, прызначае тых, хто прайграе. І проста трэба разглядаць два варыянты, таму што, калі мы будзем разглядаць варыянт, што тыя, хто прайграў, таксама будуць мець магчымасьць працягваць гульню, тады ў нас трошкі зьменіцца стаўленьне да самой гульні. А ў нас так выходзіць, што прайграць — гэта памерці. А гэта няправільна.

**Паводле «Эўрапейскага радыё»**



## УСЕВАЛАД ГАРАЧКА

# Жыў на сьвеце рабочы

***

Жыў на сьвеце рабочы —
Бессаромныя вочы.
Украў на працы ён лом
І схаваў у сябе пад сталом.

Прыйшлі да яго пралетарыі,
І не з пустою шклатараю.
Кажуць:
— Вярні нам лом.
Але ён прагнаў іх калом.

Прыйшоў да яго брыгадзір,
Надзеў парадны мундзір.
Кажа:
— Аддай мне лом,
Што схаваў пад сталом.

Прыйшла да яго міліцыя,
Як да якога патрыцыя.
Але ўсім гегемон
Паказваў на дзьверы:
— Вон!

Так і застаўся рабочы
Безь сяброў,
Без капейкі сірочай.
Затое вялізны лом
Упрыгожвае дом.

***

З ранку да ночы,
З ночы да ранку
Точыць
рабочы
балванку.

Точыць балванку,
Сьцяўшы зубы,
Радзіме
на славу,
Буржуям —
на згубу.

Точыць рабочы
Гэту балванку:
Будуць
ракеты
А можа —
танкі.

З ночы да ранку,
З ранку да ночы
Рабочы
балванку
точыць.

***

Такая бель,
Што не адрозьніць воку,
Дзе неба, дзе зямля.
І далягляд
Магчыма распазнаць
Хіба што
Па стажку
Ці выпадковым дрэве.
Няма што там лавіць,
Нішто ня цешыць вока,
І замiжволі апускаесься назад
Углыб душы —
Але і там
Такая ж бель.
І сузіраеш выпадковасьць думкі
Нібы варону,
Што ўзьнялася па-над сьветам,
Дзе не адрозьніць
Неба ад зямлі.

***

Запрасілі мяне ў залю суду, нібы ненадоўга.
Калі сьведкам, думаю я, — мне няма чаго сьведчыць, а падсудным — дык я не злачынца.
Бачу, прада мною чалавекі са тры. (А суд ідзе: усё новым і новым выносяць прысуды, радзей — адпускаюць.) І чамусьці ўсе ідуць мне наперад. А я — зноў апошні: чакаю прысуду камусьці? Ці, можа, сабе?

***

Як загаралася першае лісьце на дрэвах,
Як ішоў наперад, наперад
Па хісткай кладцы вясны —
Радок за радком
Зьбягала ўдалеч чароўная стужка…
І вось яшчэ адна вясна за плячамі,
А ў далонях — новыя вершы.

***

Возера — старасьць.
Гэта рэчка спынілася ўспомніць
Сваё мінулае.

***

Быў музыкант,
Пісаў прыгожыя песьні.
Скончыў жыцьцё самагубствам
І трапіў у пекла.
Засталіся прыгожыя песьні,
Што клічуць за ім.

***

Праімчалася вайна, нібыта баль,
Слаўнай дзедавай Назе далі мэдаль,
Ёй да неба з бронзы помнік узьвялі,
А вакол — квітнеюць родныя палі:
Ні вайны цяпер табе, ні іншых бед —
Дзівіцца з вышынь Нага на мірны сьвет.

Ленін і Дзяржынскі
Ленін — круглы,
Дзяржынскі — доўгі.
Фэлікса мала,
Ульянава — многа.

За Леніным — Кайзэр,
У Дзяржынскага — маўзэр.

Ленін у Маўзалеі,
Дзяржынскі — у глеі.

Але і адзін, і другі
Носяць бараду і кепку
І ўсёй душой аддадзены
Ідэі дыктатуры пралетарыяту
І сусьветнай рэвалюцыі.

***

Зноў май
Варыць сваю страву:
Кіпіць
Вэтэранамі плошча,
Вецер ім
Языкі палошча.
Сьцягі
Зьлева і справа.

***

Недзе п'е за перамогу здраднік-дзед,
А Нага — Нага пайшла ў белы сьвет.
Холад дзікі: на двары сабака здох,
А Нагу ніхто ня пусьціць на парог,
Дзед забыўся пра яе і вынес бот,
А ў вайну Нага закрыла целам дот.
Ды ад праўды ад зямной ніхто ня зьбег,
Пад сабачы закапаюць дзеда брэх.
А Нага, яна між намі назаўжды,
Яе імем называюць гарады.

# Мяжа

**УЛАДЗІМЕР ЛОБАЧ**

Чалавек, як істота дзіўная і супярэчлівая, адвеку жадае немагчымага, прагне нерэальнага, цешыцца з ілюзорнага і пры гэтым хоча мець рэальны грунт пад нагамі. Месьцячы ў памяці рэха-ўспамін пра «залатыя часы», калі ўсе былі роўныя, а жыцьцёвых дабротаў хапала бязьмерна, чалавек схільны параўноўваць «ідэальную эпоху» зь недасканалай і скрушнай сучаснасьцю. Нібыта сымбаль-увасабленьне апошняй і выступае мяжа ў бясконцай множнасьці сваіх іпастасяў: этнічная, палітычная, дзяржаўная, сацыяльная і шмат якая яшчэ. Так, усхвалявана перажываючыся зь людзкое недасканаласьці, Максім Багдановіч на пачатку Першай сусьветнай прадметна пазначыў праяву, што нібыта нявечыць ідэальны зямны парадак:

Глядзі, па ўсёй зямлі сьвятой
Шырокай хваляй залатой
Бяз краю блішча збожжа мора,
Цьвітуць лугі, шумяць лясы…
Так многа ёсьць паўсюль багацтва і
красы,
А людзі нішчацца у голадзе, у зморы
Ад беднаты, ад цемнаты,
Бо скрозь — **мяжы**, бо скрозь —
платы.
(Максім Багдановіч. «Мяжы»)

Але парадокс акурат у тым і заключаецца, што культура як чынны і неадменны лад жыцьця чалавека па-за межамі і бязь межаў — чыстая фікцыя. Культура пачынаецца менавіта зь мяжы. Гэта можа быць і першая рыска нэалітычнага пэтрогліфа, і першая баразна, што ўздымае векавечны дзірван. Бо мяжа акрэсьлівае і пазначае, выцьвярэжвае, сьцьвярджае і ўсталёўвае сьвет уласна чалавека (культуры). І нават у тыя «залатыя» міталягічныя часы, калі жытні колас рос ад кораня, а сонца сьвяціла круглыя суткі, сам Бог, ходзячы па зямлі, сачыў за тым, каб людзі пільнавалі межы свае. І цяпер яшчэ вушацкія бабулі прыпамінаюць чутае ад дзядоўпрадзедаў: «Хадзіў Бог па зямлі, а чалавек з саломы плот гарадзіў. Бог і гаворыць яму: «Чаго ж ты з саломы робіш? Такі ж плот стаяць доўга ня будзе». А чалавек і кажа: «А што мне надоўга рабіць, я ж заўтра памру». Бо раней жа зналі людзі, калі памруць. Дык Бог узлаваўся на чалавека і зрабіў так, каб людзі ня зналі напярод, калі памруць».

Для беларуса на працягу доўгіх стагодзьдзяў слова «мяжа» было пазбаўлена абстрактных сэнсаў, бо азначала вузкі шнур неўзаранай зямлі, што акрэсьліваў ягоныя палеткі, яго зямную долю, спадчыну і кон. У гэтым сэнсе, абавязковы штовеснавы абход гаспадаром сваіх межаў — «агледзіны» — быў працэдурай далёка не фармальнай. Убраўшыся ў сьвяточную кашулю, патыркаючы па краях свайго поля сьвянцоную вярбу, чалавек браў за ўзор ня звычкі панскага аканома ці «жыда-рандатара», але меў уваччу вобраз вышэйшы і сакральны: «Сьвяты Мікола пайшоў у поле, / Пайшоў у поле і па **межах** ходзіць, / Па межах ходзіць, Бога просіць: / Дай жа, Божа, і жыта і ярыны, / І жыта і ярыны — горы і даліны».

Але нават калі на мяшчанскіх вулках, а затым і сялянскіх падворках пачаў павяваць сьвежы ветрык беларускага нацыянальнага самаўсьведамленьня, рытуальны абход сваіх межаў ня страціў сваёй значнасьці. Наадварот. Бо цяпер межы Бацькаўшчыны цягнуліся не ад «Чорнага азяра» да «Міколавай амшарыны», але разьлягаліся ад Вільні і Беластоку да Смаленску і Невелю, як гэта засьведчыў акадэмік Карскі, што сабраў усе нашы «аканьні», «дзеканьні», «цеканьні» і шчодра аздобіў імі мапу Эўропы ў самым яе сэрцы. Тыя этнаграфічныя межы яшчэ няможна было замкнуць ад драпежнікаў на беларускі дзяржаўны замок — сама дзяржава толькі паўставала. Іх можна было толькі агучыць словам, мацаваць уласным духам і праўдзіць асабістым учынкам — усё тымі ж «агледзінамі»:

І ў белы дзень і ў чорну ноч
Я ўсьцяж раблю **агледзіны**,
Ці гэты скарб ня збрыў дзе проч,
Ці трутнем ён ня зьедзены.
(Янка Купала. «Спадчына»)

Знакава, што радкі гэтыя Купала напісаў у 1918 годзе, калі канавалася дзяржаўная доля Радзімы, калі веснавой Дабравешчанскай грымотай на сполах усім хцівым суседзям прагучалі залатыя словы беларускай нацыянальнай ідэі: «Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе жыве і мае лічбенную перавагу беларускі народ, а ласьне: Магілеўшчыну, беларускія часьці Меншчыны, Гарадзеншчыны (з Горадняй, Беластокам і інш.), Віленшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежныя часьці суседніх губэрняў, заселеныя беларусамі». Але як цярпіць этнічнае цела, калі яму не стае нацыянальнага духу і дзяржаўнае моцы! Не ўпільнавалі мы сваіх межаў і назаўжды страцілі братоў па крыві. Неаднакроць бываючы на Невельшчыне, Себешчыне і Смаленшчыне, са скрухай і болем пераканаўся, што тамтэйшая прыродная беларушчына і парадак незваротна спляжаныя расейскім моламі савецкага разьліву. Там даўна ўжо не гародзяць платоў. Нават з саломы…

Не ставала нам моцы, і таму ў XX стагодзьдзі (як, дарэчы, і ў XVIII) былі мы аб'ектам чужых злачынных межаваньняў. Рэзалі па-жывому, хто і як мог.

У 1918-м Расея прысвоіла Віцебшчыну і Магілёўшчыну. У 1921-м у Рызе маскоўцы і палякі згулялі ў



«Хадзіў Бог па зямлі, а чалавек з саломы плот гарадзіў. Бог і гаворыць яму: «Чаго ж ты з саломы робіш? Такі ж плот стаяць доўга ня будзе». А чалавек і кажа: «А што мне надоўга рабіць, я ж заўтра памру». Бо раней жа зналі людзі, калі памруць. Дык Бог узлаваўся на чалавека і зрабіў так, каб людзі ня зналі напярод, калі памруць».

«ножычкі» бяз нас, адцяўшы Заходнюю Беларусь на карысьць чарговай Рэчы Паспалітай. Увосень 1939-га сьвяткавалі ўжо літоўцы, атрымаўшы ад Крамля нечуваны падарунак у выглядзе Вільні і Віленскага краю. Па вайне адрэзалі, не спытаўшы, Беласточчыну… І нават у напаўрасьцягнутай беларускай хаце бальшавікпрыхадзень руйнаваў адвечныя нашы парадкі, сьцягваючы хутары ў калгасы і крэсьлячы новыя межы для беларускіх паселішчаў: СібЛАГ, КатЛАГ, Курапаты. Але ж, вядома, па калгасных межах сьвяты Мікола ня ходзіць і жыта там дагэтуль буяе толькі прыпіскамі.

Як паказвае гісторыя, простае перайменаваньне этнічнай прасторы ў дзяржаўную (нацыянальную) непасрэдна не прыводзіць да фармаваньня нацыі на гэтай зямлі. Беларусь нацыянальная пачынаецца з таго, як межы «свайго» і «чужога» высьпяваюць і выцьвярэжваюцца ў сьвядомасьці і сьветаглядзе тых, хто шчыра лічыць сваю Радзіму, Свабоду, Мову грунтам асабістай (калектыўнай) адметнасьці і годнасьці, але ніяк не этнаграфічнай данасьцю-экзотам.

І нізка тэзісаў Вацлава Ластоўскага «Што трэба ведаць кожнаму беларусу?», што ўбачыла сьвет у тым жа лёсавызначальным 1918 годзе, — гэта ня «песьня жальбы» якой-колечы сучаснай дэмакратычнай кааліцыі — гэта нацыянальны імпэратыў, па-за межамі якога беларусаў чакае адно небыцьцё ў вірлівым і драпежным сьвеце: «Мы гардзімся, што мы Беларусы! Мы горды са свае мовы! Мы горды са свае песьні! Мы горды са свайго народу! Мы горды са свае гісторыі! Мы горды за сваю родную зямлю!» Словы гэтыя маюць і зваротнае прачытаньне: ты запалохваеш і па-хамску прыніжаеш свой народ, абзываеш яго «расейцамі, толькі са знакам якасьці»? Ты ганьбіш родную мову і прылюдна зьдзекуесься зь яе? Ты стаптаў у бруд нашы сымбалі, парушыў уласныя клятвы берагчы іх і ўслаўляць на ўвесь сьвет? Ты зьневажаеш гісторыю нашу, а значыць, і продкаў, бо табе даражэйшая «Лінія Сталіна»? Дык у гэтым выпадку імя табе, як сьцьвярджае Власт, толькі адно — «здраднік, душапрадаўца». А здрада — гэта найцяжэйшае ліхадзейства, якое толькі ведаюць людзі. І як пераступіў ты гэтую апошнюю мяжу, не адмыцца табе да скону.

На мяжы тысячагодзьдзяў мы зноў апынуліся на лёсавызначальныхростанях. Чарговы раз у нас спрабуюць адабраць наша кроўнае спадчыннае права на Радзіму, Свабоду і Мову. Вар'яцкія дэкрэты і ўказы імкнуцца абмежаваць, адмежаваць і разьмежаваць нас, падмяніць Наш Сьвет пагібельнай рэзэрвацыяй, імя якой — Краіна Боязі. Межы гэтай краіны — апошні рубеж сатрапіі — такія ж трывалыя і надзейныя, як і «Лінія Сталіна».

Муры, збудаваныя на жывёльным страху страціць уладу, разваляцца, як толькі мы адолеем боязь у саміх сабе.

Варта помніць, што сытуацыя памежжа — гэта сытуацыя выбару, які ніхто і ніколі не перашкодзіць табе зрабіць, калі ты наважыўся на яго сам. Стаяць на мяжы — мець заўсёдную адказнасьць за словы свае і ўчынкі. Дык выбірайма ж Беларусь, каб не застацца па-за мяжою!

*Полацак*
*28.11.2005*

ЭТГАР КЕРЭТ

# «Адыдасы»

апавяданьне



На пачатку гульні я яшчэ памятаў, што трэба высьцерагацца ды ня біць мыском, каб не зрабіць балюча дзядулю.

У Дзень памяці ахвяраў галакосту мы паехалі з нашай настаўніцай Сарай на аўтобусе №57 у музэй «Валынскі дом», дык я адчуў сябе страшэнна важным. Усе дзеці ў клясе былі зь сем'яў выхадцаў з Іраку апрача мяне, майго стрыечнага брата і яшчэ аднаго хлопчыка, Друкмана, і яшчэ я быў адзіны ў клясе, чый дзядуля загінуў падчас галакосту. Музэй быў вельмі прыгожы і раскошны, увесь зроблены з чорнага граніту на грошы мільянэраў. Там вісела многа тужлівых чорна-белых фатаграфіяў ды сьпісы людзей, краін і памерлых. Мы хадзілі парамі паміж тых здымкаў, ды настаўніца сказала не кранаць нічога рукамі. Але я дакрануўся да адной кардоннай фатаграфіі, на якой быў зьняты худы чалавек з бледным тварам. Ён плакаў і трымаў у руцэ бутэрброд. Ягоныя сьлёзы скочваліся па шчоках, як палоскі, якія малююць на шашы, а дзяўчынка, зь якой я ішоў у пары, Орыт Салем, гаварыла, што яна ўсё раскажа настаўніцы, што я дакрануўся. А я гаварыў ёй, што як да мяне, дык няхай расказвае каму жадае, нават дырэктару школы — мне ўсё роўна. На здымку — мой дзядуля, і я буду дакранацца да ўсяго, да чаго мне заманецца.

Пасьля фатаграфій нас павялі ў вялікую залю ды паказалі кінастужку пра маленькіх дзетак, якіх садзяць у грузавікі і потым усіх труцяць газам. Пасьля фільму на сцэну падняўся адзін хударлявы стары, які расказаў, якія фашысты былі гады і забойцы ды як ён ім помсьціў і нават задушыў да сьмерці аднаго нямецкага жаўнера.

Джэрэбі, які сядзеў поруч са мною, казаў, што дзед маніць, паколькі, мяркучы па тым, як ён выглядае, на сьвеце няма нават аднаго жаўнера, якога гэты стары мог бы аддубасіць. Але я паглядзеў старому ў вочы і паверыў. Там было столькі злосьці, што ўсе выбрыкі шпаны, якая ў запале выстаўляе каратэшны блёк, падаліся побач зь ім сьмеху вартай драбязой.

Нарэшце, скончыўшы апавядаць аб тым, што ён рабіў у час галакосту, стары сказаў, што ўсё пачутае намі тут вельмі важна ня толькі для мінулага, але і для таго, што адбываецца цяпер. Бо ўсё яшчэ засталіся немцы, і ў іх ёсьць дзяржава. Стары казаў, што ён ніколі ім не даруе ды спадзяецца, што і мы не даруем і што барані нас божа ехаць наведваць іхнюю краіну. Бо, калі пяцьдзясят год таму ён разам з бацькамі паехаў у Нямеччыну, усё выглядала цудоўна ды скончылася пеклам.

— Часта ў людзей кароткая памяць, — казаў ён, — асабліва на дрэнныя рэчы. Людзі лічаць за лепшае забыць. Але ж вы не забывайце. Штораз, калі вы ўбачыце немца, прыгадайце, што я вам расказаў. Ды кожны раз, як убачыце тавары зь Нямеччыны — няважна, ці то тэлевізар (а большасьць фірмаў па вытворчасьці тэлевізараў — нямецкія), ці нешта іншае, — заўсёды памятайце, што пад элегантнай упакоўкаю хаваюцца часткі целаў ды тэлефонныя слухаўкі, зробленыя з костак, скуры і плоці памерлых габрэяў.

Па дарозе на вуліцу Джэрэбі казаў яшчэ, што калі дзед прыдушыў агурок, тады ён, Джэрэбі, — папа рымскі, а я падумаў, што гэта, у прынцыпе, добра, што ў нас дома «Амкор»*. Каму патрэбны праблемы?

Праз два тыдні пасьля гэтага мае бацькі вярнуліся зь іншай краіны ды прывезьлі мне футбольныя буцы. Мой старэйшы брат казаў маме, што я мару пра буцы, і яна купіла самыя клясныя. Мама ўсьміхалася, калі ўручала мне падарунак, і была ўпэўнена, што я яшчэ ня ведаю, што там у сярэдзіне. Але ж я адразу здагадаўся па адыдасаўскім значку на пакеце. Я дастаў кардонную каробку з пакета ды сказаў «дзякуй». Каробка была ў форме прастакутніка, накшталт труны. І ў сярэдзіне ляжала пара белых буцаў, кожная з трыма сінімі палоскамі абапал ды надпісам «Адыдас — Ром». Каб даведаецца пра гэта, мне ня трэба было нават адчыняць каробку.

— Давай іх надзенем, — сказала мама і дастала з буцаў паперу, — паглядзім, як яны сядзяць на назе.

Яна ўвесь час ўсьміхалася, не разумеючы, што гэта за буцы.

— Ведаеш, яны зь Нямеччыны, — сказаў я і моцна-моцна абхапіў яе руку.

— Канечне, ведаю, — усьміхнулася мама. — Гэта ж «Адыдас» — найлепшая фірма ў сьвеце.

— Дзядуля таксама быў зь Нямеччыны, — паспрабаваў намякнуць я.

— Дзядуля быў з Польшчы, — паправіла мяне маці ды зрабілася на імгненьне сумная, але тут жа сум гэты

* *Бог сьвяты яго ведае (ідыш).*



**Этгар Керэт** (нар. 1967) — ізраільскі пісьменьнік. Нарадзіўся ў горадзе Рамат-Ган паблізу Тэль-Авіву ў сям'і выхадца з Польшчы. Аўтар культавага зборніка «Мая туга па Кісынджэру» — своеасаблівых «Дзяніскавых аповедаў» эпохі разьвітога постмадэрнізму. На беларускую мову перакладаліся ягоныя апавяданьні «Мары ўяўнага тэрарыста», «Цярплівасьць», «Падняць плянку» ды «Дзяўчына на лядоўні».

мінуў, яна надзела мне адну буцу і пачала завязваць матузкі.

Я маўчаў. Я ўжо зразумеў, што нічога не парадзіш. Мая мама нічагуткі ня кеміць. Яна ніколі не была ў «Валынскім доме». Ёй ніколі нічога не тлумачылі. І для яе гэта былі проста буцы, а Нямеччына была наагул Польшчаю. Тады я даўся іх адзець і замаўчаў. Не было сэнсу расказваць ёй ды засмучаць яе яшчэ больш.

Пасьля таго як я сказаў другі раз «дзякуй», я даў маме буську ды паведаміў, што іду на вуліцу гуляць.

— Толькі асьцярожна, ага? — крыкнуў тата з фатэля ў гасьцёўні. — Не разьдзяўбі іх адным махам.

Я зноўку паглядзеў на змрочныя буцы са скуры ў мяне на нагах. Паглядзеў і ўспомніў усё тое, пра што стары душыцель немцаў сказаў, што трэба запомніць. Я дакрануўся яшчэ раз да адыдасаўскіх палосак і ўспомніў свайго кардоннага дзядулю з бутэрбродам.

— Ня муляе? — спытала мама.

— Вядома ж, ня муляе, — адказаў за мяне брат. — Гэта табе ня нашы айчынныя рызманы, гэта такія самыя буцы, як у Кроіфа.

Я асьцярожна, на дыбачках, прайшоўся ў бок дзьвярэй, стараючыся як мага менш на іх націскаць. Гэтак я дайшоў да Малпінага парку. Там на пляцоўцы хлопчыкі са школы «Борахаў» падзяліліся на тры каманды: Галяндыю, Аргентыну і Бразылію. І якраз у зборнай Галяндыі ім не ставала аднаго гульца, дык яны пагадзіліся ўзяць мяне, нягледзячы на тое, што яны ніколі не бяруць хлопчыкаў, якія ня з «Борахава».

На пачатку гульні я яшчэ памятаў, што трэба высьцерагацца ды ня біць мыском, каб не зрабіць балюча дзядулю, але, калі мінула трохі часу, я забыўся гэтаксама, як казаў стары, што забываюць, і нават забіў вырашальны гол «нажніцамі» ў скачку. І толькі калі скончылася гульня, я зноўку ўспомніў і паглядзеў на іх. Раптам буцы падаліся такімі зручнымі, больш пругкімі, наагул выглядалі значна лепш, чым калі ляжалі ў пушцы.

— Ты бачыў гэтыя «нажніцы»?! — нагадаў я дзядулю па дарозе дадому. — Іхні брамнік стаяў як слуп, калі яму загналі файны гол.

Дзядуля нічога не адказаў, але па вясёлай спружыністай хадзе я адчуў, што ён таксама ўсьцешаны.

**Пераклад з габрэйскае Паўла Касьцюкевіча**

ГАННА ЧАКУР

# Заўважынкі



* * *

У бярозы — толькі пяшчотныя эпітэты: беластвольная, стройная, гладкаскурая… А ў лацінскай яе назьве — корань ад слова «біць». Яе такія кволыя на выгляд галінкі насамрэч моцныя, хлёсткія — з дапамогай ветру яны лупцуюць суседнія дрэвы, не даюць ім расьці ў свой бок. Прыгледзьцеся: дрэвы, што суседнічаюць зь бярозкай, заўсёды аднабокія.

Часам бярозістымі бываюць і людзі…

* * *

Чым больш думаю, тым менш магу зразумець, што такое памяць. Чаму на скрыжалях мазгавых завілінаў вечнымі адбіткамі запісваюцца нязначныя эпізоды?

…Разззлаваўшыся за нешта на старэйшую сястру, шпурляю ў яе яйкам, якое, адскочыўшы, разьбіваецца. Плачу — шкада яечка…

…У аднакласьніка Аліка хранічны рыніт — зялёныя «бутэлькі» пад носам на марозе падмярзаюць. Ён вучыць мяне катацца на каньках…

Памятаю гэта ў колерах і гуках. Нават у пахах. А важныя падзеі, якія, здавалася б, павінны назаўсёды застацца ў мазгу зыркім імпульсам, насамрэч расплываюцца. Як спаткала сваё 18-годзьдзе — ня помню. Калі і ад каго ўпершыню пачула «кахаю» — ня помню. На шчацэ ў мяне сьлед ад даўняй драпіны, пра якую я нічога ня памятаю…

Хто ці што маёй (тваёй, ягонай…) галаве дае загад: гэта запомніць да дробязяў, да адценьняў; гэта — празь пеньчалоду; а на гэта — забыцца, сьцерці, адмовіцца, раз і назаўсёды?

І яшчэ. Што такое народная памяць? Як нараджаецца, паводле якіх законаў жыве яна? Чаму імёнам дойлідаў, якія стварылі адно зь сямі цудаў сьвету — храм Артэміды ў Эфэсе, — у народнай памяці месца не знайшлося, а імя Герастрата, яго зьнішчальніка, жыве стагодзьдзе за стагодзьдзем?

* * *

Шмат гадоў існуюць побач у цесным суседзтве два жытлы: чалавечае і бусьлінае. Чалавечае закінута — зарасло хмызьняком, страціла шыбы, шашаль пусьціў па ім жоўтыя пісягі парахна. А бусьлінае — запатрабаванае: кожны год зь яго вылятаюць у вялікі сьвет новыя птушкі.

* * *

Вербная нядзеля. Імша для дзяцей.

— Хорашанька складаем да Пана Бога ручкі, — зьвяртаецца да юнай паствы крыху саладжавы сьвятар. — І ўсе дружненька чытаем «Ойча наш».

Белабрысае хлапчанё старанна складае ручкі, дэклямуе малітву са сьвятым — хоць абраз зь яго пішы — выразам твару. А дупа «сьвятошы» ў гэты самы час рытмічна прысядае — так ён стараецца напалохаць суседа, які ззаду за ім паклаў на лаўку сваю прыгожую вербачку.

* * *

Бог ёсьць адзін. Але ў трох асобах: Бог Айцец, Бог Сын, Бог Дух Сьвяты. Гэта аксіёма, прышчэпленая з маленства. Але ж і кожны з нас, людзей, таксама трыадзіны: душа, цела і розум. Можа, мы — таксама багі?

* * *

Люблю прыдумляць новыя словы. Як Глёбус. Які людзей на вуліцы разьдзяляе на мінакоў, сустрэчнікаў і спадарожнікаў. І гэта нармальна. Мова Вялікага Княства Літоўскага на працягу некалькіх стагодзьдзяў была забароненая. І зьбераглася ў вёсцы, сярод простага люду (арыстакратыя ва ўсе часы была самай пераметнай). Таму наша мова і «простая» — на вёсцы ёй карысталіся толькі ў абмежаваным выглядзе. Не разьвівалі.

Для таго, каб жыла, трэба разьвіваць. Прыдумляць. Багаціць. А хто ня ўмее прыдумляць — няхай на ёй хаця б размаўляе.

*Астравец*

# Бераг даверлівага пляча

**ВАЛЯНЦІН ТАРАС**

*Памяці Яўгеніі Янішчыц*

Апошнія гады свайго жыцьця паэтка Яўгенія Янішчыц пражыла ў доме №8 па вуліцы Старажоўскай, непадалёк ад прыбярэжжа Сьвіслачы. Прыбярэжжа тут — адзін з самых прыгожых, самых паэтычных куткоў Менску. Да закаванага ў шэра-ружовы граніт берагу ракі прымыкае прасторны своеасаблівы парк, дзе дрэвы — клёны, вязы, каштаны, ліпы, яліны, ніцыя вербы — стаяць асобнымі купамі на невысокіх узгорках, паміж якімі разьбіты кветнікі і клюмбы. Я жыву ля Опэрнага тэатру, ад якога да Старажоўскай хвілін дзесяць хады, і час ад часу наведваюся сюды — пахадзіць уздоўж берагу, падыхаць, падумаць. Апошні раз пабываў тут на пачатку лістапада, надзіва яркім, бясхмарным, лагодным днём; сонца прыпякала, як на «бабіна лета», і на клюмбах яшчэ цьвілі белыя ды ружовыя пэтуніі, палалі жоўтыя, як агонь сьвечак, гартэнзіі, лілёвымі агеньчыкамі сьвяціліся астры, нават браткі ня страцілі сваёй густой сінявы. Як летам, бесклапотна адпачывалі на зялёнай гладзі ракі дзікія качкі. І раптам згадалася, што гэта ж у лістападзе нарадзілася Жэня Янішчыц, і пайшла з жыцьця таксама ў лістападзе… І разам са згадкай гэтай прыйшла думка: «Чаму тут, на гэтым прыбярэжжы, сядзіць на чыгуннай лавачцы Пушкін? Сядзіць, задуменна глядзіць на супрацьлеглы бераг, туды, дзе вырысоўваюцца на блакіце неба контуры Старога гораду, якога ён пры жыцьці ніколі ня бачыў, і наагул ніколі ня бачыў Менску, ніколі ў ім не бываў. І вось спадобіўся прыбыць сюды праз сто семдзесят зь вялізным гакам гадоў пасьля сваёй сьмерці ў аблічча помніка…» Помнік гэты — дар мэра Масквы Юр’я Лужкова Менску «ў знак вечнай, непарушнай дружбы паміж расейскім і беларускім народамі, у знак іхнай еднасьці». Дзякуй, вядома, Юр’ю Міхайлавічу за падарунак, але ніяк не магу адчапіцца ад сваёй думкі, кашчунскай у вачох апантаных «інтэгратараў»: «Чаму тут сядзіць на лавачцы Аляксандар Пушкін? Чаму ня Жэня?»


АРХІЎ Г. ДАЛІДОВІЧА

Але я ні ў якім разе не хачу прынізіць Пушкіна. Ніколі не пагаджуся зь Зянонам Пазьняком, які некалькі год назад сказаў на старонках «Народнай волі»: «Пушкін нічога не гаворыць майму беларускаму сэрцу!» Калі гэта не палемічны перахлёст у спрэчцы з прамаскоўскімі русіфікатарамі, калі Зянон сапраўды цалкам адмаўляе Пушкіна, то гэта, даруйце, альбо абмежаванасьць паэтычнага слыху, альбо абсалютная глухата да іншамоўнай паэзіі, альбо нежаданьне, няздольнасьць узьняцца над сваімі палітычнымі поглядамі нават тады, калі перад табой паэт сусьветнага маштабу. Я разумею, Зянон ня можа дараваць Пушкіну верш «Паклёпнікам Расеі», накіраваны супраць антыімпэрскага паўстаньня 1831 г., якое адбылося ў Польшчы і Беларусі, ды хіба адным гэтым вершам вычэрпваецца ўся творчасьць вялікага паэта? Ягоная творчасьць увайшла і ў нашу сьвядомасьць, у сэрцы мільёнаў чытачоў, у сэрца той жа Яўгеніі Янішчыц:

Глядзеў, калі ішла праз поле…
Глядзеў, як зьнікла у бары…
І адпусьціў яе на волю,
Бы рыбку пушкінскі стары.

Як бачым, пушкінскі вобраз арганічна, натуральна ўплецены ва ўласнае паэтычнае мысьленьне Янішчыц. Гэтыя радкі з «Вольнай жанчыны» прыгадаліся мне ў той самы дзень лістапада, калі стаяў ля помніка Пушкіну і думаў, чаму тут сядзіць на лавачцы ён, а ня Жэня. Думаю так і сёньня, бо усё-такі перадусім трэба сваім паэтам ставіць помнікі, а не расейскім, ці ўкраінскім, ці яшчэ якім, хай сабе і вялікім. А колькі ў нас у Менску помнікаў сваім на плошчах ці ў парках? Тры. Купалу, Коласу і Багдановічу. Ну яшчэ некалькі барэльефаў на мэмарыяльных дошках… Напэўна, нехта запярэчыць: «Яўгенія Янішчыц не такога маштабу паэтка, каб ставіць ёй помнік на гарадзкой плошчы. Пра яе ня скажаш — вялікая». Можа, і не вялікая ў звыклым сэнсе, але *сапраўдная*, высокай залатой пробы. Талент! Ды справа яшчэ і ў асобе, у чалавечай значнасьці, у вы-

**Працяг на старонцы 44.**

Наш рух да вялікага навагрaдца Адама Міцкевіча, распачаты яшчэ ў XIX стагодзьдзі, роўны ўзыходжаньню, мэтанакіраванаму і незваротнаму. І чым бліжэйшыя мы да паэта, тым бліжэйшыя да саміх сябе. Ён — нашае самапазнаньне, найперш праз пераклады твораў. Можа, таму паэтычная спадчына А.Міцкевіча асвойваецца ў новых і новых беларускамоўных варыянтах яго вершаў і паэмаў. Прапаную чытачам «Нашай Нівы» свае пераклады зь Міцкевічавых «Крымскіх санэтаў».

**Уладзімер Мархель**

# Крымскія санэты



## АДАМ МІЦКЕВІЧ

XV
ДАРОГА НАД ПРОРВАЙ У ЧУФУТ-КАЛЕ
МІРЗА І ПІЛІГРЫМ

МІРЗА
Памаліся, кінь паводзьдзе, адвярніся ўбок,
Вершнік тут даверыць розум свой нагам каня;
Добры конь! Стаіць, глядзіць, якая глыбіня,
Край намацаў капытом, але ня ставіць крок,

Як завіснуў, ды туды ўжо не скіроўвай зрок,
Нібы студня Аль-Каіру, тая прападня,
І не для рукі бязь пёраў будзе вышыня;
Нават думку не пускай туды сваю здалёк,

Бо яна, як якар, кінуты ў ратунку дну,
Перуном спадзе ў прадоньне, за яго мяжу,
Лодку ў бездань пацягнуўшы за сабою ўміг.

ПІЛІГРЫМ
Я ж, Мірза, праз шчыліну сусьвету зазірнуў,
Там убачыў я — а што, па сконе раскажу,
Бо няма на тое словаў у людзей жывых.

XVI
ГАРА КІКІНЭІС

МІРЗА
Зірні ў прадоньне — неба, лёгшае на доле,
То ж мора, дзе між хваляў птах-гары фігура:
Яе падбіла перуном заўчасна бура,
Яна вясёлкай пер'е разьвяла ў паўколе,

Схавала выспай сьнегу вод блакітных поле,
Ды той плывец вандроўны ў прорве — гэта хмура!
Зь яе грудзей на сьвет спадае ноч панура,
Ці бачыш стужкі бліскат у яе прыполе?

Маланка гэта! Стой, па-над бяздоньнем ногі,
Прышпорым коней і перасягнём цясьніну,
Скачу я, ты ж чакай гатовы без трывогі,

Як зьнікну з воч, на край скалы глянь праз хвіліну:
Як блісьне там пяро, то мой турбан ня згінуў,
А не, то для людзей няма туды дарогі.

XVII
РУІНЫ ЗАМКУ Ў БАЛАКЛАВЕ

Той замак, што ў руінах звалены бяз ладу,
Ты за красу і варту меў, няўдзячны Крыме!
Цяпер далёкі пілігрым яго ўжо прыме
За чарапы гігантаў, дзе прытулак гаду.

На вежу ўзыдзеш, бач, у пыле заняпаду
Ёсьць надпіс, то й героя мо імя ў тым грыме,
Што страшыла чужых — забыта ўжо сваімі,
Як вусень, захінута лісьцем вінаграду.

Тут выштукоўваў грэк афінскія аздобы,
Адсюль манголу італьянец слаў паразу,
І з Мэкі прыхадзень выводзіў сьпеў намазу.

Сягоньня ж груганам тут не кружляць ізноў бы,
Нібы над местам, цалкам зьнішчаным заразай,
Дзе вежы ўзмахваюць харугвамі жалобы.

XVIII
АЮДАГ

Люблю я з Аюдагу пазіраць у далі,
Дзе ўсьпененай чаргой валы йдуць за валамі
То чорнай чарадой, то срэбнымі клубамі,
То ў сьнежных пырсках і ў вясёлкавым крышталі,

На мель наткнуцца і раздробяцца на хвалі,
Абложаць узьбярэжжа, быццам бы кітамі.
Пасьля трыюмфу расстаюцца зь берагамі,
Згубіўшы за сабою пэрлы і каралі.

Паэце малады! Тваё такое ж сэрца!
Жарсьць часта ў ім сьпяшае з грознай бурай стрэцца,
Калі ж рука твая ўжо лютні дакранецца,

У забыцьцё сплывае, нібы ў тоні сховы,
І пакідае несьмяротнай песьні словы,
Зь якіх вякі сплятуць табе вянок лаўровы.

# Як тры дзяды ў лазьню хадзілі



Раз на тыдзень тры дзяды зь вёскі Ліхачы — Сямёныч, былы камбайнэр-ударнік, Ёсіфавіч, ягоная лазьня, Рыгорыч, былы дырэктар школы, — зьбіраюцца ў лазьні. Нядзеля. 20.00.

— Глядзі, сфатаграфіруеш, у газэце напячатаеш — прыедзе якая маладзіца да Ёсіфавіча!

— Няхай прыяжджае. Гароды ёсьць — будзе рыць.

— Я празь месяц вам фоткі прывязу.

— Празь месяц?! А заўтра хачу ж газэту.

— На вясельле Рыгорыч у горад езьдзіў? Мо на сваё? Сьмяюцца.

— Да ўнука…

— Я на полку не палезу. Стары ўжо.
— Слаба і я бачу. З адным глазам далёка не паедзеш…





— Ужо паўміралі ўсе… Дачыхіна Янечка памерла. Казімірчына, ну, што старшу сястру дзяржаў, Гэлю.

— Эты Антоніка, што бык забараў, сын большы стары, пад Брыгамі жыў, памёр.

— Э, гэты, Чорны Нос, напагатове.

— На хутарах жыве.

— Дзесьці закандабасілася, каб яе. (Пра майку, што ня ўзьдзець.)

— Дзякуй за лазьню, я паехаў дахаты.

— Дасьвіданьне!

— Дасьвіданьне, Рыгорыч!

**Фота і тэкст Андрэя Лянкевіча**







ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Нават вецер гнёзды ўе

Рыгор Барадулін,
убачаны Ўладзімерам Някляевым.

Субяседнік Паэта зусім не чытач. Субяседнікі Паэта — Ён і Яна. Бог і Вечнасьць. Больш размаўляць Паэту няма з кім і няма пра што.

Але што да Паэта Богу і Вечнасьці? Калі наперад ведаюць яны ўсё тое, што ён скажа, бо самі ж і нашэптваюць, і падказваюць яму магічныя словы, падаюць таямнічыя знакі...

Ім цікава: «Ці ўгадае?» — іх займае Гульня.

Паэт — дзіця, Бог і Вечнасьць — таксама дзеці.

Тым часам нехта з дарослых будзе сур'ёзна даводзіць мне, што Рыгор Барадулін — у адрозьненьне ад Янкі Купалы — вэрсыфікатар. Што ж, няхай сабе, але з адным істотным удакладненьнем: у адрозьненьне ад геніяльнага паэта Янкі Купалы, геніяльны паэт Рыгор Барадулін яшчэ і геніяльны вэрсыфікатар.

Як-ніяк стагодзьдзе прамінула.

Адлегласьць у сто гадоў наша паэзія прабегла, нібы алімпійка. Нягледзячы на ўсе бар'еры на дыстанцыі. На ямы з крывёй, на лесапавалы. Гэта фэнамэнальная зьява ў сусьветнай культуры, з чаго і вынік фэномэн Рыгора Барадуліна. І не самоціцца б нам, жалячыся, што ўсё нашае прахне, а шчасьлівіцца тым, што красуе.

Зашмат у белым сьвеце суму беларускага. Дальбог, замнога.

> І старац зношаны, і маладзён,
> Ніхто і не падумае, што, зрэшты,
> Ён — саркафаг сваіх пражытых дзён.

«Першыя — навечна першыя, і палепшыць іх немагчыма», — напісаў у прадмове да барадулінскага збору твораў Васіль Сёмуха, маючы на ўвазе Купалу, Коласа, Багдановіча. Яно так. Як і тое, што ўжо цяпер відавочна: Барадулін разам зь імі, роўны сярод роўных.

Роўных яму няма сярод сучасьнікаў. Ён адзіны, хто здолеў, як і тыя першыя, якіх немагчыма палепшыць, увабраць у сябе ці ня ўсю беларускую спрадвечнасьць. У якой нават вецер гнёзды ўе.

Хрышчоны ва ўніяцтве, ён называе сябе крывічом і кшчоным паганцам. Друвінам. Называе нездарма, бо ўвабраў у сябе ці ня ўвесь крывіцкі дух, удыхнуўшы зь ім усю мову крывіцкую. Ён адзіны беларускі паэт, які існуе толькі ў мове і выключна ў ёй. Існуе гэткім жа неверагодным цудам, якім сама мова існуе ў пабураным — альбо дасюль ня створаным — беларускім сьвеце.

Музыка не патрабуе перакладу, паэзія не перакладаецца. Геніяльны паэт роўны самому сабе толькі на сваёй мове. Рыгор Барадулін якраз гэткі паэт, роўны самому сабе адно па-беларуску. Зрэшты, як і народ роўны самому сабе толькі на сваёй зямлі з усім сваім.

Яно не азначае, што ня трэба мкнуцца ў сьвет… Яшчэ як трэба — мы і так ужо ўсіх пераседзелі ў лясах ды балотах. Пакуль выжывалі — жыцьцё ішло.

Што істотна, для Барадуліна не існуе калізіі *паэт і народ*. Прынамсі гэтак, як існавала яна для Купалы: «Па колькі нам дасі чырвонцаў, калі мы пойдзем за табой?..» Калі Барадулін і вылучае сябе з народу, дык толькі тым, што, пакуль народ сьпіць, ён робіць ягоную народную работу: мовастваральную. Прачнуўшыся, народ знойдзе ў Барадуліну тое, што і ня сьніў.

Уявіце, якім выданьнем з выданьняў стане некалі слоўнік мовы Рыгора Барадуліна. Зь якога хтосьці дазнаецца, што *ўруччa* — не адно мікраён Менску, дзе чамусьці няма ручаёў.

Нязмушанасьць мэтафары, палётная лёгкасьць радка, электрычнай дугой са словам счэпленае слова — гэтак паўстагодзьдзя таму пачынаўся Рыгор Барадулін. Кнігамі «Нагбом», «Неруш», «Рум», «Абсяг»... У маладосьці — пры гульні з Богам і Вечнасьцю — яно ня дзіва: кіпень вершаў. Але і ва ўзросьце сямідзесяці гадоў, калі пачуваесься, «як беспрытульны дым, перад якім пазачынялі дзьверы», ён стварае «Ксты» — кнігумалітву, кнігу духоўнай паэзіі, пранізаную энэргетыкай. Выпадак зноў жа, як амаль усё, што зьвязана з Барадуліным, фэнамэнальны.

Кніга «Ксты» яшчэ на вянец, амаль да даху ўзвысіла сьцены храму, які ўсё жыцьцё ўзводзіць Рыгор Барадулін. Але да крыжа — далёка, да неба — высока… І ён піша новыя вершы, кладучы на вянец «Кстоў» вянец «Рунаў Перуновых».

Гэткае дойлідзтва заслугоўвае не абы-якой адзнакі… Пасьля прэзэнтацыі кнігі «Ксты», якая адбылася ў Менску ў касьцёле Сьв.Сымона і Сьв.Алены, усе прысутныя там разам са сьвятарамі прыйшлі да думкі, што такой адзнакай магла б стаць Нобэлеўская прэмія. На што ўсе разам, памаліўшыся, і пачалі працаваць.

Дай Божа, каб праз Рыгора Барадуліна (як і праз Васіля Быкава, чаго, на жаль, ня сталася, не пасьпелася) Нобэлеўскай прэміяй узнагародзілася ўся наша нацыянальная культура, літаратура, паэзія, а найперш — мова. Тая самая, якая выстаяла, выжыла насуперак зьнішчэньням. Тая самая, празь якую мы — не на пустым месцы. Тая, якая для Рыгора Барадуліна — *ад мамы Голас*. Урэшце тая, на якой чуе нас Бог — і ці прымае, ці не прымае нашых малітваў.




**Барадулін, Рыгор. Руны Перуновы:** Выбраныя творы. — Укл. А.Камоцкі, У.Сіўчыкаў; Прадм. У.Някляева; Маст. А.Кашкурэвіч. — Менск: Радыёла-плюс, 2006. — 496 с.

**Уладзімер Някляеў** — паэт, старшыня Беларускага ПЭН-цэнтру. Гэты тэкст — прадмова да кнігі выбранага Рыгора Барадуліна «Руны Перуновы».

## НОВЫЯ КНІГІ ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Evanhelije in der Übersetzung des Vasil Tjapinski um 1580.** Facsimile und Kommentare / Herausgegeben von Heorhi Halenčanka. — Paderborn; München; Wien; Zürich: Ferdinand Schöningh, 2005. — 231 S. — (Biblia Slavica. Serie III: Ostslavische Bibeln. Band 5).

(**Эвангельле ў перакладзе Васіля Цяпінскага, каля 1580 г.** Факсыміле і камэнтары / Падр. Георгі Галенчанка. — Падэрборн; Мюнхэн; Вена; Цюрых: Ferdinand Schöningh, 2005. — 231 с.)

Кніжка выйшла ў сьвет ў рамках вельмі прэстыжнай славістычнай сэрыі «Biblia Slavica», дзе раней ужо публікаваліся творы Скарыны. Прадмова Васіля Цяпінскага — адзін з найлепшых узораў беларускай патрыятычнай публіцыстыкі XVI ст., — апроч арыгіналу, пададзена таксама ў перакладзе на нямецкую мову. Сам Цяпінскі апублікаваў Эваньгельлі паводле Мацьвея і Марка ў два слупкі — на царкоўнаславянскай і старабеларускай мовах, што ўзноўлена ў нямецкім выданьні з дапамогаю факсыміле. Над тэкстамі працавалі вельмі кваліфікаваныя перакладчыкі і кансультанты, якія не дазвалялі сабе блытаца ў тэрміналягічных пытаньнях.

...'zacny ruski jazyk' — the noble Ruthenian language, which is now known to linguists as Middle Belarusian (з прадмовы Арнолда Макміліна, прафэсара Лёнданскага ўнівэрсытэту).

**Мікалай Мікалаевіч Улашчык: біябібліяграфічны паказальнік** / Нацыянальная бібліятэка Беларусі; Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь; Беларускі навукова-дасьледчы інстытут дакумэнтазнаўства і архіўнай справы; Склад. В.У.Скалабан (кіраўнік) [і інш.]; Прадм. А.К.Каўка. 2-е выд., перапрац. і дап. — Менск: НАРБ, 2006. — 96 с.

Патрэба ў перавыданьні паказальніка выклікана ня толькі ўгодкамі сьлыннага беларускага гісторыка, стогадовы юбілей якога мы адзначаем сёлета. Неабходнасьць удасканаленьня інфармацыі таксама прадыктавала свае ўмовы. Як зазначае ўкладальнік, да прыкладу, у артыкул 6-га тому біябібліяграфічнага слоўніка «Беларускія пісьменьнікі», прысьвечанага Мікалаю Ўлашчыку, памылкова былі ўключаныя творы для дзяцей, якія належаць не М.Улашчыку, а Н.Улашчыку. У прадмове да паказальніка беларускі дасьледчык з Масквы Аляксей Каўка, апісваючы жыцьцёвы шлях гісторыка і распавядаючы пра ягоныя школьныя гады, адзначае, што пазьней ужо сам Улашчык зьверне ўвагу на той востры, яшчэ падсьвядомы разлад у дзіцячай псыхіцы, які спараджала тагачасная сыстэма расейска-самадзяржаўнага школьніцтва ў Беларусі — цалкам адчужаная ад культурнай, моўнай адметнасьці краю. Разам з тым А.Каўка робіць выснову, што досьвед Улашчыка «можна лічыць эталённым у беларуска-расейскім дыялёгу, у якім і роднасьць і рознасьць здатныя гарманізавацца дзеля ўзаемнага пазнаньня і сапраўднае прыязьні народаў-суседзяў».

**АДз**

**Аляксандар Фядута** перачытвае Міхася Стральцова, геніяльнае «Смаленьне вепрука» і трохі... пра сябе.

# Недамоўленае



Цяжэй ад усё выбраць «самае-самае». Асабліва — у мастацтве. Ну, скажэце мне, як выбраць між «Джакондай» і «Сыкстынскай мадоннай»? Хто вышэйшы паводле свайго генія: Шэксьпір ці Дантэ? А Талстой ці Дастаеўскі — зь імі як быць?

Найлепшы апавед, напісаны на беларускай мове, — «Смаленьне вепрука». Каб не напісаў Міхась Стральцоў болей ніводнага радка, і ўсё адно не было б ніякіх сумневаў у ягонай геніяльнасьці.

Восем старонак тэксту. Досыць.

У 60—70-я гады, зь лёгкай рукі Фэліні, які зьняў фільм пра бясконцыя пакуты творчасьці, стала папулярна распавядаць пра тое, як працуе творца, як у яго не атрымліваецца — ці атрымліваецца, але цяжка.

А можа, і не Фэліні стаў пачынальнікам гэтае моды? Бо пра гэта пісаў і Булгакаў у «Майстры і Маргарыце». Я ня ведаю, ці чытаў Стральцоў Булгакава. А Фэліні, «Восем з паловай», ён дакладна бачыў. Пра гэта ён піша сам — у іншым месцы, у іншай прозе, ня менш адкшталцаванай і дакладнай, але — у іншай.

А ў «Смаленьні вепрука» пра Фэліні ані згадкі.

«Ідуць ужо халады, бяруцца прымаразкі — ападаюць інеем сырыя туманы. Чарсьцьвее зямля, і цёмным, ільсьняна-халодным зяленівам б’е ў вочы парадзелая пры дарозе трава. Ужо выпетрала зябліва, пасівела ў гародчыках і пазванчэла бадыльлё, і панішчымнела павэтра».

Так надыходзіць зіма.

Не на двары — у душы.

«Я жыў тады ў нечапанай частцы гораду, калі надумаўся пісаць, у старым раёне, забудаваным няўклюднымі цаглянымі, а найболыш драўлянымі дамкамі, што ўсьцяж патаналі ў садах. Цяпер мала засталося ад таго раёну — адны лапінкі, астраўкі, заціснутыя кварталамі несамавітых бязьверхіх дамоў».

Душа запоўнена ўспамінамі — няўклюднымі, што патанаюць у бясконцых прагалах, што выдзіраюць то адзін, то другі пазл з падпсаванага вірусамі гадоў кампутарнага блёку нашай памяці — але тымі, што ня складваюцца пры гэтым у суцэльную карціну сьвету, уласнага жыцьця, мінулага, пражытага марна.

«Увосень, кожнай раніцы ў нядзелю, чуваць было, як парыпваюць на маёй асфальтавай вуліцы вясковыя вазы, як цохкаюць капытамі коні і як вішчаць і рохкаюць у драбінах падсьвінкі».

Вось і зьяўляецца ў аповедзе той самы вяпрук, каторага ўжо ў загалоўку авансаваў чытачу аўтар. Аўтар распавядае і нам, як яму карціць напісаць аповед пра смаленьне вепрука.

З чым асацыюецца ў чытача смаленьне вепрука? Зь зімой, што заступае ў свае правы, зь вясковым дзяцінствам, са сьвятам сытасьці — гулянкай у стылі ці то Рабле, ці то Будзінаса. Ад гаспадарскіх шчадротаў — і кілбаса пальцам пханая, і налітая крывёю напалову з грэчкай крывянка, і кумпякі. Дарослыя чарку падымуць і скваркай закусяць, а дзецям дастанецца найлепшы шматок, таму што ўсё жыцьцё — дзеля іх. Усё жыцьцё!

Жыцьцё! Радасьць!

Усім — радасьць!

І толькі вепруку — сьмерць.

«Пах пракісшага хлеба і паранкі чуваць яму, чутна, як нямірна сакочуць, не падзяліўшы нешта, куры на двары і цьвёрда шкрэбае аб ганак дзюбаю певень, як разладжана, роспачным нейкім голасам, злуецца на курэй гаспадыня... Дык вось нарэшце... тупаньне ў сенцах, знаёмы шоргат мешалкі і галасы, і другі, глушэйшы і спакайнейшы голас, — гэта гаспадар. І адчыняюцца сенцы, і бухаюць дзьверы, прадракаючы міг нечакана хісткай, поўнай незразумелага сэнсу цішыні».

І я, чытаючы цяпер, саракадвохгадовым, стральцоўскі апавед, узгадаў апавед сваёй маці — пра яе дзяцінства. Пра вепрука, якога звалі Васькам. Ён быў разумны. Адчыняліся дзьверы ў хлявок — і ён з радасным вішчаньнем выбягаў на двор, бег да яе, дзяўчынкі, уладкоўваўся ля яе ног і чакаў, як тая пачухае яму за вухам. І задаволена, шчасьліва рохкаў, зусім не прадбачачы гэтай страшнай, поўнай незразумелага сэнсу цішы...

І калі дзед мой, Ёсіф Тарасавіч Фядута, вартаўнік на Гарадзенскай тытунёвай фабрыцы Шарашэўскіх, бацька пяцёх дзяцей, трох дзяўчат і двох сыноў, падрыхтаваўся смаліць вепрука — у маленькай драўлянай хаце зь сінімі сьценамі, пры вуліцы Леванабярэжнай у Горадні, — няма цяпер ні гэтай хаткі, так і няма ў жывых нікога зь дзяцей Ёсіфа Тарасавіча, яны засталіся толькі на картачках у старым зялёным альбоме маёй маці, які захоўваецца ў кніжнай шафе панэльнага менскага шматпавярховіка, ды засталася памяць у мяне пра сінія сьцены хаткі і пра кусты з жоўтымі кветкамі, падобнымі да пухнатых куранят, што ўзьляцелі на пруткі, — калі мой дзед падрыхтаваўся смаліць вепрука — а дзеля гэтага яму трэба было *забіць Ваську*, — маці зразумела, што ў дом заходзіць, захутаўшыся ў поўную цяпер ужо зразумелага сэнсу цішы, Сьмерць...

Толькі ў Стральцова вепрука страляюць — ужо зусім па-чалавечы. А мой дзед будзённа закалоў Ваську даўгой швайкай, пазычанай у бабулькі Сянькевічавай, якая жыла пры вуліцы Чырвонапартызанскай (гэта пасьля вайны яна стала Чырвонапартызанская, а тады, у міжваеннай Польшчы, аднаму Богу вядома, якая ў яе была назва). У той самай чужой нашай сям'і бабулі; яе імя я ніколі і ня чуў, а толькі бачыў яе на даваеннай фатаграфіі, і ў яе вясною 1942 году будзе хавацца мая мама, гарадзенскае дзяўчо, якое сагналі на работу ў Нямеччыну і якое нейкім цудам умудрылася зьбегчы ад баўэра.

...Есьці Ваську дзеці адмовіліся. Мяса прадалі і набылі новую сьвініну. Ніхто ў нашай сям'і ня стаў вэгетарыянцам, але пра Ваську мама і ў старасьці апавядала мне ледзь не са сьлязьмі.

Болей дзед сьвіней у хаце не трымаў. Не таму, што было іх шкада. Было дзяцей шкада.

...І вось гэты дзіцячы ўспамін пра вепрука, пазбаўленага жыцьця, зьмяняецца ў Стральцова ўспамінамі пра маці.

Адзін з герояў апаведу раптам пачынае блытана весьці гаворку пра тое, як старая маці ўмаўляла яго ня пстрыкаць марна сярнічкамі: калі хочаш запаліць цыгарэту, седзячы ля камінка, запалі ад вугольчыка. «А каб жа ты ведала, думаю, колькі мы, такія харошыя, тых запалак рублёвых па рэстаранах ды піўных у адзін вечар кідаем, га?»

Страшная мэтафара: не сярнічкі капеечныя палім, а ўласнае жыцьцё марнуем.

І трывога засяляецца ў сэрца апавядальніка, змрочны, як у вепрука, смутак. «І тады ўбачыў ён сьцены, якія адразу пазнаў: прапахлыя павуціньнем, негабляваныя сьцены, і тапчан у куце, закіданы старой вопраткай, і старыя начоўкі на ім, і лаву ля дзьвярэй, і вёдры на ёй, і на падлозе кашы з бульбай, і цэбар зь мешанкай, і вузкае, на адно бервяно прарэзанае акенца ў сьцяне, і нейкі слоік на ім, і шклянку з гусіным тлушчам на ёй (ён гэта ведаў), і адно замурзанае (ці ня поклад?) курынае яйка… О, навошта, навошта такое знаёмае ўсё гэта, і навошта стаіць перад лавай маці, і навошта чыгуны каля яе ног, навошта яна павярнула галаву да яго, — о, які цёмны, невідушчы, цяжкі, нібы плёскат вады ў вядры, у яе пагляд!»

І калі ён даведаецца раніцою з тэлеграмы, што маці памерла, усё стане па сваіх месцах: і самахоць узьніклае жаданьне напісаць апавед пра мотатшную, непазьбежную для кожнай жывой істоты сьмерць; і маці, што ўзьнікла ў сьне — як у дзяцінстве, у пуні, зь якой выйдзе — і пойдзе смаліць вепрука — адсюль і вада гэтая, што цяжка плешчыцца ў вёдрах, і вузкае акно ў сьцяне — апошняя крыніца сьвятла, і курынае яйка — нібы кпліві напамін пра кароткатэрміновасьць, як курыны век, чалавечага быцьця (і тлушч — адтульсама: яйка з птушынага жыцьця, лой — з птушынай сьмерці)...

Душа адтала, і на сьвет, асьцярожна распраўляючыся, як пралеска, зьявіўся чалавечы боль — той, які рана ці позна давядзецца адчуць кожнаму з нас, які прыходзіць разам з успамінам пра дзяцінства, пра маму, пра вепрука, забітага — дзеля нас...

Аўтар *хацеў толькі* напісаць гэты апавед, прызнаецца нам, але — *не напісаў*. Сьмерць маці яму перашкодзіла. Так герой фільму Фэліні хоча зьняць фільм, а ў выніку мы толькі даведваемся пра тое, як яму карціць зьняць фільм, як ён ня можа зьняць фільм, а самога фільму — ня бачым...

У «Смаленьні вепрука» няма нічога лішняга. Ён надзвычай лякінічны. Таксама напісаныя й найлепшыя апаведы на расейскай мове — у Буніна, Шукшына, Казакова. Не параўнаеш зь дзевятнаццатым стагодзьдзем: Стральцоў і Буніна, і Шукшына, і Казакова чытаў менавіта як сучасьнік, але аўтары мінулага, больш даўняй эпохі для яго — продкі, а не сучасьнікі: сучасьнікаў ён прымаў як сваіх, з ранейшым — палемізаваў.

Але ён чытаў і Марсэля Пруста. Гэта адчуваецца праз бязьлітасную дакладнасьць вобразаў. Я памятаю, як мяне ўразіла, калі герцагіня Германцкая, якая карміла гусі, што плавалі ў сажалцы, белай булкай, той самай булкай пачала частаваць маленькага апаведача гэтай прустаўскай эпапэі, калі бабуля падвяла яго да Яе Высокасьці. Стральцоўская запалка, што ўспыхнула і згасла марна, як чалавечае жыцьцё, — такое ж вялікае літаратурнае адкрыцьцё.

Стральцова як празаіка маркіравала нядоўгая хрушчоўская адліга. Ён нарадзіўся — фізычна — 14 лютага 1937 году. Першыя вершы надрукаваў у апошні год жыцьця Сталіна — у 1952 годзе. Першы апавед — у 1957-м — пачатак адлігі. Першы зборнік выйшаў у 1962 годзе — апошні год адлігі, ужо пасьля «грамадзянскага пакараньня» Пастэрнака, і пасьля сьмерці Пастэрнака, і пасьля выхаду ў сьвет ягонага зборніка ў «Бібліятэцы Паэта» з прадмовай Андрэя Сіняўскага.

І памёр — у веку 50 год, у 1987 годзе. Так памерлі многія з тых, хто зусім маладым прабіў лёд сталінскай эпохі, але каго выпетралі першыя прымаразкі. У Стральцова быў цяжкі лёс, што ўлучыў у сябе «лекаваньне» ў лячэбна-працоўным прафілякторыі і зайздрасьць і нянавісьць мноства «калегаў» — тых «дубоў», якім было ўсё адно, ці гэта сьнег ідзе, ці дабрадайны дождж, ці сонца зьзяе табе, ці дагарае перадсьмяротным водліскам і курчыцца ў пакутах, зусім па-чалавечаму, тонкая сярнічка. Яму не ставала тоўстае кары, якая ўратавала б яго ад болю праломваньня лёду. Што зробіш: ня ўсім дадзена быць таўстакорымі.

І Стральцоў памёр, як паміpае пралеска, што перажыла адлігу. І горыч і боль, што катавалі яго, засталіся ў радкох яго апаведаў. Нават тых, якія ён толькі абяцаў нам распавесьці.

# Бераг даверлівага пляча

**Працяг са старонкі 37.**

шыні душы і памкненьняў. А Жэня была выдатнай асобай.

…У той жа лістападаўскі дзень, як толькі прыйшоў дадому, адшукаў на кніжным стэляжы зборнік Жэніных вершаў у сьціплай папяровай вокладцы з выявай стромкіх бяроз — «На беразе пляча». Назва, на першы погляд, не зусім зразумелая, а калі крыху падумаць, то ўбачыш, што яна вельмі выразная, рэльефная — бераг пляча, на які набягаюць, накочваюцца хвалі жыцьця і то лашчаць яго, то драпаюць да крыві вострымі каменьчыкамі. Вядома, гэта мая асацыяцыя, мая расшыфроўка назвы, але мне падказвае яе зьмест зборніка, вершы, поўныя то шчасьця, нястрымнай радасьці быцьця, то болю, расчараваньня, роспачы. Часьцей болю.

Гэты зборнік Жэня падарыла мне 9 красавіка 1981 г. Дата стаіць пад аўтографам на тытульнай старонцы. Гэта ня проста аўтограф — маленечкі верш:

Ёсьць блізкія людзі —
Ня поруч,
Ёсьць блізкія душы —
Далёка.
Ёсьць блізкія (ім адзінока
Нясьці сваю радасьць і
горыч)…
За блізкасьць без набліжэньня —
Валянціну Тарасу!
Жэня.

Прачытаў гэтыя радкі нібы ўпершыню. І сьціснулася сэрца. Згадалася, чаму яна так напісала — за блізкасьць без набліжэньня.

Аднойчы пасьля ці то літаратурнай вечарыны ў Саюзе пісьменьнікаў, ці то нейкай «засядалаўкі» сэкцыі паэзіі я праводзіў Жэню дадому. Ня памятаю, дзе яна тады жыла — ужо на Старажоўскай ці на папярэдняй сваёй кватэры па вуліцы Ўльянаўскай. Праводзіны зацягнуліся. Мы разгаварыліся як ніколі за ўвесь час нашага знаёмства, вядома, абсалютна сяброўскага, блукалі па нейкіх вуліцах, спыняліся, чыталі вершы, размаўлялі аб усім на сьвеце. Жэня, здавалася, была вясёлая, але весялосьць тая была нейкая нэрвовая, узрушаная, часам было не разабраць, сьмяецца Жэня ці плача. Нешта ў той час нядобра мянялася ў ейным асабістым жыцьці, я гэта адчуваў, бачыў, хоць пра асабістае яна не сказала ні слова. Калі разьвітваліся, Жэня раптам неяк панікла, твар пастарэў, вялізныя шэра-зялёныя вочы глядзелі журботна. І так пранізьліва мне стала яе шкада, што я прыгарнуў Жэню да сябе, пагладзіў па галоўцы, як маленькае дзяўчо, як сястрычку. А яна затрымцела ўсім целам, бы птушка ў сілках, адразу вырвалася, вочы наліліся сьлязьмі, і яна ціха, але так, што падалося крыкам, сказала: «Не, не! Я адна, адна! Гэта мой лёс!..» Цяпер разумею, што сказана тое было ня мне — сабе і некаму, хто і шчымлівым шчасьцем, і жорсткім пракляцьцем жыў у ейнай душы, нечаму, што назаўсёды зрабілася выбарам адзіноты, самоты, блізкасьці без набліжэньня. Самаабарона ад жорсткасьці сьвету. Ці разумела яна, што гэта аказваецца немагчымым, калі прырода тваёй душы — шчырасьць, калі душа перапоўнена любоўю да людзей, даверам, наіўным, як у дзіцяці? Відаць, разумела:

Ты цяпер немагчыма далёка.
Вырву з градаў палын і асот.
Але воран — калючае вока —
Прабівае душу навылёт.

Захінуся шалёнаю сьцюжай,
Завяжу вузялочкам кутас.
Чорны воран над белаю
ружай:
О, які фантастычны кантраст!

Я сачу, як пялёсткі зьлятаюць,
Як заходзіцца вецер сьляпы,
Рызыкоўна праз боль
праступаюць
Кіпці ворана, ружы шыпы.

Адкажы, да чаго б гэта, дружа,
Кружыць, сну разарваўшы
кілім,
Чорны воран над белаю
ружай,
Як над выстылым сэрцам маім.

Мне гэты верш тлумачыць Жэніну сьмерць.

Няшчасьце здарылася 25 лістапада 1988 г., на пяты дзень пасьля Жэніных саракавых угодкаў. Адны казалі, што гэта быў няшчасны выпадак — па неасьцярожнасьці звалілася з высачэзнага балькону. Іншыя гаварылі — самагубства. Я таксама думаю, што самагубства. Не задуманае загадзя, ня вынашанае — раптоўнае для сябе самой. Момант безвыходнай роспачы, невыносны душэўны боль кінулі яе ў бездань, бы птушку ў неба.

Жывіце і любіце,
Свой беражыце дом.
…Як птушку ў блакіце,
мяне застане гром.

…Лістапад за вокнамі нарэшце спахмурнеў, замжыў, засівераў. Відаць, холадна там, на Старажоўскай, на прыбярэжжы Сьвіслачы, Аляксандру Пушкіну. Холадна і самотна ў чужым, незнаёмым горадзе. Ды мне ўяўляецца, што недзе непадалёк, на суседнім узгорачку, стаіць на мармуровым пастамэнце Жэня Янішчыц. І на беразе ейнага пляча адпачывае, грэецца ягоным цяплом пералётная птаха. А Жэня чытае Пушкіну верш, хоць і не яму прысьвечаны, але ў гэтых варунках прыдатны:

Будзе слоту абвяшчаць
прагноз,
лістабой учыніць пертруску.
Песьняй, што расчуліла да
сьлёз,
я прыму цябе па-беларуску.
........
Час — вар'ят, шалёнае таксі,
Толькі ўсё ж ня мысьлю я аб
спуску.
Кажаш, што магілы зарасьлі?
Памаўчы са мной
па-беларуску.

Некалі так і будзе — бронзавая Яўгенія Янішчыц падымецца на пастамэнт помніка ў тым парку. Мы пачакаем. Цярплівая, але і зацятая. Як умела чакаць Жэня любую ёй вясну.

…На туфельках,
на белым плацьці — гразь.
Я не люблю слаты. Я пачакаю.

Між іншым, напісана гэта ў 1981 г., калі грымелі барабаны і літаўры «разьвітога сацыялізму». Як сказаў Пушкін, «сказка — ложь, да в ней намёк, добрым молодцам урок»…

# Замкі будуем сваімі рукамі

«Гісторыка» ладзіць летнікі ў Івянцы і Любчы.

Зьміцер Рагачоў з Грамадзкага аб'яднаньня «Гісторыка» плянуе два буйныя летнікі. Першы пройдзе **з 22 ліпеня па 13 жніўня** пад Івянцом. Будуць праводзіцца аварыйныя працы на месцы колішняй сядзібы XVIII ст., што зьмяніла не аднаго гаспадара. Захаваліся гаспадарчыя пабудовы, якія трэба выратаваць ад канчатковага разбурэньня. З гэтай мясьцінай зьвязаная легенда пра драўляны замачак, збудаваны перад паходам на Грунвальд. Ён даваў прытулак паляўнічым, што ў мясцовых лясах нарыхтоўвалі дзічыну перад паходам.


WWW.CHAT.SEVENTHSIDE.ORG
**Любчанскі замак.**

**15—27 жніўня** адбудзецца летнік у Любчы пад патранажам кіраўніка Фонду «Любчанскі замак» Івана Пячынскага. Працы на адбудове замку шмат, таму запрашаюцца ўсе ахвотныя. Мяркуецца пабудаваць паўтарамэтровы мур паміж дзьвюма адноўленымі вежамі. Маецца зацьверджаны праект і будматэрыялы, патрэбныя толькі рукі.

Таксама плянуецца падрыхтаваць пляцоўку пад адбудову драўлянай вежы, якая стаяла на беразе Нёману. Месца тое ў 20-х гадах мінулага стагодзьдзя падмыла рака. Акрамя таго, гарадзенскі археоляг Генадзь Семянчук атрымаў дазвол на раскопкі на тэрыторыі замчышча. У плянах таксама работы ў любчанскім парку. Працы хопіць усім.

Па інфармацыю зьвяртацца па тэлефонах: 755-03-70 і 654-65-59 (Зьміцер).

**СП**

## АФІША

**Купалаўскі тэатар**
**1** (сб), **9** (ндз) — «Вечар».
**2** (ндз), **5** (ср) — «Чорная панна Нясьвіжу».
**6** (чц) — «Чычыкаў».
**7** (пт) — «Каханьне ў стылі барока».
**8** (сб) — «Сымон-музыка».
*Малая сцэна*
**1** (сб), **7** (пт) — «Адчыніце кантралёру!».
**5** (ср) — «Востраў Сахалін».
**9** (ндз) — «Варшаўская мэлёдыя».






**Сьвята ў Ляўках**
**8 ліпеня** ля вёскі Ляўкі, што на Аршаншчыне, у навакольлі Дому-музэю Янкі Купалы, адбудзецца сьвята вольнай беларускай паэзіі. Пачатак а 18-й гадзіне. Знайсьці лёгка: трэба даехаць да музэю, а там прайсьці праз ягоную тэрыторыю ў бок берагу ды спусьціцца па лесьвіцы да Дняпра. Па беразе налева прайсьці каля 500 мэтраў да вогнішча. Паблізу можна паставіць намёт.
Вядомыя і вопытныя паэты, якія маюць свае кнігі, запрашаюцца браць падпісаныя асобнікі з сабою, каб падарыць іх маладым ды невядомым калегам, творы якіх упадабаюць на сьвяце.

## КАІСА

# Гросмайстар разьбіраў палёты

Алімпіяда ў Турыне пакінула ў аматараў шахмат прысмак горычы. Уразіў выступ мужчынаў: беларусы выйгралі шэсьць матчаў запар, але пасьля паразы ад расейцаў зазналі шраг няўдач і ня трапілі нават у трыццатку.

Справаздачы па выніках спаборніцтваў — традыцыя беларускага спорту. 12 чэрвеня Юр'ю Ціханаву, які ўпершыню выяжджаў на шахматную алімпіяду, давялося адказваць за ўсіх калегаў. У адным з вучэбных пакояў Палацу шахмат 28-гадовы гросмайстар даў нешта сярэдняе паміж прэс-канфэрэнцыяй і майстар-клясай.

Юр'я цяжка назваць моцным аратарам, ён гаворыць рубленымі фразамі. Аднак ажыўляецца, калі дэманструе і камэнтуе партыі. Яго слухалі пара трэнэраў, пара-тройка карэспандэнтаў і цэлы рэй хлопчыкаў ды дзяўчынак, удзельнікаў летняга лягеру пры Палацы.

Гісторыя сусьветных алімпіяд зацікавіла ня ўсіх, і арганізатарка імпрэзы, намдырэктара Рэспубліканскага цэнтру алімпійскай падрыхтоўкі Генрыета Лагвілава, раз-пораз шыкала на прысутных. Затое расповед пра выступ беларускай каманды выправіў становішча.

Жылі беларусы ў алімпійскай вёсцы, якая засталася ад зімовых гульняў у Турыне, гулялі ў памяшканьні коўзанкі, перабудаванай для шахматыстаў. Рашэньні аб тым, каго выстаўляць на тую ці іншую дошку, прымаліся калегіяльна. Паводле Юр'я, італьянскае надвор'е беларусам не замінала. Асабіста ён, як запасны гулец, выступіў удала: тры партыі выйграў, дзьве зьвёў унічыю, адну прайграў. Асьцярожна пакрытыкаваў лідэра каманды за тое, што той недагледзеў колькі «вілак» у двубоях з Лэйтанам і Крамнікам, падкрэсьліўшы, што Аляксея Аляксандрава «цяжка замяніць».

Трэнэр Генадзь Лібаў спытаў парадаў для новай генэрацыі. Сп.Ціханаў, які і сам трэніруе юнакоў у менскай СДЮШАР-11, адрэагаваў контравэрсійна: «Пазыцыйнай гульні, эндшпілям могуць навучыцца ўсе, а вось дэбютная падрыхтоўка вызначае посьпех на 80%». І спаслаўся на партыю армянскага супэргроса Лявона Араняна, дзе той выйграў за 19 хадоў дзякуючы дэбютнаму труку. Між іншым, карані Араняна-Аронава — у беларускім Талачыне.

Пры канцы вядоўца заінтрыгавала прысутных, папрасіўшы іх выбраць найлепшы ход у вострай пазыцыі (*гл. дыяграму*). Падказка ад сп.Ціханава: «Ужываецца ўлюбёны прыём Фішара — напад у адказ на напад».

**ВР**

**Як бы вы згулялі?**
Нейксанс А. (мм, 2458) — Ціханаў Ю. (мг, 2472). Ход чорных.



**Адказ:** 1...Ke4! 2. Кс4 Кd2+ 3. Сd2 Тb7. У чорных лішняя якасьць, і праз дзясятак хадоў латвійскі гулец спыніў супраціў.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

### Патоплены фільм

**Пасэйдон** (Poseidon).

ЗША, 2006, каляровы, 99 хв.

**Жанр:** фільм-катастрофа.

**Адзнака:** 3 (з 10).

Аграмадная акеанская хваля накрывае карабель «Пасэйдон», які перакульваецца дагары нагамі. Купка герояў шукае выйсьця зь небясьпечнае пасткі.

Карціна Вольфгана Пэтэрсана «Пасэйдон», якая паўтарае сюжэт знакамітага катастрофніка 1972 году, ганебна тоне. І ў гэтым няма анічога дзіўнага. За 34 гады сьвет радыкальна зьмяніўся.

Калі ў колішніх «Прыгодах «Пасэйдона» рэй вёў аўтарытарны прапаведнік, то ў фільме Пэтэрсана галоўны вызваляльнік — картачны махляр (Джош Лукас). Калі ў даўняе стужцы меліся канфлікты, то ў «Пасэйдоне» ўсё зводзіцца да млявых сварак дачкі з бацькам (Эмі Росум і Курт Расэл).

Мёртвая карціна.

### Графіня з кампутарных гульняў

**Застацца ў жывых** (Stay Alive).

ЗША, 2006, каляровы, 85 хв.

**Жанр:** моладзевая жахаўка.

**Адзнака:** 4,5 (з 10).

Група падлеткаў з Новага Арлеану грае ў крутую кампутарную гульню «Застацца ў жывых». Але пасьля сьмерці ў віртуальнай прасторы героі гінуць у рэальнасьці.

Сюжэт фільму не вылучаецца навізною. Але цымус карціны ў фігуры забойцы. Пазнаёмцеся — графіня Эржэбэт Батары (паміж іншым — сваячка Сьцяпана Батуры!) — крывавая маньячка. Яе несупакоеная душа адрадзілася ў кампутарнай гульні і пераследуе няшчасных падлеткаў.

Асабліва рэкамэндую карціну зацятым кампутарным гульцам.

**Андрэй Расінскі**

## ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Субота, 1 ліпеня

**«Лад», 10.15**

«31 чэрвеня».

Расея (СССР), 1978, рэж. Леанід Квініхідзэ.

Фантастычны м'юзыкал.

Паводле аднайменнай аповесьці Джона Б.Прыстлі.

Галоўную ролю ў фільме выконвае Мікалай Яроменка-малодшы.

**«Лад», 12.25**

«Ласкава запрашаем, ці Пабочным уваход забаронены».

Расея (СССР), 1964, рэж. Элем Клімаў.

Камэдыя.

Злы дырэктар пераўтварае піянэрлягер у казарму. Партызан-піянэр Іначкін яму не падпарадкоўваецца.

Дасьціпная сатыра на савецкае грамадзтва. Твор, актуальны й для сёньняшняй Беларусі.

**БТ, 14.30**

«Маем рэчы».

Беларусь, 2006, аўтар і вядоўца Алесь Матафонаў.

Гэтая перадача пра хлеб.

**СТВ, 20.15**

«Асада».

ЗША, 1998, рэж. Эдвард Зьвік.

Баявік.

У Нью-Ёрку — масавыя тэракты. У краіне ўводзіцца надзвычайнае становішча і масава парушаюцца грамадзянскія правы. Героі нэўтралізуюць тэрарыстаў і ставяць на месца генэрала-дыктатара.

Пастаўлены за тры гады да атакі на Гандлёвы цэнтар, фільм папярэджвае пра небясьпечныя наступствы апантанае барацьбы. Але разьвязка прадугледжваецца галівудзкая.

Ролі выконваюць: Дэнзэл Ўошынгтан, Анэт Бэнінг, Брус Ўіліс.

**НТВ, 21.40**

«Адкрытае мора».

ЗША, 2003, рэж. Крыс Кентыс.

Драма, жахі.

Маладая пара адпраўляецца ў адпачынак на высьпы. У адкрытым моры на яе забываецца катэр. Героі застаюцца сам-насам са сьпёкаю... і акуламі.

**«Лад», 22.35**

«Узыход Чорнае поўні».

ЗША, 1986, рэж. Гарлі Кокліс.

Прыгоды.

Звышмагутны сакрэтны аўтамабіль уганяе гераіня Лінды Гэмілтан. Па яе сьлядох ідзе адмысловец Томі Лі Джонз. Сытуацыя ўскладняецца агентамі ФБР і гангстэрамі.

Сцэнар карціны склаў Джон Карпэнтэр.

### Нядзеля, 2 ліпеня

**БТ, 07.10**

«Кур'ер».

Расея (СССР), 1986, рэж. Карэн Шахназараў.

Трагікамэдыя.

Паводле аднайменнай аповесьці Карэна Шахназарава.

Пасьля школы Ваня працуе кур'ерам. Ён схільны да блазенства й розыгрышаў, што дарослым не падабаецца…

Сьмех, чалавечнасьць і далікатнасьць шахназараўскае рэжысуры; удалая гульня Фёдара Дунаеўскага і Алега Басілашвілі. У іншых ролях: Анастасія Немаляева, Іна Чурыкава.

**АНТ, 12.10**

«Зьнесеныя ветрам».

ЗША, 1939, рэж. Віктра Флемінг.

Эпічная драма.

Паводле аднайменнага раману Маргарэт Мітчэл.

Легендарная гісторыя Скарлет О'Хары й Рэта Батлера падчас грамядзянскай вайны…

Абсалютная клясыка кіно.

У галоўных ролях: Віўен Лі, Кларк Гейбл.

**БТ, 13.30**

«Формула каханьня».

Расея (СССР), 1984, рэж. Марк Захараў.

Эксцэнтрычная фантазійная мэлядрама-камэдыя.

Паводле аповесьці А.Талстоя «Граф Каліёстра».

Трапныя рэплікі й бліскучы музычны нумар у выкананьні Сямёна Фарады і Аляксандра Абдулава.

Таксама ролі выконваюць: Надар Мгалоблішвілі, Аляксандра Захарава, Таццяна Пельцэр.

**Андрэй Расінскі**

## КІНО НА DVD

**MASTER RECORDS**

**Перабываючы зіму (Winter Passing)**

Драма, ЗША, 2005, рэж. **Адам Рап.**

У ролях: **Эд Гарыс, Зоўі Дэшанэль, Даніэль Ларсан.**

Пасьля шасьці гадоў вандраваньняў дачка вяртаецца да бацькі і імкнецца аднавіць сямейныя повязі…

**Менск, Кісялёва 12, 643-21-08**




**...ідэя ужываньня акцызных марак пашыралася і на Інтэрнэт.**




**...падчас балу выпускнікоў выдавалі пасьведчаньні.**

**...кандыдатуры матылёў, якіх выпускалі падчас балу выпускнікоў з удзелам ППРБ, адбіралі адпаведна з тымі ж крытэрамі, што і кандыдатуры выпускнікоў.**



— Нешта, таварыш Сухарэнка, не падабаецца мне гэтая парачка. Здаецца, яны хочуць стварыць нефармальную арганізацыю.

— Згодны. Падыміце на іх файлы.

МАЛЮНКІ І ТЭКСТЫ ЛЁЛІКА УШКІНА

# лІтаратурНы сшытак «НН»

*чэрвень 2006*


Гутарка з Адамам Глёбусам: «Беларусы яшчэ навучацца выкарыстоўваць ваду ў палітычных мэтах» ........... 28
Новыя вершы Ўсевалада Гарачкі ........... 31
Эсэ Ўладзімера Лобача «Мяжа» ........... 32
Апавяданьне Этгара Керэта «Адыдасы» ў перакладзе Паўла Касьцюкевіча ........... 34
Ганна Чакур. Заўважынкі ........... 35
Валянцін Тарас пра Яўгенію Янішчыц ........... 36
Пераклады Ўладзімера Мархеля з Адама Міцкевіча ........... 37
Андрэй Лянкевіч. Дзяды ў лазьні ........... 38
Уладзімер Някляеў пра Рыгора Барадуліна «Нават вецер гнёзды ўе» ........... 40
Аляксандар Фядута перачытвае Міхася Стральцова ........... 42


## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Я ЛЮБЛЮ

Люблю наш край, старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз пазнала шчасьце,
Сьлязу нядолі праліла.
Люблю народ наш беларускі,
Іх хаты ў зелені садоў,
Залочаныя збожжам нівы,
Шум нашых гаяў і лясоў…

**Канстанцыя Буйла, Вішнева**
**«Наша Ніва». 1911. №24**


# А ты падпішыся!



**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,**
проста паведаміце ў Рэдакцыю свой адрас. Адначасова Рэдакцыя зьвяртаецца з просьбай ахвяраваць на выданьне. Дэталі — **старонка ...**


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ


### ВІТАНЬНІ

**Мар'янку-Сонейка** віншую з Днём нарадзінаў! Мінулыя праблемы — у мінулым. Сьвяткуй і адпачывай! Наперадзе цябе чакае шчасьце!!! Таша

**Віншуем усіх выпускнікоў-2006** з вызваленьнем і жыцьцём! Дзяды

### ДЗЕТКІ

**Усе, хто мае дзяцей да двух гадоў** і жадае мець свае беларускамоўныя ясьлі ў Фрунзэнскім раёне Менску, няхай падтрымае нашую ініцыятыву па іх арганізацыі. Зьвяртацца — Сяргей, Кацярына: тэлефон 251–59–94 (хатні).

### ПАКОЙ

**Здыму пакой** у Менску на доўгі тэрмін альбо аднапакаёвую кватэру зь сябрамі. Т.: 685–52–39. Сяржук

### ПАДАРОЖЖА

**Зьміцер Касьпяровіч** запрашае ў падарожжа 1—2 ліпеня на рыцарскі фэст сярэднявечнай культуры ў Наваградак. Па дарозе: Мір–Любча–Шчорсы.

9 ліпеня: Горадня–Сьвяцк–Сапоцкі.

14–17 ліпеня: Грунвальд–Мальбарк–Гданьск.

Т.: 292–54–58, 622–57–20, 509–12–16

**Запрашаем у Крым.** Рады прапанаваць вашай увазе праект zmicer.com «Беларусы ды Крым», прысьвечаны Беларусі, Беларусам ды Крыму. Чаму менавіта Крым і чаму менавіта для вас? Я люблю Крым, люблю горы, люблю падарожжы, люблю мора! Запрашаю вас, таму што вы — беларусы! Дэталі — на Зьміцеркоме: http://zmicer.com

### РАДЫЁПРЫМАЧ

**Набуду радыёпрымач** з шырокім дыяпазонам хваляў (кароткія хвалі абавязкова) кшталту «Акіян», «Верас». Т.: 8–0222–23–56–54, 625–57–85. Алесь


## ЖАРТЫ

* * *

— У чым падабенства і адрозьненьне Ізраілю і Расеі?

І тая, і другая дзяржава рэгулярна наносіць удары ў сэктары газа.

* * *

Кіраўніцтва Беларусі адмовілася ад пляна пабудовы тэлевежы ў Менску. Замест яе вырашана будаваць інтэрнэт-вежу.


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам.галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»



**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**.


Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэкламных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 112. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2521. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 28.06.2006.
Замова № 3537.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/112